**ATHENAEUM**
**Commentarii Historiae et Culturae, No 1 (2)**
**Калекцыя Панарама**

# Том I

KAMUNIKAT.org

**Miensci MM**

Athenaeum
Калекцыя Панарама

Мікола Крывальцэвіч

# Археалягічныя адкрыцьці сьвету

KAMUNIKAT.org

Менск 2000

**Рэдактар: Дзярновіч Алег**

**Мікола Крывальцэвіч**

Археалягічныя адкрыцьці сьвету, Менск: Athenaeum 2000; – 124 с. + XVI с. іл. – (ATHENAEUM: Commentarii Historiae et Culturae, No 1 (2). Калекцыя „Панарама”, том I)

ISBN 985-6374-11-1

У кніжку Міколы Крывальцэвіча ўключаныя найбольш яркія археалягічныя адкрыцьці 1970-1990-х гадоў. Гэта кніга нарысаў, кожны зь якіх прысьвечны таму ці іншаму археалягічнаму адкрыцьцю ды праблемам, якія вынікалі ці вынікаюць у сувязі з асэнсаваньнем сьвежай навуковай інфармацыі. „Археалягічныя адкрыцьці сьвету” распачынаюць новую выдавецкую калекцыю Цэнтру Athenaeum – „Панарама”.

© Мікола Крывальцэвіч, 2000
© Athenaeum, 2000
© Андрэй Фядорчанка, дызайн, 2000

**Мікола Крывальцэвіч** (нарадзіўся ў 1958 годзе) – археоляг, кандыдат гістарычных навук (дысэртацыю абараніў у 1991 годзе ў Кіеве), сатршы навуковы супрацоўнік Інстытуту Гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі, аўтар каля 60 навуковых і навукова-папулярных публікацыяў, у тым ліку манаграфіяў, па археалёгіі Беларусі, удзельнік міжнародных археалягічных праектаў. Галоўны накірунак дасьледваньняў – археалёгія бронзавага веку. Браў удзел у раскопках на месцы масавага пахаваньня ахвяраў савецкіх рэпрэсіяў у Курапатах. Актыўны папулярызатар археалягічнай навукі.

KAMUNIKAT.org

# ЗЬМЕСТ


*Iceman*
*Людзі на вадзе*
*Хохдорф: курган кельцкага правадыра*
*Балотныя людзі*
*Жывая археалёгія*
*Чалавек у капальні*
*Падземнае войска імпэратара*
*Фэномэн «Краіны гарадоў»*
*Замарожаная жанчына з даліны Ўкок*
*Грабніцы македонскіх цароў*


KAMUNIKAT.org

## *ICEMAN*

*Iceman (лёдавы чалавек) ці інакш Iceman Otzi, альбо Similaun Man – такая назва замацавалася ў эўрапейскай літаратуры за рэшткамі чалавечага цела, якія выпадкова былі знойдзеныя Хельмутам і Эрыкай Сіманамі ў 1991 годзе на засьнежаным перавале ў Otztaler Alps, што ў Паўднёвым Цыролі, недалёка ад ледавіка Similaun. Iceman (Айсман) загінуў каля 5300 гадоў таму назад. Нягледзячы на глыбокую старажытнасць, яго цела й рэчы, якімі ён карыстаўся, цудоўна захаваліся.*

Новае жыцьцё Айсмана – пасьля яго сьмерці недзе каля 3300 гадоў да нараджэньня Хрыстова, -- пачалося 19 верасьня 1991 году. Менавіта ў гэты дзень нямецкія падарожнікі Хельмут і Эрыка Сіманы, любуючыся прыгажосьцю альпійскага высакагор'я, выпадкова апынуліся ў скалістай цясьніне горнага перавалу. Гэтае месца мае блізу 3159 м над узроўнем мора. На поўнач ад яго прасьціраліся засьнежаныя й зьледзянелыя вяршыні аўстрыйскіх Альпаў, а на поўдні скрозь горы прагляддаліся зялёныя альпійскія даліны Італіі. Першай Айсмана ўбачыла Эрыка. З-пад лёду каля вялікай каменнай глыбы тырчала чалавечая патыліца з рэшткамі валасоў і плечы. Спачатку жанчыне падалося, што гэта выкінутая ці згубленая вялікая лялька...

Праз нейкі час да месца знаходкі трупа па горных сьцежках паднімаўся мясцовы аўстрыйскі паліцэйскі зь вібрамалатком на поясе. Пераканаўшыся, што гэта ня проста труп, а нешта больш важнае і што самому яму ня справіцца зь незвычайнай знаходкаю, паліцэйскі выклікаў каманду сьледчых зь Інсбруку. Тыя марудзіць ня сталі, і праз нейкі час з дапамогаю лыжных палак выкалупалі цела зь лёду й сьнегу. Калі выцягвалі труп, на левым сьцягне й на клубох цела было пашкоджанае да касьці. Пры гэтым у лёдзе засталіся геніталіі, а таксама рэшткі скуранога адзеньня. На выцягнутым Айсману трымаўся толькі ягоны скураны абутак. У такім выглядзе цела завезьлі ў найбліжэйшую аўстрыйскую вёску, а там, зьмясьціўшы ў труну й зламаўшы пры гэтым незнарок левую руку, якая адтапырвалася ўбок і ня ўпіхвалася ў новую схованку, адвезьлі ў Інсбрук.

Ужо на чацьверты дзень пасьля гэтага невялікі гурт аматараў горных вандровак накіраваўся на месца адкрыцьця «лёдавага чалавека». Але ў аматарскім запале, высякаючы лёд сякерамі й калупаючы яго лыжнымі палкамі, гора-дасьледчыкі моцна пашкодзілі некаторыя рэчы дагістарычнага чалавека.

У Інсбруку знойдзенае цела агледзеў Конрад Шпіндлер – археоляг зь Інстытуту дагісторыі й ранньяй гісторыі. «Мне спатрэбілася толькі адна

сэкунда, каб убачыўшы цела, вызначыць яго ўзрост у 4000 гадоў», -- казаў К.Шпіндлер. Ён памыляўся, хоць і быў у той сытуацыі абсалютна аб'ектыўны, бо менавіта такім часам – канцом трэцяга ці пачаткам другога тысячагодзьдзя да нараджэньня Хрыстова магла датавацца медная сякера, якая належала Айсману. Факт адкрыцьця цела дагістарычнага чалавека набываў значэньне навуковай сэнсацыі.

Спэцыялістаў найбольш ўразіла тое, што цела Айсмана мела выключна добрую захаванасьць. Паводле гэтага паказчыка яго нельга й параўноваць са знакамітым Пітэрам Машам – трупам чалавека двухтысячагадовай даўнасьці, знойдзеным пры мэліярацыйных работах у Даніі. 15 радыёкарбонных дат удалося атрымаць з рэштак цела, некаторых рэчаў, абутку Айсмана. Паводле вызначанай храналёгіі, Айсман мог загінуць блізу 3300 гадоў да наражэньня Хрыстовага. На сёньняшні дзень гэта самая старажытная знаходка чалавечага цела такога стану ў Эўропе, а магчыма і ў сьвеце.

Як мяркуюць спэцыялісты, Айсман захаваўся дзякуючы зьбегу абставін. «Лёдавы чалавек» загінуў нечакана. Ён трапіў у скалістую западзіну – своеасаблівую каменную нішу, над якой навісалі камяні ды прыкрывалі цела ад імклівых сьнегавых і лёдавых апоўзьняў, што адбываліся тут на працягу апошніх тысячагодзьдзяў. Сьнег і лёд спаўзаў побач, не кранаючы Айсмана. Магчыма, адразу пасьля сьмерці цёплы восеньскі вецер нейкі час высушваў цела нябожчыка. Айсман умерз у лёд, які на доўгі час закансэрваваў яго, паслужыўшы натуральным муміфікацыйным сродкам. Дасьледчыкі сьцьвярджаюць, што Айсман, верагодна, быў знойдзены на трэці дзень пасьля таго, як ён зьявіўся з-пад сьнегу й лёду. Пра дзён колькі яго б прысыпала сьнегам зноў. Цела ўмерзла б у лёд, і хто ведае, ці трапіўся б ён калі-небудзь на вочы людзям.

Айсман дайшоў да нашага часу ў такім добрым стане, што нават вочы не згубілі сваёй празрыстасьці. Праўда, пад лёдавым ціскам сплюшчыліся нос і губы, але ўзнаўленьне чалавечага твару па чэрапе не зьяўляецца вялікай праблемай для сучаснай антрапалёгіі. На падставе кампутарных паказчыкаў абмераў галавы, зробленых у Інстытуце анатоміі Інсбруцкага ўнівэрсытэту, і плястычнай мадэлі чэрапа, якую выканалі ў Дэнвэрскім музэі гісторыі прыроды, Джон Гечы з дапамогаю іншых спэцыялістаў узнавіў твар Айсмана такім, які ён быў пры жыцьці. Найбольш часта Гечы ўспамінаў апошні этап сваёй працы ( а яна цягнулася больш за 600 гадзін), калі яму прыйшлося зьвяртацца да людзей са словамі: «Я куплю ў вас бараду!» Сабраўшы неабходную колькасьць патрэбнага колеру валасоў, Гечы закончыў унікальную рэканструкцыю. У інстытуцкай лябараторыі на людзей XX стагодзьдзя глядзеў мужчына з крыху прыплюснутым гарбатым носам, адкрытым ілбом, чорнымі, кучаравымі й доўгімі валасамі, кароткаю барадою.

Былы прафэсар Хэмпшырскага коледжу Дэвід Робэртс апублікаваў у *National Geographic* артыкул пра Айсмана, суправаджаючы тэкст цудоўнымі фотаздымкамі Кенэта Гарэта, якія той зрабіў у Аўстрыі. Разглядаючы іх, я адзначыў для сябе, што ўсохлыя рэшткі Айсмана ў нейкай ступені захавалі нават колер пігмэнтацыі чалавечай скуры, якая на фотаздымках выглядае як загарэлае на сонцы цела.

Айсман меў каля 160 см росту. Ёе памёр ува ўзросце 25-40 гадоў. Яго фігура і іншыя марфалягічныя паказчыкі адпавядаюць парамэтрам тагачаснага познанэалітычнага насельніцтва тэрыторыі Італіі і Скандынавіі. Папярэдні аналіз ДНК Айсмана дазваляе прыйсці да высновы, што іх дадзеныя ў пэўнай ступені паказваюць на сувязь з паўночнаэўрапейскімі атрапалягічнымі тыпамі.

Зубы «лёдавага чалавека» былі моцна сьцёртыя. Спэцыялісты мяркуюць, што прычынаю гэтага можа быць даволі частае ўжываньне ў ежу грубай расьліннасьці. А калі мець на ўвазе той факт, што найбольш зношанымі былі пярэднія зубы, то ў якасьці яшчэ аднаго з тлумачэнняў варта прыняць здагадку пра актыўнае выкарыстаньне зубоў у часе апрацоўкі пэўных матэрыялаў. Старажытныя народы, паводле запісаў этнографаў, вельмі часта з дапамогаю зубоў зьдзяйсьнялі некаторыя апэрацыі па апрацоўцы кары, валокнаў, скуры.

Калі знайшлі Айсмана, то галава яго была амаль лысая. Але гэта не азначае, што ў яго не было прычоскі. Побач зь целам, на рэштках яго адзеньня ўдалося адшукаць сотні кучаравых валасінак даўжынёю да 9 см. Верагодна, валасы на галаве Айсмана былі падстрыжанныя. На мочцы правага вуха захаваліся сьляды ад упрыгожвання зь вострымі гранямі.

Антраполягі Інстытуту анатоміі адразу зьвярнулі ўвагу на татуяваньне, якое было нанесенае на цела старажытнага чалавека. Дзесяць рысак блакітнага колеру заўважалася на паясьніцы. Сьляды татуяваных знакаў пры ўважлівым аглядзе скуры адшуканыя таксама на левай назе ззаду калена й на шчыкалатцы. Магчыма, яны мелі магічны ці рытуальны сэнс. Ува ўсялякім разе, нанесеныя на тых месцах чалавечага цела, якія рэдка бываюць навідавоку, гэтыя знакі не прызначаліся для абавязковага паказу, чым і падкрэсьлівалася іх патаемнасьць, сакральнасьць. Паўль Бах прыводзіць іншае, прагматычнае, тлумачэньне нанясеньня нарэзак на цела. Яны маглі быць усяго толькі сьлядамі тэрапэўтычнага ўмяшальніцтва, дзеля таго, каб палегчыць боль ад артрыту.

Анатамаў цікавіў стан унутранных органаў Айсмана. Пасьля агляду мазгоў, цягліц, лёгкіх, сэрца, печанёў ды органаў страваваньня вучоныя вызначылі іх стан як здавальняючы. Праўда, на лёгкіх заўважаліся сьляды пацямненьня ад

дыму (вынік узьдзеяньня адкрытых вогнішчаў?), а артэрыі і крываносныя судзіны былі зацьвярдзелымі…

Усё больш пераконваючыся ў тым, што знойдзены ў Альпах чалавек – унікальнае адкрыцьцё нашага стагодзьдзя, аўстрыйскія спэцыялісты задумаліся, як надалей захаваць яго цела. У першыя ж дні на скуры Айсмана сталі зьяўляцца грыбковыя плямы. Труп быў зьмешчаны ў лядоўню, дзе падтрымлівалася пастаянная тэмпэратура - 6 С і вільготнасьць каля 98%. Цяпер цела даставалі з маразільнай камэры для агляду толькі на 20 хвілін праз кожныя два тыдні. Для Айсмана былі створаныя ўмовы, набліжаныя да асяродзьдзя, у якім ён закансэрваваўся больш чым на пяць тысяч гадоў. Праўда, і гэта, як ні шкада, ня можа выратаваць яго ад няўмольнага часу. Давід Робэртс, які меў магчымасьць пабачыць Айсмана ў часе чарговага сэансу, пісаў, што пасьля ляжаньня ў маразільніку цела яшчэ больш высахла, рукі й ногі станчэлі й сталі як палкі, туга абцягнутыя скурай, якая да таго ж пацямнела.

Дарэчы, праблема захаваньня цела Айсмана, хаця б на той час, які патрэбны для яго ўсебаковага й грунтоўнага вывучэньня, дазваляе аўстрыйцам трымаць Айсмана ў Інсбруцкай лябараторыі. Справа ў тым, што аўстрыйская паліцыя знайшла цела за 92 м ад сваёй мяжы ў аўтаномным раёне *Alto Adige*, што ў Італіі. Гэта паслужыла падставаю для італійскай адміністрацыі законна палічыць Айсмана сваёй уласнасьцю і вярнуць яго Італіі. Аўстрыйцы, ня маючы нічога супраць, паабяцалі перадаць старажытнага чалавека, але пасьля таго, як будзе закончана абсьледаваньне.

Пасьля адкрыцьця Айсмана на месца ягонай сьмерці накіраваліся археолягі. Да сэнсацыі захаванасьці цела дагістарычнага чалавека ў лёдзе Альпаў дадалася яшчэ адна – адкрыцьцё цэлага шэрагу прыстасаваньняў і прыладаў, якія ён нёс з сабою.

Кожная эпоха складаецца з характэрных для свайго часу артэфактаў, гэта значыць рэчаў, што зробленыя чалавекам. Яны – рэальныя і, часам, адзіныя сьведкі эпохі. У такім разе рэчы павінны «гаварыць» за чалавека. Рэчы Айсмана мелі такі выгляд, як быццам іх пакінулі толькі ўчора. Не было патрэбы іх рэканструяваць. Імгненна прыпыніўшы хаду часу, іх нібыта выхапілі з канца чацьвертага тысячагодзьдзя і паклалі перад нашымі вачыма. Набор рэчаў быў клясычны для згадай эпохі.

Айсман меў пры сабе невялікую кайстру зь бярозавай кары. Акрамя кавалачка мяса дзікага казла ды сырых ягад цёрну, у ёй навукоўцы знайшлі крамнёвы нож, касьцяную іголку, клубок расьлінных валокнаў, шматок шэрсьці, кароткую палку, асаджаную аленевым рогам, рэшткі драўніннага вугалю. Нож складаўся з крамянёвага ляза ўсяго ў 4 см даўжынёю, дзьвюх палавінак ясеневай тронкі (даўжыня яе каля 8 см), якая ў двух месцах была

перавязаная вяровачкамі. Лязо па рэжучаму краю мела сьляды прыпаліраванасьці, што характэрна для серпападобных прыладаў, якімі рэжуць траву. Людзі часоў Айсмана, як, дарэчы, і ў эпоху бронзы, жалеза, шырока выкарыстоўвалі расьлінныя валокны ў побыце. Нездарма ў такім выпадку чалавек меў пры сабе нож для зрэзваньня травы. Нож, мусіць, устаўляўся ў ножны. Яны нагадвалі звужаны ўнізе мяшэчак, зграбна змайстраваны з травяністых валокнаў.

Палка з рагавым наканечнікам – добра знаёмае археолягам прыстасаваньне для сколваньня пласьцін з крамянёвага ядрышча. Шматок шэрсьці, як і вугаль, мог выкарыстоўвацца для распалкі вогнішча.

За чатыры з паловаю мэтры ад Айсмана ў лёдзе ляжаў калчан з аленевай скуры. Добра пашыты й прымацаваны краем да гладкай круглай палкі (каб нч гнуўся?), ён зьмяшчаў 12 незакончаных стрэл з калінавых дубцоў. Акрамя іх у калчане ляжалі 2 стралы, прыдатныя для выкарыстання, бо мелі прымацаваныя крамянёвыя наканечнікі і апярэньне. Даўжыня дрэўкаў даходзіла да 75 см. Апрацаваныя з двух бакоў наканечнікі стрэл і трайное апярэньне мацаваліся да дрэўкаў смалою. Запасныя кавалачкі смалы, як і неачышчаныя сухажыльлі, клубок валакністага шнурка, касьцяная іголка ды некаторыя іншыя дробныя рэчы таксама захоўваліся ў калчане Айсмана. Відаць, ён выкарыстоўваў іх для наладжваньня стрэлаў і луку.

Лук знайшоўся ў воддалі ад калчана, пад іншым каменем. Гэта была доўгая, амаль у 180 см выгнутая палка зь ціса безь цяцівы й зазубрынаў пад яе. Значыць і лук, верагодна, быў не закончаны. Адзін бок прыгатаванай палкі быў падчасаны, сплюшчаны, другі -- акруглы. Драўніна лука была прапітаная тлушчам ці крывёю (для лепшай захаванасьці на больш працяглы тэрмін гнуткіх якасьцяў ціса?).

Побач з лукам ляжала медная сякера, дакладней, цісавае дзяржальна даўжынёю каля 60 см з каленчатым выгінам, у расшчэплены тарэц якога было ўстаўлена меднае лязо з закраінамі. Каб яно надзейна трымалася й не выпадала, расшэпленая частка сякерышча перавязвалася скураною стужкаю, а затым замацоўвалася вяроўчынаю. Такія медныя сякеры раней даволі рэдка траплялі ў рукі археолягаў. Італійскія дасьледчыкі адносяць іх да тыпу *Remedello.* Так называецца могільнік трэцяга тысячагодзьдзя да нараджэньня Хрыстова ў паўднёвых Альпах, дзе сярод іншых пахавальных рэчаў сустракаліся адмысловыя медныя сякеры.

У старажытнасьці, асабліва ў канцы неаліту – пачатку эпохі бронзы сякеры дужа шанавалі. Пошукі меднай руды й выплаўка медзі даваліся няпроста. Дарэчы, навыкі выплаўкі, апрацоўкі й выкарыстаньня медных вырабаў жыхары альпійскіх далінаў, магчыма, перанялі ад балканскіх народаў недзе ў пачатку чацьвертага тысячагодзьдзя да нараджэньня Хрыстовага…

Аказваецца, у тыя часы людзі ўжо карысталіся заплечнымі сумкамі. Такога кшталту рэч належала Айсману. Каркас яе складаўся з U-падобнай палкі ляшчыны і перакрыжаваных дранак лістоўніцы.

Пералік яго рэчаў будзе няпоўны, калі не дадаць, што ў іх лік уваходзілі: сплеценая травяная падсцілка, пляскаты мармуровы дыск, кавалачкі зморшчанага грыба, што растуць на дрэвах. Дыск упрыгожваўся 20 скуранымі раменьчыкамі. Скураныя пасачкі прасякалі таксама й грыб. Што гэта лекавае рэчыва ці магічны талісман? Паўль Бах піша, што такі грыб мог выкарыстоўвацца Айсманам ў якасці эфэктыўнага антыбіётыка. Лекавацца чалавек мог і пірытам, кавалачак якога знайшлі сярод рэчаў Айсмана.

Дагэтуль навукоўцы спрабуюць узнавіць адзеньне «ледзянога чалавека». Моцна пашкамутанае падчас верасьнёўскага вытратаваньня і першых непрафэсійных пошукаў, яно амаль не падлягае рэканструкцыі. Пакуль вядома, што на Айсману маглі быць скураныя штаны ці толькі доўгая скураная кашуля. У старажытнасьці яе ўмела й надзвычай зграбна пашылі з кавалкаў апрацаванай скуры. У якасьці нітак выкарыстоўвалася сухажыльле. У некаторых месцах кашуля рамантавалася з дапамогаю расьлінных валокнаў. На нагах захаваліся рэшткі скуранога абутку накшталт гамашаў ці крагаў, уцепленых сухою травою. На абутку бачна шмат дзірак, у якія ўцягваліся завязкі – сьведчаньне неаднаразовага і частага рамонту. Дарэчы, пра ненадзейнасьць абутку Айсмана дазваляе гаварыць й той факт, што адзін зь яго малых пальцаў на назе, робяць заключэньне спэцыялісты мэдыкі, меў сьляды хранічнага абмаражэньня. Каля галавы ляжала накідка з грубай валакністай травы. Яна замацоўвалася пераплеценымі вяровачкамі. Накідкаю чалавек мог прыкрываць плечы й сьпіну ў халоднае й сырое надвор’е.

Любая сэнсацыя выклікае шумны рэзананс. Так і пасьля паведамленьня пра Айсмана не абышлося без фантазій і прыдумак. У газэтах нават сустракаліся такія фантастычныя вэрсіі накшталт той, што Айсман – гэта ні больш, ні менш усяго толькі эгіпецкая мумія з Брытанскага Музэю, якую нехта выкінуў некалі ў Альпах (!). Адна немка прызнавалася, што яна напісала кніжку пра свае начныя сэансы з Айсманам. Нейкая кабета ўсур’ёз настойвала на тым, каб яе апладнілі замерзлай спэрмай «ледзянога чалавека» (!).

Хто ж ён быў – *Iceman Otzi?* У ім бачылі адзінокага гандляра, які заблукаў і замерз у гарах, ці пастуха, што згубіў ці пашкодзіў свой лук і стрэлы, і таму блукаў у пошуках матэрыялу для новай зброі. Пісалі, нават, што ён быў шаманам, які падняўся ў горы на рытуальную бітву з злымі сіламі…

На зялёных альпійскіх далінах пяць тысяч гадоў назад людзі ўжо разводзілі быкоў, авечак, сьвіней, козаў, вырошчвалі пшаніцу, ячмень. Ведалі нават колавыя павозкі. У Альпах на тэрыторыі сучаснай Швайцарыі ў 1979 годзе археолягі знайшлі кляновае кола, якое было зроблена прыблізна ў 3200 годзе

да нараджэньня Хрыстовага. Акрамя таго, тагачасныя жыхары Альпаў умелі араць глебу, рабілі адзеньне з расьлінных валокнаў, у тым ліку і зь ільняных.

Найбольш верагодна, што Айсман быў пастухом. Догляд і разьвядзеньне свойскіх жывёлаў, вырошчваньне злакаў, паляваньне на зьвяроў, выраб неабходных рэчаў і прыстасаваньняў для сваёй гаспадаркі – звычайныя заняткі тагачасных мужчын. Амаль некранутая дзікая прырода акаляла чалавека. Людзі настолькі гарманічна ўліваліся ў навакольнае асяродзьдзе, што лічылі сябе працягам прыроды й неадʼемнай яе часткаю. Гэта быў час гармоніі чалавечага духу й неасяжна суворай прыроднай стыхіі...

Айсман, мусіць, вяртаўся ў даліну, дзе было ягонае селішча і жылі ягоныя суродзічы. Верагодна, ён ішоў праз *Otztal* на поўдзень у даліну *Val Senals*. Для такога меркаваньня ёсьць пэўныя падставы. Сярод рэштак адзеньня навукоўцы знайшлі асьцюкі пшаніцы. Вілі Гроенман-Ван з Амстэрдамскага ўнівэрсытэту адшукаў такія ж асьцюкі і ў валасах Айсмана. Кастрыца ад пшаніцы, безумоўна, магла трапіць на чалавека ў даліне, там, дзе яна можа расьці. Найбліжэйшая ад перавалу даліна – *Val Senals*. Разам з сваімі калегамі батанік Зігмар Бортэншлягер зь Інсбруку аналізаваў кавалачкі вугольля, якія ляжалі ў Айсманавай сумцы. Вугаль паходзіў ад дрэў, якія расьлі ў Альпах, а найбліжэйшая мясьціна, дзе іх маглі сьсекчы – даліна *Val Senals*. Да яе ад месца сьмерці чалавека – 5-6 гадзінаў хады.

Мусіць, ужо ніхто ніколі не даведаецца, чаму Айсман апынуўся высока ў гарах. Аглядаючы труп, экспэрты не знайшлі на яго целе прыкметаў якіх-небудзь небясьпечных для яго жыцьця хваробаў, а таксама пашкоджаньняў, якія сьведчылі б пра забойства, падзеньне й г.д. Найбольш верагодна, што ён загінуў у выніку перахалоджваньня падчас буры, якія часта здараюцца на такой вышыні ў Альпах. Фатограф Кенэт Гарэт, здымаючы Альпы на месцы сьмерці Айсмана, расказваў журналістам, што летам за кароткі час ён перажыў тут некалькі такіх бураноў і зразумеў, што яны – вялікая пагроза для чалавечага жыцьця.

Я ўспомніў адну калядную гісторыю, якую некалі чытаў сваім малым дзецям. У ёй расказвалася пра беднякоў, якія сьпяшаліся да сваёй сямʼі на Каляды праз альпійскі перавал Сэн-Бэрнар. Пачаўся сьнежны буран. І, мусіць, загінулі бы тыя людзі ў гарах, засынаючы ад холаду пад выцьцё пранізьлівага ветру, каб не манахі знакамітага Сэн-Бэрнарскага кляштару з сваімі сабакамі-выратавальнікамі.

Тых небаракаў у калядную ноч выратавалі сэнбэрнары й спагадлівыя манахі. Айсмана, мусіць, не было каму ратаваць. Прафэсар Дэвід Робэртс, паспрабаваў узнавіць ходу тых драматычных падзеяў. Магчыма, піша ён, Айсман гнаў у даліну статак на зіму. Нечакана наляцеў буран. Чалавек памкнуўся ў цясьніну пад прыкрыцьцё скал. Але й там не было выратаваньня

ад ледзянога са сьнегам ветру. Змагацца з стыхіяй станавілася ўсё цяжэй: цясьніну заносіла сьнегам, холад прабіраў цела да касьцей. Прасоўваючыся ў сьнежнай імгле наперад да камяністага выступу, чалавек пачаў пакідаць свае рэчы: калчан, лук, заплечны каркас, сякеру, сумку... Дайшоўшы да шырокага каменя, які знаходзіўся амаль у цэнтры засьнежанай цясьніны, чалавек, скурчыўшыся ад холаду, прылёг тварам уніз на камень, закрываючы галаву й плечы накідкаю. Лёг і больш не падняўся.

Сьнег і лёд зрабілі сваю справу, скаваўшы цела чалавека на цэлых 5300 гадоў.

KAMUNIKAT.org

## *ЛЮДЗІ НА ВАДЗЕ*

*Пасьля таго, як у сярэдзіне XIX ст. пад Цюрыхам на дне возера былі знойдзеныя сьляды жытлаў і паляў, у археалягічнай літаратуры пачала абмяркоўвацца праблема "палевых паселішчаў". Далейшыя пошукі на дне і ўзьбярэжжах прыальпійскіх азёраў прывялі да адкрыцьця культуры цэнтральнаэўрапейскіх азёрных пасёлкаў позьняга і бронзавага вякоў.*

*А ў 1960-70-х гадох, калі "палевыя паселішчы" пачалі актыўна дасьледавацца ў Прыдзьвінскім краі і на Смаленшчыне, Аляксандар Міклаеў пачне пісаць, што ў Беларусі і суседніх зь ёю Пскоўскай і Смаленскай абласьцях у II-III тасячагодзьдзях да н.э., несумненна, існавала адмысловая цывілізацыя будаўнікоў палевых паселішчаў, якія мелі працяглыя і ўстойлівыя культурныя сувязі з насельніцтвам Цэнтральнай Эўропы.*

*Вада была ня толькі найгалаўнейшай умоваю жыцьця людзей на палях, але й выдатным "архівам інфармацыі": у вільготнай глебе, азёрных донных адкладах ці проста ў вадзе ў найлепшым выглядзе захоўваліся рэшткі драўляных будынкаў, рэчы з костак, дрэва, тканіна…*

## ПРЫАЛЬПІЙСКІЯ "ПАЛЕВЫЯ ПАСЕЛІШЧЫ"

Першыя паселішчы на палях былі адкрытыя ў Швайцарыі яшчэ ў сярэдзіне XIX стагодзьдзя. У часе халоднай і сухой зімы 1853-54 гадоў узровень большасьці азёраў пад Цюрыхам панізіўся настолькі, што агаліліся вялікія ўчасткі прыбярэжнага дна. Менавіта тады на берагох сталі праглядацца рэшткі паляў ды іншых драўляных канструкцыяў, разнастайных старажытных рэчаў… Сьцьвярджаюць, што найбольш уважліва да іх стаў прыглядацца мясцовы настаўнік Ёганэс Аэплі. Прадчуваючы незвычайнасьць зробленых ім назіраньняў, Аэплі паведаміў пра іх вядомаму спэцыялісту ў старажытнай гісторыі зь Цюрыху Фэрдынанду Келеру. Агледзеўшы палі ды іншыя дзіўныя знаходкі, Келер прыйшоў да высновы, што на возеры ў старажытнасьці існавалі палевыя паселішчы. Яны маглі будавацца на беразе ці разьмяшчаліся над вадой возера. Апошнюю сваю здагадку Келер палічыў найбольш праўдападобнай. Хаціны старажытных людзей, разважаў далей дасьледчык, маглі стаяць на палях і злучаліся зь берагам.

Пасьля больш чым ста гадоў раскопак і працяглых дыскусіяў па выніках археалягічных дасьледаваньняў азёрных паселішчаў большасьць спэцыялістаў стала сьцьвярджаць, што, насамрэч, пасёлкі будаваліся не на вадзе, а на берагах старажытных вадаёмаў. Падлогі будынкаў маглі разьмяшчацца на слупах. Паселішчы апыналіся ў вадзе ў выніку ваганьня ўзроўню вады ў азёрах, што вельмі часта здаралася ў пэўныя кліматычныя пэрыяды,

прынамсі, у канцы III-II тысячагодзьдзяў да н.э. Пасьля чарговага пад'ёму вады "палевыя паселішчы" гінулі, а іх жыхары вымушаныя былі займаць больш спрыяльныя для жыцьця ўчасткі берагоў. Праўда, іншыя археолягі застаюцца перакананымі, што пры пэўных абставінах жыцьцё на "палевых паселішчах" працягвалася і над вадой.

"Палевыя", ці інакш, "швайцарскія паселішчы", пазьней былі адкрытыя ня толькі на Цюрыхскім, але і на многіх іншых прыальпійскіх азёрах. Такога тыпу археалягічныя помнікі дасьледаваліся ў Нямеччыне, Аўстрыі, Італіі, Францыі. Большасьць зь іх адносіцца да часоў нэаліту і эпохі бронзы.

На месцы паселішчаў ува ўмовах багністых азёрных адкладаў добра захаваліся ня толькі драўляныя часткі канструкцыяў пабудоваў, у тым ліку палі, але й рэшткі пабытовых рэчаў з костак, дрэва, посуд, дэталі адзеньня, тканіна, плеценыя вырабы ды іншы рыштунак, які ня знойдзеш у пясчаных культурных пластах. Жытлы найчасьцей былі простакутнымі. На падлозе разьмяшчалася агнішча, змайстраванае з гліны. Сярод тысячаў жэрдак, слупоў, дошак, палак археолягам часта трапляліся разьбітыя гаршчкі, крамянёвыя вырабы, у іх ліку, напрыклад, нажы з драўлянымі дзяржальнамі, лукі, сякеры, вёслы, плеценыя кашы, драўляныя цабэркі, сеткі, кавалкі тканіны, прадзіва...

У пластах такіх паселішчаў можна адшукаць рэшткі расьлінаў і нават кветкавы пылок. Іх аналіз дазваляе зразумець, як зьмяняліся краявіды ў тыя далёкія часы. Напрыклад, стала дакладна вядома, што ў пэрыяд пераходу ад нэаліту да бронзавага веку на берагах мясцовых азёр расьлі букавыя лясы.

У Швайцарыі, акрамя наземных раскопак, ужо некалькі дзесяцігодзьдзяў вядуцца падводныя работы па вывучэньні палевых паселішчаў. Праз унікальную мэтодыку і спэцыяльнае абсталяваньне археолягам удаецца расчышчаць і дасьледаваць на дне азёр шэрагі паляў і драўляныя канструкцыі часоў каменнага і бронзавага вякоў.

Знаходкі археолягаў можна паглядзець у шматлікіх музэях, якія разьмяшчаюцца ля падножжа Альпаў. А ў Нямеччыне на Бадэнскім возеры наведнікам паказваюць рэканструяванае "палевае паселішча" Унтэрулдзінген. Раскопкі многіх палевых паселішчаў працягваюцца дагэтуль. Пад Цюрыхам ці нават у межах самога гораду можна ўбачыць, як археолягі завіхаюцца ў пошуках сьлядоў, якія пакінулі жыхары пасёлкаў на палях.

## "ПАЛЕВАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ" ПАДЗЬВІНЬНЯ

Пачынаючы з 1960-х гадоў, археалягічнымі экспэдыцыямі Эрмітажа ў Пскоўскай вобласьці на берагах азёр Усьвяцкае, Жыжыцкае, Сеньніца, а таксама пад Вяліжам, што на Смаленшчыне, вывучаліся адмысловыя

"палевыя паселішчы". Старажытныя пасёлкі такога кшталту, паводле Аляксандра Мікляева, будаваліся і на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Маюцца на ўвазе ня толькі знакамітыя Крывіна і Асавец на Віцебшчыне, але і іншыя шматлікія месцы на балотах Друйкі, Друці, Вяльлі... Згадваючы іх, Аляксандар Мікляеў пісаў, што ў Беларусі і суседніх зь ёю Пскоўскай і Смаленскай абласьцях у часы нэаліту і эпохі бронзы існавала "адмысловая цывілізацыя будаўнікоў палевых паселішчаў, якія мелі працяглыя і ўстойлівыя культурныя сувязі з насельніцтвам Цэнтральнай Эўропы".

Усходнеэўрапейскія азёрныя паселішчы на палях таксама датуюцца III-II тысячагодзьдзямі да н.э. Паселішчы гінулі ў выніку катастрафічнага сваімі наступствамі пад'ёму вады. Людзі перасяляліся на высокія ўчасткі берагоў. Разбураныя пасёлкі, апынуўшыся ў вадзе, зь цягам часу затарфоўваліся. Багна навечна паглынала тое, што засталося ад колішняга чалавечага жыльля... Але сустракаюцца азёры, на якіх торф не ўтвараўся. У такім выпадку рэшткі палевага паселішча можна ўбачыць на дне возера. У 1976 годзе такое паселішча было знойдзена ў возеры Сеньніца пад Невелем на глыбіні 1,5 м. Людзі пакінулі яго ў сярэдзіне II тысячагодзьдзя да н.э.

Пры вывучэньні паселішча Сяртэя, што каля Вяліжа, археолягам прыйшлося пагружацца ў ваду з аквалянгамі і з дапамогаю эжэктараў размываць сапрапель. У Сяртэі знайшлі рэшткі памосту, які абапіраўся на палі. Сяртэя загінула ў вялікім пажары. Побач з насьцілам археолягамі знойдзеныя моцна абгарэлыя косткі мужчыны сярэдняга веку.

Пад "палевыя паселішчы" людзі найчасьцей выбіралі ціхія залівы, там, дзе ўпадала ці выцякала з возера рачулка. Як гэта ні дзіўна, але адно зь Сяртэйскіх паселішчаў разьмяшчалася на палях пасярод невялікага возера, берагі якога на той час былі моцна затарфаваныя. На Ўсьвяцкім возеры палевае паселішча будавалася за 20-30 м ад старажытнай берагавой лініі. Глыбіня вады на месцы палевых жытлаў даходзіла да 70-80 см. Палі пры гэтым мелі даўжыню 1-1,5 м. Паселішча складалася з шэрагу пабудоваў, кожная зь якіх займала плошчу больш за 20 кв.м. Жытлы стаялі ўздоўж берага і злучаліся адно з адным драўлянымі пераходамі.

Вызваленыя з-пад торфу драўляныя канструкцыі вельмі хутка гніюць. Апынуўшыся на паверхні, яны цямнеюць, пакрываюцца трэшчынамі, а затым пачынаюць рассыпацца. Сярод тысячаў драўляных рэшткаў зь цяжкасьцю ўдаецца прасачыць канструкцыю жыльлёвых і гаспадарчых збудаваньняў. Міхась Чарняўскі на Крывінскім тарфяніку, на Віцебшчыне, раскопваў паселішча, якое забудоўвалася жытламі з двухсхільным дахам. Жэрдкі даху трымаліся на гарызантальнай кладзі, якая абапіралася на разьвілкі-расохі. Страха пакрывалася трысьнягом. У будынках знаходзіліся адкрытыя агнішчы, аснову якіх складалі пласты пяску на вымастках зь яловай

кары.

Ад чалавечай дзейнасьці на месцы паселішчаў захавалася шмат вырабаў з каменю, костак, дрэва, шматлікая кераміка, упрыгожваньні, касьцяныя скульптуркі і іншыя творы мастацтва, луска рыб, косткі жывёл, шалупіньне пладоў, ракавіны, рознае сьмецьце...

Як тлумачаць спэцыялісты такое ўстойлівае памкненьне людзей разьмясьціць свае жытлы на ўзьмежжы вады і берага ці на вадзе? Варта меркаваць, што ўзьнікненьне "палевых паселішчаў" было адной з формаў адаптацыі да мясцовых умоваў з улікам зьменлівасьці тагачаснага клімату. Людзі сяліліся як мага бліжэй да вады ў час скарачэньня плошчы возера ці забалочваньня яго ўзьбярэжжа, бо гаспадарка іх засноўвалася на даволі эфэктыўнай эксплюатацыі комплексу трох асноўных тыпаў ляндшафту: вады, забалочаных берагаў, навакольных лясоў. Людзі жылі з рыбалоўства, зьбіральніцтва і паляваньня, у тым ліку на водную, балотную дзічыну. Але наўрад, маючы, напрыклад, на ўвазе плыткаводнае разьмяшчэньне паселішчаў, будаўніцтва на палях было абумоўлена патрэбамі бясьпекі.

Аналізуючы культуру жыхароў "палевых паселішчаў" Падзьвіньня, А.Мікляеў меркаваў пра магчымае існаваньне ў III-II тысячагодзьдзях да н.э. нейкага культурна-гістарычнага "калідору", які цягнуўся ад Цэнтральнай Эўропы праз прыдзьвінскі азёрны край і далей да Падняпроўя і Верхняга Паволжа. Шырыня такога ўмоўнага "калідору" магла вагацца ў залежнасьці ад гістарычных абставінаў, але пры гэтым доўгі час захоўваючы свой асноўны накірунак з паўднёвага захаду на паўночны ўсход.

Вялікая колькасьць "палевых паселішчаў" у Беларусі застаецца пакуль невядомай для археолягаў. А пра тое, што празь нейкі час навукоўцаў чакае ў гэтай галіне не адно выдатнае адкрыцьцё, сьведчыць мноства сабраных зьвестак. Я маю на увазе ня толькі аповеды рыбакоў пра бачаны біты посуд, слупы на дне некаторых азёр, але й паданьні пра масты над азёрамі, затопленыя калісь "цэрквы" і караблі і г д. Пра рэшткі дзіўнай керамікі, косткі, шалупіньне арэхаў ды жалудоў, памосты з дрэва ў тарфяніках часам згадваюць мэліяратары.

## ШЛЯХІ ПРАЗ БАГНУ

У 1950-х гадах у правінцыі Дрэнтхе, што на паўночным усходзе Галяндыі, у багністай глебе археолягі адшукалі дарогу, якою карысталіся тутэйшыя насельнікі каля 2000 году да н.э. Шлях праходзіў праз багну. Дарога складалася з шчыльна пакладзеныхна лагі бярвеньняў.

Яшчэ больш старажытны шлях па балоце быў знойдзены на паўднёвым захадзе Англіі ў Somerset Levels. Яму болей за 5000 гадоў. Археолягі раскапалі

яго на глыбіні некалькіх мэтраў. Sweet Track -- такую назву атрымаў адшуканы шлях – быў пабудаваны людзьмі для больш зручнага перасоўваньня да суседніх узвышшаў на балоце. Sweet Track цягнуўся больш за 1,5 км. Археолягі, якія вывучалі яго, знайшлі паміж бярвеньняў ці на ўзбочынах дарогі ня толькі сьляды апрацоўкі дрэва, але й розныя іншыя рэчы, згубленыя людзьмі ў старажытнасьці.

## БІСКУПІН -- ГАРАДЗІШЧА ПАСЯРОД ВАДЫ

У канцы эпохі бронзы, а тым больш у часы раньняга жалезнага веку, вада становіцца адной з найважнейшых умоваў бясьпечнага існаваньня людзей на ўмацаваных паселішчах.

У Польшчы на беразе возера Біскупін каля Познані можна агледзець бадай адно з самых відовішчных гарадзішчаў I тысячагодзьдзя да н.э. Біскупін -- паўзатопленыя рэшткі ўмацаванага паселішча, якое ўдалося ня толькі дасканала вывучыць, але й часткова аднавіць, ператварыўшы ў адмысловы музэйны цэнтар пад адкрытым небам.

У 1933 годзе школьны настаўнік Валенты Швэйцэр на адной з паўвыспаў возера Біскупін заўважыў вялікую колькасьць бярвеньняў, якія вытыркаліся на паверхні былога дна. Возера ў тыя гады моцна абмялела пасьля актыўнай мэліярацыі. Швэйцэр паведаміў пра сваё, на яго думку, вартае ўвагі адкрыцьцё ў Вялікапольскі музэй, дырэктарам якога ў той час быў знакаміты археоляг прафэсар Юзаф Кастшэўскі. У наступным годзе Кастшэўскі прыехаў у Біскупін. На працягу шасьці гадоў пад кіраўніцтвам прафэсара раскопвалася паўзатопленае паселішча. Пакрысе пачалі абазначацца контуры вуліц, рэшткі драўляных будынкаў і ўмацаваных гарадзішчанскіх сьцен. Сярод бярвеньняў археолягі знаходзілі вялікую колькасьць старажытных рэчаў, некалі згубленых ці пакінутых людзьмі.

Адкрыцьцё Біскупіна сталася адной з найвялікшых падзеяў у польскай археалёгіі напружаных передваенных гадоў. У літаратуры адзначаецца таксама вялікае грамадзка-палітычнае значэньне раскопак Біскупіна для тагачаснага польскага грамадзтва. Біскупін спрыяў актывізацыі цікавасьці да свайгомінулага, пад'ёму патрыятычных пачуцьцяў. Паведамленьні пра вынікі раскопак траплялі ня толькі на старонкі газэт і часопісаў, але й распаўсюджваліся з дапамогаю дырыжабляў, зь якіх да людзей ляцелі інфармацыйныя ўлёткі.

Вучні Юзафа Кастшэўскага працягвалі капаць Біскупін у пасьляваенныя гады. Нягледзячы на цяжкі эканамічны стан разбуранай вайною краіны, польскі ўрад усяляк спрыяў пасьпяховаму завяршэньню дасьледчых працаў у Біскупіне.

Паселішча ў Біскупіне займала паўвыспу плошчаю каля 2 га. Яно было акружанае валам шырынёю каля 4 м, які ўмацоўваўся сьцяною зь бярвеньняў. Пад гарадзішчанскія сьцены ўшчыльную падыходзіла вада, а таму іх атачылі спэцыяльнымі дубовымі бярвеньнямі, аб якія разьбіваліся хвалі возера. Уздоўж сьцен умацаванага паселішча праходзіла драўляная вуліца. Адзінаццаць іншых паралельных вуліц перасякалі гарадзішча ўпоперак. Уздоўж іх стаялі доўгія будынкі. Нягледзячы на тое, што хаты захаваліся часткова, толькі да вышыні 1 м, польскім археолягам удалося іх цалкам рэканструяваць. Будынкі мелі доўгія драўляныя сьцены. Кожнае з памяшканьняў складалася зь сенцаў і вялікага пакою, у якім разьмяшчалася каменнае агнішча. У кутку знаходзіліся драўляныя палаці. Падлога пакрывалася шчыльна пакладзеным бярвеньнем.

У Біскупіне жыло некалькі соцень жыхароў. Яны былі земляробамі і пастухамі. Палі й лугі разьмяшчаліся на берагах возера. Калі жыхары Біскупіна паміралі, іх крэміраваныя косткі зьмяшчалі ў пахавальныя пасудзіны й везьлі на могільнік, які разьмяшчаўся за возерам.

Паселішча існавала ў межах 700-400 гадоў да н.э. У канцы V стагодзьдзя да н.э. з наступленьнем больш халоднага й вільготнага клімату ў возеры адбываецца гвалтоўны пад'ём вады. Вада пачынае ня толькі падмываць берагі выспы, але й зацякаць на тэрыторыю гарадзішча. Ратуючыся ад прыліваў, біскупінцы павышаюць узровень вуліцы і падлогі, накладаючы новыя пласты бярвеньняў. У некаторых хатах археолягі адзначалі чатыры гарызонты драўніны. Абставіны змусілі людзей пакінуць гарадзішча, якое ўрэшце апынулася ў вадзе.

У 1949 годзе ў Біскупіне быў створаны музэй, у якім дэманстраваліся матэрыялы археалягічных раскопак. Аднаўленьне асобных участкаў вала, вуліц і дамоў пачалося ў 1968 годзе. Шматлікія наведнікі Біскупіна сёньня могуць прагуляцца па некаторых вуліцах старажытнага паселішча, увайшоўшы ў яго праз гарадзішчанскую браму зь невялікай вежай. У рэканструяваных будынках узноўлены інтэр'ер часоў раньняга жалезнага веку.

## *ХОХДОРФ:*
## *КУРГАН КЕЛЬЦКАГА ПРАВАДЫРА*

Рэната Лібфрыд – настаўніца з Хохдорфа, вёскі, што за 20 км на паўночны захад ад Штутгарту (зямля Бадэн-Вюртэмберг у Нямеччыне) у 1977 годзе зьвярнула ўвагу нямецкіх археолягаў на згрувашчваньне камянёў, якія навыворваў плугамі мясцовы фэрмэр на сваім полі. Магчыма, спэцыялісты не надалі б вялікай увагі назіраньням Рэнаты Лібфрыд, калі б не адна акалічнасьць. Тутэйшая мясцовасьць у ваколіцах некалі дасьледаванага кельцкага гарадзішча Хоэнашпэрг славілася "княжымі магіламі" – багатымі курганнымі пахаваньнямі часоў эпохі жалеза. Акрамя гэтага сама Рэната Лібфрыд – заўзяты аматар археалёгіі – карысталася ў асяродзьдзі прафэсіяналаў надзвычай вялікім даверам. І сапраўды раскопкі пад Хохдорфам на тым полі, пра якое расказала археолягам Рэната Лібфрыд, прывялі да адкрыцьця ўнікальнай па захаванасьці і надзвычай каштоўнай па якасьці і колькасьці знойдзеных рэчаў грабніцы кельцкага правадыра 6 ст. да н.э.

Курган, на які звярнула ўвагу настаўніца, ледзь вылучаўся на разаранай паверхні тутэйшых палеткаў. Толькі канцэнтрацыя камянёў розных памераў ды іх пэўнае разьмяшчэньне давала археолягам надзею на пошукі курганнай грабніцы. А спадзявацца нямецкім археолягам было на што, бо тутэйшая мясцовасьць, як і ўвогуле Паўднёвая Нямеччына, славіліся вялікай колькасьцю помнікаў археалёгіі, зьвязаных з жыцьцём старажытных кельтаў – няўрымсьлівых суседзяў антычных дзяржаў.

Пад Штутгартам з даўніх часоў археолягі дасьледавалі кельцкае гарадзішча Хоэнашпэрг. Умацаванае паселішча было абкружана шматлікімі грабніцамі мясцовай кельцкай знаці эпохі жалеза. Але большасьць знойдзеных пахаваньняў была разрабаваная ў розныя часы. Археолягам Штутгарту ўжо не адзін раз за апошнія 25 год прыходзілася мець зь імі справу, а таму ідэнтыфікаваць чарговую грабніцу не ўяўляла вялікай цяжкасьці.

Раскопкі кургану каля Хохдорфа праводзіліся пад кіраўніцтвам Ёрга Біля. Менавіта ён у 1977 годзе пасьля тэлефоннага званка Рэнаты Лібфрыд паехаў у Хохдорф. Агледзеўшы некаторыя месцазнаходжаньні, якія, на думку настаўніцы, маглі прыцягнуць увагу археолягаў, Ёрг Біль меў намер накіравацца дахаты. "Калі вы ўжо тут, -- стрымлівала яго фраў Лібфрыд, -- Вам варта як сьлед агледзець адно незвычайнае ўзвышша, якое разьмешчана на полі ў паўночна-ўсходнім баку ад вёскі. Плугі фэрмэраў пастаянна выворваюць там вялікія камяні". Біль адразу адчуў, што гаворка можа ісьці пра раньнюю кельцкую грабніцу, курганны насып над якой ужо даўно быў

зьнішчаны.

5 ліпеня 1978 г. Ёрг Біль з групай археолягаў Дзяржаўнай Службы Старажытнасьцяў зямлі Бадэн-Вюртэнберг пачаў раскопкі пад Хохдорфам. Як павядамлялася ў тагачаснай прэсе, толькі палявая праца каштавала археолягам Штутгарта каля 300000$. Але выдаткі былі вартыя таго, бо іх коштам было зьдзейсьнена адно з самых вядомых у 1970-ыя гады археалягічных адкрыцьцяў.

### *Раскопкі пад Хохдорфам*

Раскопкі кельцкага кургану расьцягнуліся на два палявыя сэзоны лета-восені 1978 і 1979 гадоў. Дасьледчая і кансэрвацыйная праца доўжылася да 1985 году. Сам курган дасягаў 60м у дыямэтры і мог мець вышыню каля 6м. Курганны насып перакрываў пахавальную грабніцу, для якой у старажытнасці выкопвалася ды абсталёўвалася спэцыяльная шахта памерамі 11×11м і глыбінёю каля 2,5м. У ёй зьмяшчалася драўляная канструкцыя кшталту вялікай скрыні плошчаю каля 7,5кв.м. Унутры пабудовы зь бярвеньняў знаходзілася меншая па плошчы пахавальная камэра. Прастора паміж кладкамі дрэва была запоўнена вялікай колькасьцю камянёў розных памераў.

Ёрг Біль пачаў раскопкі з пошукаў каменнай сьцяны, якая ў такіх выпадках павінна была прысутнічаць у кургане. І сапраўды, празь нейкі час археолягам удалося раскрыць каменную кладку па пэрымэтры насыпу. Пазьней пасьля пракладкі спэцыяльнай траншэі пачалі зьяўляцца камяні і рэшткі перагнілага дрэва – прыкметы пахавальнай камэры. Біль і яго калегі адразу адзначылі, што пахаваньне ў адрозьненьне ад раней дасьледаваных імі засталося, на шчасьце, не разрабаваным. Гэтая акалічнасьць надавала бадзёрасьці і цешыла спадзяваньнямі на адкрыцьцё цікавых матэрыялаў.

Перш чым узяцца за дасьледаваньне ўласна падкурганнай магілы археолягам прыйшлося шмат часу патраціць на раскопкі складанай канструкцыі пахавальнай камэры. Сьцены і перакрыцьці яе складаліся зь вялікіх дубовых брусоў, пакладзеных у некалькі радоў і заваленых камянямі розных памераў. Драўніна спарахнела, пад цяжарам камянёў (агульная іх вага складала каля 50 тон!) верхнія і бакавыя канструкцыі ўпалі, запоўніўшы сваёю масаю прастору грабніцы.

Перад тым як працягваць дасьледчую працу непасрэдна ў грабніцы археолягі вырашылі пабудаваць над курганам плястыкавы ангар на сталёвых апорах. Раскопкі расьцягваліся на два палявыя сэзоны...

Пасьля таго як рабочыя вынесьлі большасьць камянёў з паверхні магільнай камэры, пачаліся раскопкі яе запаўненьня. Наступіў той момант, які Ёрг Біль і

астатнія ўдзельнікі раскопак ужо ніколі не забудуць: пасьля стамлялььных расчыстак на паверхні праступіў абрыс сьпінкі бронзавай пахавальнай канапы, зьзелянелай ад часу.

### *Магіла правадыра*

Доўгая і напружаная праца прынесла свой плён. У некаторых месцах пахавальнай камэры, каб не пашкодзіць мікраскапічныя рэшткі тканіны, косткі ды іншую арганіку, якая, на вялікае шчасьце для спэцыялістаў, захоўвалася тут амаль 2,5 тысячы гадоў, прыйшлося вырэзваць запаўненьне блёкамі ды апрацоўваць іх ужо ў лябараторных умовах.

Шкілет і іншыя парэшткі пахаванага ляжалі на вялікай, амаль у тры мэтры удоўжкі, бронзавай канапе. Адкрыцьцё апошняй было сапраўднай сэнсацыяй для археолягаў, бо раней такога кшталту знаходкі пры раскопках не трапляліся. Канапа была зроблена зь ліставой бронзы, пакрывалася дарагою тканінаю ды футрамі. У якасьці ножак служылі 8 бронзавых скульптурак жанчын. Позы іх з узьнятымі рукамі нагадвалі цыркавых акрабатаў, якія балянсавалі на бронзавых колах акаваных жалезам. Але бадай самаю эстэтычнаю часткаю канапы была вонкавая паверхня яе сьпінкі. На зьзелянелай бронзе надзвычай прыгожа глядзеўся арнамэнтальны сюжэт, галоўная роля ў якім належала выявам чатырохколавых павозак, коней і танцораў зь мячамі.

На канапу было ўскладзена цела памерлага мужчыны ўва ўзросьце каля 40 год. Ад яго захаваўся шкілет, мэталёвыя ды іншыя ўпрыгожваньні адзеньня, асобныя дэталі вопраткі і абутку. Рост яго дасягаў 183см, што на галаву вышэй за большасьць вядомых яго супляменьнікаў. Дарэчы, у гэтых мясцовасьцях у тыя часы рэдка хто дажываў да 40 год.

Надзвычай багатае адзеньне памерлага было зроблена з тканіны, якая расшывалася кітайскім шоўкам. Якімі шляхамі ён трапляў да кельтаў у сярэдзіне 1 тыс. да н.э.? Адзеньне зашпільвалася груваcткімі залатымі фібуламі. Шырокі скураны пояс упрыгожваўся нашыўкамі з золата. На ім вісеў кінжал, рукаятка якога была аздоблена золатам. На шыі – залатая грыўна – сымбаль прыналежнасьці да элітнай вярхушкі кельцкага грамадзтва. Нават абутак нябожчыка ўпрыгожвалі залатыя арнамэнтаваныя нашыўкі.

Каля памерлага ляжаў канічнай формы капялюш зь бярозавай кары, а на месцы грудзёў – невялікая кайстра з драўляным грабенчыкам, жалезнымі нажніцамі, пяцьма бурштынавымі пацеркамі ды 3 жалезнымі кручкамі.

Арыстакратызм пахаванага падкрэсьлівалася ня толькі якасьцю адзеньня і адпаведнымі аздобамі, але і іншым магільным зьмесьцівам. Побач з бронзаваю канапаю ў кутку грабніцы стаяў вялікі кругладонны бронзавы

кацёл, які мог зьмясьціць каля 400л вадкасьці. Венчык сагана ўпрыгожваўся 3 фігуркамі ільвоў. Паводле заключэньня спэцыялістаў, такую пасудзіну ў тыя часы маглі зрабіць у адной з грэцкіх калёній, разьмешчаных у паднёвай Італіі. У катле ляжаў залаты кубак для піцьця, а на дне захаваліся сьляды напою. У час трызны кельты цешыліся медавухаю, менавіта да такога заключэньня прыйшлі экспэрты, дасьледаваўшы рудаватую сухую масу з дна катла.

У магільнай камэры прысутнічалі таксама некаторыя іншыя прыстасаваньні для памінальнай трызны, напрыклад, рогі для піцьця, разьвешаныя на сьцяне. Вялікая колькасьць посуду ляжала на адмысловай чатырохколавай драўлянай павозцы, акаванай жалезам. Аглобля воза, разьлічаная на запраганьне двух коней, упіралася ў сьценку грабніцы. Рэшткі драўляных вазоў археолягі і раней знаходзілі ў "княжых магілах" кельтаў, але хохдорфская знаходка вылучалася параўнальна добрай захаванасьцю і дасканаласьцю, бо была акаваная жалезам. Агульная даўжыня яе складала каля 4,5м. Такія павозкі спэцыяльна рабіліся для пахаваньня, бо яны істотна адрозьніваліся ад тых, якія выкарыстоўваліся кельтамі як транспартны сродак.

На масіўнай пляцформе павозкі акрамя 3 талерак з бронзы ды іншага посуду ляжалі прыстасаваньні для забою жывёлы, рэзаньня мяса.

Раскопваючы запаўненьне пахавальнай камэры, на месцы сьцен археолягі знаходзілі жалезныя і бронзавыя зашпількі. Вокіслы мэталёвых рэчываў спрыялі захаваньню рэштак тканіны. Гэта дазволіла сьцьвярджаць, што сьцены грабніцы драпіраваліся дарагімі тканінамі. Месцамі драпіроўка сьцягвалася шпількамі.

## *Кельты і іх правіцелі*

Дасьледаваны пад Хохдорфам курган быў насыпаны кельтамі паміж 550 – 500 гадамі да н.э. Хохдорфскі комплекс – найлепшы ўзор так званых кельцкіх "княжых магіл" позьнегальштацкага пэрыяду. Менавіта ў гэты час у асяродзьдзі кельцкай знаці пачынае актыўна адраджацца старадаўні звычай пахаваньня ў грабніцах з дрэва і камянёў, над якімі насыпаўся вялікі курган. Пышны пахавальны абрад падкрэсьліваў высокі сацыяльны і палітычны статус кельцкай эліты. Цікава адзначыць, што падобныя да драбніц элітныя магілы сустракаюцца на параўнальна вялікай тэрыторыі ад Багеміі да Францыі.

У тагачасным грамадзтве кельтаў рэзка ўзрастае значэньне мясцовай племяннной арыстакратыі. Асаблівай пышнасьці і багацьця дасягнула кельцкая знаць на тэрыторыі сучаснай Баварыі, дзе і знойдзена вялікая колькасьць

элітных пахаваньняў позьнегальштацкага пэрыяду. Ува ўмацаваных паселішчах будуюцца багатыя жытлы. Сьцены гарадзішчаў спачатку узводзяцца з дрэва і камянёў, а пазьней – з цэглы, тэхніка кладкі якой пранікла ў Цэнтральную Эўропу зь Міжземнамор’я.

Міжземнаморская цывілізацыя старажытных грэкаў, этрускаў моцна паўплывала на кельцкае грамадзтва. Па Дунаі і Рэйне з грэцкіх і этрускіх паселішчаў сюды траплялі шматлікія тавары, асноўныя патокі якіх кантраляваліся кельцкай племяннай арыстакратыяй. Таму ня дзіўна, што ў кургане пад Хохдорфам знойдзена шмат рэчаў, тым ці іншым чынам маючых дачыненьне да Міжземнамор’я.

Правадырскае пахаваньне з-пад Хохдорфа – адно з найвыдатнейшых адкрыцьцяў у эўрапейскай археалёгіі. Найбагацейшы пахавальны комплекс кельцкай грабніцы – ня толькі ўзор ювэлірнага, будаўнічага майстэрства старажытных эўрапейцаў у часы позьняга гальштату, але і выдатны матэрыял для рэканструкцыі сацыяльнай і палітычнай структуры кельцкага грамадзтва 6 ст.да н.э. Апошні аспэкт мае выключнае значэньне, бо менавіта ў той час кельты знаходзіліся напярэдадні грандыёзных зьменаў у сваёй гісторыі. Ужо ў наступным 5 ст.да н.э. на поўдні Нямеччыны зьнікаюць багатыя элітныя пахаваньні. Найчасьцей людзей цяпер хаваюць у параўнальна бедных вялікіх па плошчы бескурганных могільніках. А распаўсюджаны раней мастацкі стыль паступова зьмяняецца зусім іншымі традыцыямі. Ніхто ня можа пакуль дакладна адказаць на пытаньне, чаму так адбылося. Можа, курган з-пад Хохдорфу будзе адной з прыступак да разгадкі гэтай незразумелай старонкі старажытных кельтаў?

## *БАЛОТНЫЯ ЛЮДЗІ*

*«Некаторыя зь іх пры выяўленьні знаходзіліся ў такім стане, быццам былі пахаваныя зусім нядаўна», -- дзяліўся сваімі ўражаньнямі дацкі археоляг Пэтэр В.Глёб. Прысутнасьць у тарфяніках кісьлі, а таксама нізкае ўтрыманьне кіслароду ў балотнай вадзе садзейнічалі дубленьню скуры і захаваньню трупаў. Праблемы ўзьнікалі пасьля выяўленьня «балотных людзей». Толькі некаторых зь іх удалося захаваць, бо чалавечае цела пачынала адразу ж псавацца пад узьдзеяньнем атмасфэрнага кіслароду.*

*Як сьцьвярджаюць спэцыялісты, у балотах паўночна-заходняй Эўропы знойдзена каля 700 трупаў старажытных людзей. Большасьць «балотных людзей» датуецца першымі стагодзьдзямі нашай эры і знойдзеная ў Даніі. Іншых адшукалі ў Паўночнай Нямеччыне, Англіі, Уэльсе, Шатляндыі, Ірляндыі, Нарвэгіі, Швэцыі і нават у Цэнтральнай Эўропе.*

*Самая знакамітая знаходка – так званы Толундзкі чалавек…*

### *Толундзкі чалавек*

Наведнікі Сількеборскага музэю, што ў Даніі, найперш зьвяртаюць увагу на тую частку выставы, дзе экспануецца закансэрваваная цёмнатварая галава чалавека. Трупу з Толундзкага балота амаль 2000 гадоў. «…Галава Толундзкага чалавека, -- пісаў Пэтэр В. Глёб, -- захавалася вельмі добра, лепей, чым любая з усіх чалавечых галоваў, якія ацалелі з старажытных часоў у розных месцах зямной кулі. Стуленыя павекі і паўадкрытыя вусны… Галава, здаецца, і цяпер захоўвае дыханьне даўно спыненага жыцьця»…

Труп знайшлі 8 траўня 1950 году. Двое мужчын, капаючы торф на Толундзкім балоце, нечакана ў яме натыкнуліся на чалавечы твар. Яны кінуліся клікаць паліцыю. Паліцыянты зьвярнуліся да археолягаў, бо адкрыцьці «балотных людзей» здараліся ў гэтай мясцовасьці і раней. З Орхускага ўнівэрсытэту на месца незвычайнай знаходкі прыехаў Пэтэр В. Глёб – адзін зь вядучых спэцыялістаў у дагісторыі Ютляндыі. «… Я аказаўся твар у твар з чалавекам жалезнага веку, які трапіў у тарфянік каля двух тысячаў гадоў назад», – успамінаў пазьней прафэсар. «Ён ляжаў на правым баку ў позе соннага, галавою на захад, нагамі на ўсход, тварам на поўдзень. Пахаваньне знаходзілася на глыбіні 2,5-3 м ад паверхні тарфяніка і на адлегласьці 50 м ад цьвёрдай глебы. На галаве ў трупа была востраканечная скураная шапка, замацаваная пад падбародзьдзем раменьчыкам, стан ахінала гладкая скураная папруга. Адзеньня на ім не было. Валасы на галаве былі каротка падстрыжаныя, шчокі – чыста паголеныя, хоць падбародзьдзе і верхняя губа пасьпелі пакрыцца кароткім шчаціньнем. Шыю трупа сьцягваў

рэмень-удаўка, сплецены зь дзьвюх скураных стужак; тугая пятля ўрэзвалася ў горла, а вольны канец, зьвісаючы як зьмяя, спадаў уніз па плячы і па сьпіне».

У драўлянай скрыні Толундзкага чалавека прывезьлі ў Нацыянальны музэй, што ў Капэнгагене. Экспэрты, якія дасьледавалі труп, прыйшлі да высновы – чалавека ня проста задушылі скураною вяроўкаю, а павесілі. Падчас сьмерці яму было крыху болей за 20 гадоў. У кішэчніку і страўніку Толундзкага чалавека захаваліся рэшткі ежы, якую ён спажыў прыблізна за дваццаць гадзінаў да сьмерці. У складзе яе не было аніякіх сьлядоў мяса ці рыбы. Чалавек еў поліўку зь ячнога зерня, насеньня лёну ды іншых травяністых расьлін.

### *Чалавек з Граўбале*

Знойдзенае ў красавіку 1952 году каля Граўбале, у Нэбэльгардзкіх, балотах цела старажытнага чалавека сёньня можна пабачыць у Дагістарычным музэі данскага гораду Орхус. Кансэрвацыя адшуканага ў торфе чалавека з Граўбале была зробленая ў лябараторыі паводле мэтаду «дубленьня ў яме» з выкарыстаньнем дубовай кары.

Нэбэльгардзскія балоты разьмешчаныя за 18 км ад Толунду. Знойдзены ў тарфяніку чалавек загінуў у пэрыяд паміж 210 і 410 гадамі. Час сьмерці быў устаноўлены паводле радыёвугляроднага датаваньня печанёў і цягліцаў чалавека, а таксама ў выніку аналізу пылку кветак.

Цела чалавека з Граўбале параўнальна добра захавалася. Праўда, пад цяжарам пластоў торфу яно моцна сплюшчылася. На ім не было адзеньня і ніякіх іншых рэчаў. Горла чалавека ў старажытнасьці ад вуха да вуха перарэзалі нажом, што і сталася прычынаю ягонай сьмерці. На момант гібелі мужчыну было каля 30 гадоў.

Перад сьмерцю ён быў паголены, хоць над верхняй губою і на падбародзьдзі ўжо пасьпела прабіцца шчацьцё. Чалавек насіў доўгія валасы. Як і мужчына з Толундзкага балота, незадоўга да пагібелі ён спажыў поліўку зь зерня і насеньня. Дарэчы, спэцыялісты, аналізуючы віды расьлін, якія ўваходзілі ў склад ежы чалавека з Граўбале, адзначылі, што ён харчаваўся расьлінамі, здабытымі зімою ці раньняю вясною. Гэта дазваляе дапусьціць, што няшчасьнік сустрэў сваю сьмерць у зімова-веснавы час.

### *Піт Марш і каралева Гунхільда*

У жніўні 1984 году ў тарфяніку Ліндаў-Мос, што на поўдзень ад Манчэстэру, было знойдзена цела чалавека, якое праляжала ў балоце каля 2500 гадоў. Знойдзенаму чалавеку надалі імя Піт Марш (marsh у ангельскай мове азначае

«балота»). Цела было пашкоджанае каўшом экскаватара, але, на шчасьце засталася некранутаю яго верхняя палова.

Для вывучэньня і кансэрвацыі «балотны чалавек» трапіў у Брытанскі музэй. Піта Марша дасьледавала вялікая група навукоўцаў, у склад якой уваходзілі спэцыялісты ў судовай мэдыцыне, дэрматалёгіі, анатоміі, мікрабіялёгіі, анатоміі, мікрабіялёгіі і батаніцы. Чалавек меў рост 167 см. Памёр ува ўзросьце 20-30 гадоў. Гэта быў мужчына з рудымі вусамі, барадою, бакенбардамі і акуратна падстрыжанымі пазногцямі.

Для таго, каб захаваць Піта Марша, было вырашана замарозіць тыя рэшткі вады, якія засталіся ў яго целе, каб пазьней выпарыць крышталікі лёду ў вакуумнай камэры. Ад некаторых спэцыялістаў гучалі прапановы вылучыць зь яго цела гены ды вырасьціць іх у лябараторных умовах.

Калі Піт Марш набыў вядомасьць у наш час, то іншая знаходка «балотнай жанчыны», так званая Каралева Гунхільда стала знакамітаю ў XIX стагодзьдзі. Яе знайшлі ў 1837 годзе на тэрыторыі Даніі ў Харальдзк'еры. Цела атаясамілі з нарвэскай каралевай Гунхільдай, якую, як вядома, у сярэднявеччы ўтапілі ў багне. Труп высушылі і зьмясьцілі ў труну, якую падарыў з гэтае нагоды сам кароль Фрыдрык VI. Цела ў такім выглядзе і дагэтуль захоўваецца ў г. Вайле ў падземным склепе царквы сьв. Міколы. У наш час высьветлілася, што жанчына была ўтопленая ў балоце ў першых стагодзьдзях нашай эры і сталася, такім чынам, яшчэ адным «балотным чалавекам» жалезнага веку.

Захавалася паведамленьне пра тое, як у Ірляндыі ў 1780 годзе каля гары Драмкераг у тарфяным балоце знайшлі пахаваньне старажытнай арыстакраткі, цела якой пакоілася на трох коўдрах з воўны. На жанчыне была багатая сукенка з тонкай тканіны чырвонага зь зялёным колерамі.

Да нашага часу ў тарфяніку Борэ ляжала цела яшчэ адной жанчыны эпохі жалеза. Кабета разьмяшчалася на спэцыяльнай посьцілцы з бярозавай кары. Верхняя палова яе цела была голая, а ніжняя прыкрывалася коўдраю з воўны. Побач знайшлі яшчэ адзін труп – мужчыны. Чалавек апынуўся ў балоце пасьля таго, як быў павешаны ці задушаны. На шыі ахвяры засталася вяроўка, зацягнутая пятлёю. Патыліца мужчыны была моцна пабітая. На задушаным не знайшлі нічога, акрамя вяроўкі. Толькі каля ног ляжалі два тоўстыя сувоі, якія аказаліся накідкамі з кавалкаў аўчыны.

На адным з астравоў цяпер ужо знакамітага тарфяніка Борэ дацкія археолягі раскапалі вёску эпохі жалеза, у якой, ня выключана, маглі жыць «балотныя людзі». Гэта было традыцыйнае для ранняга жалезнага веку Ютландыі паселішча, у якім налічвалася каля 20 будынкаў. Розных памераў хаты, складзеныя з торфу і крытыя саломай ці верасам, разьмяшчаліся на абодвух баках адной вуліцы. Пабудовы мелі дзьве паловы. У адной зь іх жылі людзі, а ў другой утрымлівалася свойская жывёла.

Да шэрагу дзіўных палоньнікаў балота Борэ належыць яшчэ адна археалягічная знаходка – Гундэструпскі кацёл. Вялікую срэбную пасудзіну знайшлі тут больш за сто гадоў назад. Паводле меркаваньня некаторых спэцыялістаў, кацёл можа стаць адным з ключоў да разгадкі абставінаў сьмерці «балотных людзей».

### *Ахвяры багіні Нэртус?*

Гундэструбскі срэбны кацёл быў зроблены недзе ў паўднёва-ўсходняй Эўропе прыблізна 2000 гадоў назад. На тэрыторыю Ютландыі, як мяркуюць спэцыялісты ў жалезным веку, ён трапіў у якасьці ваеннага трафэю. У багне Борэ кацёл апынуўся прыблізна ў той самы час, калі прорва прыняла «балотных людзей», і гэтае храналягічнае супадзеньне не выпадковае. Аказалася, што кацёл мае ня толькі вялікую матэрыяльную, але й духоўную каштоўнасьць. Сьценкі пасудзіны ўпрыгожаныя шматлікімі міталягічнымі выявамі -- рэльефамі ў выглядзе рэлігійных шэсьцяў, сцэн ахвярапринашэньняў, зааморфных істотаў, багоў... Сярод апошніх скандынаўскія мітолягі знаходзяць тыя боствы, якія карысталіся папулярнасьцю ў Ютландыі ў часы жалезнага веку. Ці ня быў Гундэструпскі кацёл прынесены ў якасьці ахвяры багом? Якое боства было вартае такога каштоўнага прынашэньня?

У 1 стагодзьдзі вядомы рымскі гісторык Тацыт, апісваючы германскія плямёны, згадваў іх вярхоўную багіню – Маці-Зямлю ці, інакш, Нэртус. На запрэжанай быкамі калясьніцы Вялікая Нэртус выяжджала са сьвятога гаю, абуджаючы сьвет і прыносячы плоднасьць Зямлі. Калясьніцу і багіню, пісаў далей Тацыт, купалі ў вадзе возера, пра месцазнаходжаньне якога ніхто ня ведаў. Абмываньне зьдзяйсьнялі спэцыяльныя рабы і служкі, якіх потым тапілі ў возеры.

Вучоныя, зьвяртаючы ўвагу на гэтую частку твору Тацыта, мяркуюць пра верагоднасьць прынашэньня «балотных людзей» у якасьці ахвяраў багіні Нэртус. Праўда, ня ўсе знойдзеныя ў тарфяніках людзі – дар для Нэртус. Той жа Тацыт, пішучы пра звычаёвае права германцаў, распавядаў, як тыя каралі сьмерцю злачынцаў. У прыватнасьці здраднікаў і перабежчыкаў яны вешалі на дрэве, а баязьліўцаў кідалі ў багну.

Думка пра ахвярапрынашэнне «балотных людзей» Маці-Зямлі, тым ня менш, рацыянальная. На карысьць гэтага спэцыялісты прыводзяць цэлы шэраг аргумэнтаў. Адзначаецца, напрыклад, што большасьць знойдзеных трупаў мае сьляды гвалтоўнай сьмерці. Звычайна ахвяраў душылі ці забівалі нажом, а ўжо потым хавалі ў балоце. Магчыма, такія ды некаторыя іншыя

спосабы зьмярцьвеньня людзей былі часткаю вельмі важнага рытуалу ахвярапрынашэньня.

У зьвязку з гэтым варта нагадаць, што ў страўніках «балотных людзей» захаваліся рэшткі спэцыяльнай расьліннай ежы, спажываньне якой незадоўга да сьмерці было, мусіць, складовым этапам абраду.

З вывучэньня вонкавага выгляду некаторых ахвяраў вынікае яшчэ адна цікавая акалічнасьць. Многія памерлыя мелі надзвычай добра дагледжанае цела. На іхных руках ня бачна сьлядоў цяжкай фізычнай працы. Далоні без мазалёў. Пазногці падрэзаныя. Перад зьмяшчэньнем у багну чалавека звычайна галілі і распраналі. Спадарожнікамі Нэртус маглі стаць неабыякія людзі.

Акрамя ўсяго іншага, прынашэньне часам суправаджалася спэцыяльным прыгатаваньнем ахвярнага месца, якое ўсьцілалася коўдрамі, бяростаю. Дарамі для Маці-Зямлі маглі быць ня толькі людзі, але й рэчы. Згадайма каштоўны Гундэструпскі срэбны кацёл. У якасьці падарункаў выступалі таксама бранзалеты, каралі, якія зрэдку знаходзяць у тых жа тарфяніках. Людзі эпохі жалеза шанавалі пэўныя мясцы зямлі і вады, надаючы ім вельмі важнае значэньне ў паяднаньні з Нэртус.

* * *

Цяжка казаць пра тое, зь якімі пачуцьцямі «балотныя людзі» ішлі да Вялікай Багіні Маці-Зямлі. Мусіць, яны шчыра верылі ў яе дабрадзейную моц, а таму ўвесь рытуал прынашэньня сябе ў ахвяру лічылі за шчасьце. Дрыгва прыняла іх, зрабіўшы неверагоднае: амаль 2 тысячы гадоў захоўвала іх целы для нашчадкаў.

## *ЖЫВАЯ АРХЕАЛЁГІЯ*

*Пры вывучэньні старажытнасьці, асабліва дапісьмовых пэрыядаў гісторыі, непазьбежна ўзьнікае жаданьне праверыць тыя ці іншыя меркаваньні й гіпотэзы. Безумоўна, мінулае нельга перанесьці ў сучаснасьць, але сытуацыю, якая мадэлюе старажытнасьць, можна стварыць штучна, г.зн. правесьці археалягічны экспэрымэнт. Экспэрымэнтатарства ў археалёгіі мае даўнюю гісторыю, але толькі ў апошнія дзесяцігодзьдзі яно ператварылася ў сапраўдны навуковы накірунак. На сваім адмысловым шляху дасьледаваньня старажытнасьці археолягамі-экспэрымэнтатарамі зроблены надзвычай цікавыя адкрыцьці.*

Бадай самыя выніковыя экспэрымэнты апошніх дзесяцігодзьдзяў належаць вучонаму з Санкт-Пецярбургу Сяргею Сямёнаву. Вывучаючы прылады працы каменнага веку, ён ня мог не прыгадаць сваю кірку, зь якой пачынаў працаваць на чыгунцы. На кірцы ад працы з пэўнымі пародамі і матэрыламі заставаліся адпаведныя сьляды. "І я падумаў, -- успамінаў пазьней Сямёнаў, -- ці ня глянуць гэткім чынам і на старажытныя каменныя прылады, на сьляды, што засталіся на іх? Аказалася, што на большасьці каменных, касьцяных і мэталёвых прыладаў ёсьць драпіны рознай шырыні й глыбіні, зломы, месцы, адпаліраваныя да бліску. Некаторыя сьляды ўдавалася адрозьніць няўзброеным вокам, іншыя -- толькі пад мікраскопам". Сямёнаву карцела адказаць на пытаньне: якому віду працы адпавядалі тыя ці іншыя сьляды. Выкарыстоўваючы старажытную тэхналёгію, дасьледчык пачаў рыхтаваць каменныя і касьцяныя вырабы, даводзячы іх да пэўнага падабенства з прататыпамі. На працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў Сямёнавым праводзіліся тысячы экспэрымэнтаў па выкарыстаньні вырабаў з дакладнай фіксацыяй сьлядоў, якія застаюцца на інструмэнце ад розных відаў працы. Унікальная клясыфікацыя такіх сьлядоў дазволіла археолягам вызначаць функцыянальнае прызначэньне знойдзеных на паселішчах каменнага веку вырабаў з косьці, крэменя.

Археолягамі-экспэрымэнтатарамі -- дасьледчыкамі каменнага веку, найбольшая ўвага надавалася каменным сякерам. Вытворчыя іх якасьці правяраліся многімі спэцыялістамі. Данскія экспэрымэнтатары давялі, што крамянёвымі сякерамі можна высекчы цэлы дубовы лес. Выкарыстаўшы чатыры каменныя сьвідраваныя сякеры, якія адносіліся да 4 тыс. да н.э., чэскія археолягі сьсеклі больш за 100 дрэваў. "Падчас экспэрымэнту, -- успамінаў Яраслаў Маліна, -- па меры таго, як мы набіраліся вопыту, мы ўжо былі ў стане сьсекчы вялікую хвою з дыямэтрам камля 130 мм (маецца на ўвазе адзін дрывасек) усяго за 45 сэкундаў, а стоміліметровы дуб -- за 40

сэкунд. Час, які затрачваўся на такую апэрацыю, зразумела, узрастаў з павялічэньнем дыямэтру камля і цьвёрдасьці драўніны. Хвоя з дыямэтрам камля 400 мм супраціўлялася нам 21 хвілінаў. Ну а як рэагавала каменная сякера? А ніяк! Адной зь сякер мы сьсеклі 170 дрэваў, і на яе вастрыі была заўважная -- акрамя рабочых сьлядоў – адна зьмена: большая завостранасьць яго рэжучага канту!"

Экспэрымэнты з каменнымі вырабамі, узнаўленьне тэхналёгіяў апрацоўкі камяню й вызначэньне магчымасьцяў дагістарычных інструмэнтаў становяцца мэтаю дасьледаваньня многіх спэцыялістаў у розных краінах сьвету. У некаторых унівэрсытэтах зьявіліся нават спэцыяльныя практычныя сэмінары па вывучэньні спосабаў апрацоўкі крэменя.

Адна зь дзіўных старонак каменнага веку – старажытная мэдыцына. Археолягаў ужо не зьдзіўляюць адкрыцьці пахаваньняў таго часу са сьлядамі трэпанацыі чэрапа. У многіх выпадках такая апэрацыя, якая і сёньня лічыцца адной з самых складаных для хірургаў, канчалася для пацыентаў пасьпяхова, бо рана зажывала, чалавек працягваў жыць.

Незвычайная апэрацыя інструмэнтамі каменнага веку была праведзена ў ЗША. Андрыен Ханус -- археоляг з Агастэн-коледжа (Сіу-Фоліс), трапіў у шпіталь з дыягназам "прабадзеньне тоўстай кішкі". Ханус намовіў дактароў правесьці апэрацыю з дапамогаю абсыдыянавых інструмэнтаў эпохі каменя. Дапамагчы свайму сябру згадзіўся Эрэт Калахан -- адзін зь найвядомейшых амэрыканскіх экспэрымэнтатараў, які працаваў у музэі гораду Лінчбэрга. Прама ў шпіталі Калахан зрабіў доўгія і тонкія абсыдыянавыя нажы, якімі 6 траўня 1983 году была пасьпяхова праведзеная апэрацыя. "Абсыдыянавыя інструмэнты, -- дзяліўся сваімі ўражаньнямі хірург, -- у шмат разоў вастрэйшыя за нашыя хірургічныя скальпэлі са спэцыяльнай сталі. Мяркую, што абсыдыянавыя лёзы калі-небудзь стануць неад'емнай часткаю інструмэнтара пры правядзеньні некаторых тонкіх апэрацый. Магчыма, іх будуць выкарыстоўваць пры апэрацыях на вочы ці пластычных апэрацыях, інакш кажучы, там, дзе патрэбная вострая рэжучая частка. Бо вастрыё каменнага скальпэля мае таўшчыню ўсяго ў дзесяць малекулярных пластоў, яно вастрэйшае за стальное ў некалькі разоў".

Хірург у сваіх прагнозах не памыліўся. Не прайшло і году, як у Вашынгтоне была створаная фірма, якая занялася вытворчасьцю скальпэляў з абсыдыяну.

У якасьці прыкладу надзейнасьці і трываласьці старажытных прыстасаваньняў варта прывесьці назіраньні брытанскага экспэрымэнтатара Тымаці Севярына, які ў 1977 годзе паўтарыў плаваньне легендарнага абата Брэндана. Абат з 17 манахамі ў VI стагодзьдзі на скураной лодцы з Ірляндыі праз Ісляндыю трапіў на востраў Ньюфаўндленд. На дакладнай копіі лодкі старажытных ірляндцаў у чэрвені 1977 году, затраціўшы больш за тры месяцы

на пераадоленьне 4700 км у ільдах, завірухах і туманах, Тымаці Севярын пасьпяхова закончыў экспэрымэнтальнае падарожжа. Пра іншыя вартыя ўвагі вынікі плаваньня Яраслаў Маліна пісаў наступным чынам: "Чым далей плыла экспэдыцыя Севярына, тым больш відавочным станавілася тое, што сучасныя інструмэнты і матэрыялы наўрад ці могуць спаборнічаць з копіямі сярэднявечных. Мяшкі і ўпакоўкі з плястычных матэрыялаў лопаліся і прапускалі ваду, мэталёвыя інструмэнты і дэталі, нягледзячы на кансэрвацыю, іржавелі і ламаліся. Іх замянялі дрэвам, скураю і ільняным палатном. Абалонка ж корпусу лодкі таўшчынёю 6 мм ад сутыкненьня з марской вадой паступова мацнела, сьцягвалася і не прапускала ні кроплі вады".

Намагаючыся ўдасканаліць арганізацыю і эфэктыўнасьць дасьледчай працы, археолягі-экспэрымэнтатары некаторых краінаў стварылі свае навукова-дасьледчыя цэнтры. У большасьці выпадкаў дзеля гэтай мэты былі ўзнаўленыя старажытныя паселішчы, жыцьцё й побыт на якіх максымальна набліжанае да прататыпаў.

## БАТСЕР-ХІЛ

Вядомы ангельскі археоляг Пэтэр Рэйнальдс у 1972 годзе на высокім пагорку Батсэр, што каля Портсмуту (Англія), заснаваў экспэрымэнтальнае земляробчае паселішча жалезнага веку. Паводле задумы Рэйнальдса, вёска мела быць абсалютна ідэнтычнай пасёлкам старажытных кельтаў.

У ваколіцах Батсэра і сапраўды каля 2300 год таму жылі кельты. У эпоху жалеза яны расьсяліліся на вялікай частцы Эўропы. Сьветлавалосыя вусачы, высакарослыя і храбрыя воіны, якія зачэсвалі свае хвалістыя валасы назад, былі адначасова бязьмежна гасьціннымі і шчодрымі людзьмі. Рымляне іх называлі галамі. У І ст. да н. э. гальскія плямёны пасьля працяглай вайны былі заваяваныя рымскім імпэратарам Юліем Цэзарам, а пазьней канчаткова асыміляваныя іншымі народамі. Вольналюбівыя ірляндцы лічаць кельтаў сваімі продкамі.

Навукова-дасьледчы археалягічны цэнтар пад адкрытым небам у Батсэр-Хіле заняў тэрыторыю ўзвышша, а таксама суседні лес і палеткі на плошчы 12 га. Батсэр-Хіл – мясцовасьць маладаступная для цікаўных людзей. Жыхары вёскі -- вучоныя-экспэрымэнтатары на чале з Пэтэрсам Рэйнальдсам імкнуцца максымальна наблізіць сваё жыцьцё да побыту людзей канца І тыс. да н.э.

У 1973 г. экспэрымэнтатары збудавалі тут дзьве круглыя хаты -- дакладныя копіі кельцкіх жытлаў, рэшткі якіх не адзін раз знаходзілі археолягі на тэрыторыі Вялікабрытаніі. Адну хату дыямэтрам 4 м было вырашана зрабіць цалкам з дрэва. Паводле рэканструкцый Рэйнальдса, спачатку пракапалі кругавы ровік, у які ўбілі двухмятровыя калы. Іх перавязалі зьверху вербалозьлем і скуранымі раменьчыкамі, каб потым умацаваць канструкцыю

страхі з жэрдак. Сьцены пераплялі дубцамі і абмазалі глінаю. Сабранаю на экспэрымэнтальных палях саломаю накрылі страху. Паводле іншых старажытных аналёгій дом будавалі з каменнымі сьценамі. Дымэтар хаты дасягаў 9 м. Толькі на страху экспэрымэнтары патрацілі каля 5 тон саломы. Спэцыялістам такое будаўніцтва дазоліла сцьвердзіць, што кельты маглі змайстраваць сваё жытло усяго за 2-3 дні, а аднаму чалавеку на гэта спатрэбілася б каля 175 працоўных гадзін.

Пабудаваная вёска абгароджаная плотам, за якім прасьціраюцца земляробчыя дзялянкі і паша. Экспэрымэнтатары праводзяць тут сэлекцыю прымітыўных відаў хатніх жывёл і расьлін, імкнучыся максымальна наблізіць іх да рэальных прататыпаў дагістарычных часоў. Напрыклад, паводле касьцевых матэрыялаў, атрыманых пры раскопках, археолягі ведалі, як выглядала авечка ў кельцкія часы. Па будове шкілета яна нагадвала зьдзічэлую авечку soay, якая і дагэтуль жыве каля Шатляндыі на далёкіх астравах Сьвятой Кільды. У soay мала мяса. У старажытнасьці іх маглі гадаваць пераважна для атрыманьня воўны і малака. Авечак soay разводзяць цяпер і ў Батсэр-Хіле, праўда, для яе прыручэньня даследчыкам прыйшлося папрацаваць не адзін год.

Жыхары Батсэр-Хіла запрагаюць у павозку і аруць глебу эскмурскімі поні, якія ў найбольшай ступені нагадваюць коней жалезнага веку. Экспэрымэнтатары нават паспрабавалі атрымаць сьвіньню, якая магла б атаясамляцца з адпаведным старажытным відам. Для гэтага злучылі эўрапейскага дзіка і тэйліворцкую сьвіньню, якая лічыцца самай старажытнай пародай у Англіі.

У Батсэр-Хіле сеюць, зьбіраюць і апрацоўваюць ураджай так, як гэта некалі рабілі кельты. Пэтэр Рэйнальдс пасьля шматгадовых экспэрымэнтаў адзначаў, што зерне, якое яны вырошчвалі і зьбіралі старажытнымі спосабамі, зьмяшчае значна болей, чым сучаснае зерне, пратэіну, кальцыя, фосфару, калія і іншых неабходных чалавечаму арганізму элемэнтаў.

Атрыманыя прадукты Рэйнальдс і ягоныя сябры выкарыстоўвалі для экспэрымэнтаў па прыгатаваньні ежы, якой маглі харчавацца старажытныя людзі. Праведзеныя дасьледаваньні дазваляюць істотна дапоўніць археалягічныя і этнаграфічныя зьвесткі. Напрыклад, спэцыялісты прыйшлі да высновы, што старажытныя земляробы мелі вельмі багаты і карысны для чалавека рацыён прадуктаў харчаваньня. А ежа, прыгатаваная старажытнымі спосабамі і з адпаведных прадуктаў, вельмі часта захоўвае пратэіну ў 2 разы болей, чым цяпер.

Аднаго разу Пэтэр Рэйнальдс нават паспрабаваў, карыстаючыся архаічнымі рэцэптамі, зварыць піва. Даўно вядома, што ўжо старажытныя шумеры ў III тыс. да н. э. варылі 8 відаў ячменнага, 8 відаў пшанічнага, 3 віды зьмешанага

гатункаў такога напою.

У Батсэр-Хіле археолягі ткуць тканіны на старажытных вэртыкальных варштатах. Воўну атрымліваюць бяз стрыжкі, шляхам вычэсваньня поўсьці ад тых жа soay. Гаршкі лепяць без ганчарнага круга. Экспэрымэнтатарам нават удалося ўзнавіць працэс лепкі вялікіх, вышынёю амаль у 1 м, пасудзін для захаваньня здабытых прыпасаў. Археолягі Батсэр-Хіла цалкам паўтарылі ўвесь цыкль працы ганчара ў старажытнасьці: ад загатоўкі гліны, яе захаваньня, да лепкі і ўпрыгожваньня посуду, абпалу яе ў спэцыяльных горнах...

## ЛЕЙРЭ

Гістарычна-археалягічны цэнтар у Лейрэ (Данія) быў створаны ў 1960-х гадах дацкім археолягам Хансам-Оле-Хансенам. Задуме Хансена папярэднічала падрыхтоўка і здымкі незвычайнай перадачы дацкай тэлевізіі. Ён і яшчэ тры студэнты факультэта археЛёгіі браліся на вачах тэлэгледачоў збудаваць дом эпохі жалеза, дакладна паўтараючы археалягічна вядомыя ўзоры. Паводле сцэнара ў фінальнай перадачы дом спальвалі.

Праз 2 гады амаль 90 чалавек адгукнуліся на просьбу Хансена паўдзельнічаць у незвычайным экспэрымэнце -- пабудаваць у Лейрэ, што ў даліне Гертхадален пад Капэнгагенам, дагістарыную вёску. Аснову паселішча ў хуткім часе склалі шэсьць будынкаў, дзе спэцыялісты заняліся экспэрымэнтальнай дасьледчай працай. Побач зьявіліся "дагістарычныя" палі, лугі, на якіх пасьвіліся статкі старажытных хатніх жывёл.

Жылыя і гаспадарчыя пабудовы Лейрэ -- копіі будынкаў V ст. да н.э. -- V ст.н.э., сьляды якіх знаходзілі дацкія археолягі пад час раскопак. Аснову сьценаў у дамах складалі вэртыкальна ўкопаныя слупы, якія перапляталіся вярбовым гольлем. Паверхня сьцен пакрывалася сумесьсю глею, пяску, гною і вады. На будаўніцтва аднаго доўгага дома, які археолягі ўзнавілі ў Лейрэ, старажытныя людзі эпохі жалеза маглі траціць сама меней год. Зімою нарыхтоўвалася драўніна, абчэсваліся бярвеньні і жэрдкі, на замерзлым возеры рэзаўся чарот для страхі. Летам узводзіўся дом. Спачатку ўкопваліся слупы. З дапамогай скручаных вяровак, скураных пасоў майстраваўся каркас хаты, які абмазвалі глеем і накрывалі чаротам...

Што застаецца ад хаты эпохі жалеза пасьля пажару? Дацкія археолягі наўмысна спалілі адзін з экспэрымэнтальных будынкаў жалезнага веку. Спэцыялісты вельмі часта пры раскопках знаходзяць рэшткі пажарышчаў. Цяпер яны мелі магчымасьць удасканаліць практыку "чытаньня" сьлядоў спаленьня. Напрыклад, экспэрымэнт дазволіў сьцьвердзіць, што пры пажары посуд можа зьмяняць колер у залежнасьці ад таго, якая страха ўпала на яго.

Ад полымя саламянай страхі посуд чырванее, а ад пакрытай дзірванам, травою -- чарнее. Заўважаецца, што дубовыя слупы прагараюць не так глыбока, як, напрыклад, ясеневыя.

У Лейрэ ежу гатуюць старажытнымі спосабамі. Мяса, напрыклад, на гарачых камянях. Перад прыгатаваньнем яго соляць і закручваюць у шырокія лісты.

Жыхары Лейрэ носяць адзеньне, якое робіцца паводле старажытных узораў. У Скандынавіі, як нідзе ў іншых месцах Эўропы, дзякуючы кансэрвуючым якасьцям дубовых калодаў, у якіх хавалі людзей, добра захаваліся рэшткі адзеньня эпох бронзы, жалеза, сярэднявечча. Археолягі рэканструявалі абутак, спадніцы, плашчы, шапкі, паясы і нават сеткі для ўкладкі жаночых валасоў.

Жанчыны ў Лейрэ ткуць сабе тканіну на старажытных прыстасаваньнях, фарбуюць адзеньне расьліннымі фарбамі, носяць скураны абутак, які шнуруецца раменьчыкамі і ўцяпляецца знутры сенам, воўнаю. Спадніцу робяць, як і ў старажытнасьці, з адзінага кавалка тканіны. Жанчыны нацягваюць спадніцу праз галаву, зашпільваюць затым яе на плячах і сьцягваюць на поясе. Жыхаркі Лейрэ сьцьвярджаюць з уласнага досьведу, што такое адзеньне надзвычай зручнае, надзейнае і практычнае.

У вёсцы нават узноўлена месца для ахвярапрынашэньняў: на калах вецер матляе конскія скуры, пагрозьліва глядзяць пустымі вачніцамі конскія чарапы.

У Лейрэ археолягі супольна з Заалягічным інстытутам вывелі адваротным скрыжаваньнем тыя пароды хатніх жывёл, якія людзі разводзілі ў тутэйшых мясьцінах каля 2 тыс. год таму. Сьвіньні, як і ў старажытнасьці, большую частку свайго жыцьця кормяцца, жывучы ў лесе пад Лейрэ. Для сельскагаспадарчых экспэрымэнтаў, у прыватнасьці, для апрацоўкі глебы, спэцыялісты вывелі валоў, якія па сваіх фізычных якасьцях набліжаюцца да старажытных прататыпаў. Валоў шэсьць тыдняў прыручалі хадзіць у ярме. Пазьней яны цягалі дубовае рала -- дакладную копію прыстасаваньня для ворыва ў 300-х гадах да н. э. Менавіта дацкім археолягам належыць прыярытэт у экспэрымэнтах па старажытных спосабах апрацоўкі глебы. У тутэйшых балотах адшукана мноства прыстасаваньняў старажытных земляробаў.

Пазьней у Лейрэ, акрамя ўласна вёскі жалезнага веку, узьніклі адміністрацыйныя, вучэбныя будынкі. Лейрэ стала ня толькі цэнтрам навукова-дасьледчай працы, а і "службаю для школ", "службаю для грамадзкасьці". У 1970 г. археолягі запрасілі ў Лейрэ некалькі дацкіх сем'яў, якія захацелі пажыць у дагістарычнай вёсцы. Ім так спадабалася імітаваць старажытнае жыцьцё, што некаторыя згадзіліся застацца ў хатах жалезнага

веку на зіму.

Ад таго часу ў Лейрэ прыяжджае вучыцца шмат дзяцей. Школьнікі пад кіраўніцтвам інструктараў працуюць у майстэрнях, вучацца старажытнаму ткацтву, лепяць і абпальваюць посуд, куюць жалеза, працуюць на палях, даглядаюць хатніх жывёл. Адны жывуць у Лейрэ працяглы час, іншыя прыяжджаюць на экскурсіі. Адначасова спэцыялістамі ладзяцца курсы для студэнтаў, настаўнікаў, адкрываюцца выставы.

## ДЗЮПЭЛЬ, АВЭРТАН-ДАЎН...

Нямецкія экспэрымэнтатары ўзнавілі жыцьцё сярэднявечнай вёскі XII-XIII стагодзьдзяў у Дзюпэлі (Нямеччына). Вёска-музэй у Дзюпэлі была заснаваная энтузіястамі пад кіраўніцтвам Андрыяна фон Мюлера. Яго праект пачаў актыўна рэалізоўвацца пасьля, здавалася б, алягічнага звароту: "Заплаціце, і вы атрымаеце права працаваць у нас задарма". Экспэрымэнтатарам зь Дзюпэля спрыялі супрацоўнікі Лейрэ, якія дапамаглі пабудаваць першы сярэднявечны дом. Насельнікі Дзюпэля з задавальненьнем апранаюцца ў адзеньне вясковых жыхароў XII-XIII стагодзьдзяў. У вёсцы, адраджаючы сярэднявечнае жыцьцё, ткуць тканіну, робяць драўлянае пабытовае начыньне, гадуюць авечак і вырошчваюць хлеб...

У графстве Уілтшыр у Авэртан-Даўне (Велікабрытанія) ангельскія археолягі праводзяць незвычайны экспэрымэнт па працэсу разбурэньня культурных напластаваньняў. Дзеля гэтага была збудаваная копія старажытнага вала і рова. У вал і каля яго археолягі наўмысна зьмясьцілі скураныя і драўляныя рэчы, крэмень, посуд, косткі і г.д., каб пазьней, раскопваючы, даведацца, як яны якасна зьмяняюцца пад узьдзеяньнем ветра, вады, зьмяшчэньня пластоў. Вал раскопваецца і будзе раскопвацца далей праз пэўныя інтэрвалы часу: 2, 4, 8, 16, 32, 62, 128 гадоў.

Нэалітычную вёску ў Алерсьлеве (Данія) археолягі збудавалі яшчэ ў 1958 годзе. Тут экспэрымэнтатарамі зроблена шмат назіраньняў пад час працяглага пражываньня ў рэканструяваных будынках.

Каля дацкага гораду Орхуса на плошчы каля 100 га археолягі ўзнаўляюць цэлыя комплексы пабудоваў старажытнай і сярэднявечнай Даніі, у тым ліку пасёлак вікінгаў.

Побач з рэканструяванымі будынкамі, валам, брамаю і сьценамі гарадзішча I тыс. да н.э., пасярод возера ў польскім Біскупіне можна пабачыць вынікі экспэрымэнтатарскай дасьледчай працы мясцовых археолягаў. Экспэрымэнтатарства ў Біскупіне мае даўнія традыцыі.

Яшчэ ў 1930-х, калі вяліся раскопкі гарадзішча, тут пачалі праводзіць экспэрымэнты па апрацоўцы драўніны, костак, адліўцы бронзавых вырабаў. У

Біскупіне, імітуючы старажытныя заняткі, seклі дрэвы, пяклі і варылі ежу. Як вядома, Біскупінскае гарадзішча загінула пад час аднаго з варожых нашэсьцяў у часы жалезнага веку. У 1939 годзе напад на паселішча сымітавала група ўдзельнікаў экспэрымэнта, выкарыстоўваючы адпаведныя копіі зброі і прыстасаваньняў.

У Біскупіне становіцца надзвычай ажыўлена і людна ў час спэцыяльных фэстываляў. Пры іх правядзеньні адбываюцца шматлікія экспэрымэнтальныя акцыі з удзелам жадаючых. У 1996 г. на адной з пляцовак я бачыў тоўстае дрэва, якое спэцыяльна прывезьлі ў Біскупін для правядзеньня экспэрымэнта. У адзін з чарговых фэстываляў плянавалася выдзяўбаць зь яго човен.

***

У Беларусі пакуль няма экспэрымэнтальнай археалёгіі. Адзіны экспэрымэнт, які праводзіўся да таго ж археолягамі з Санкт-Пецярбургу, адбыўся пры раскопках знакамітых краснасельскіх шахтаў пад Ваўкавыскам. Сутнасьць яго заключалася ў вызначэньні спосабаў і затрачанага часу на выкопваньне шахты людзьмі эпохаў каменя і бронзы. Цэлая галіна сучаснай археалягічнай навукі застаецца ў нас нязьведанай, а таму кожны, хто адважыцца ёй займацца, будзе варты пашаны айчыннага першапачынальніка.

Пранікненьне ў старажытнасьць праз яе "ажыўленьне" мае ня толькі вялікае навукова-дасьледчае значэньне. Колькасьць экспэрымэнтальных паселішчаў, якія імітуюць старажытнасьць, хутка расьце. Для многіх людзей жыцьцё ў вёсцы жалезнага веку становіцца ня толькі адкрыцьцём дагісторыі, але відавочным актам пазнаньня сучаснай цывілізацыі. Паступова прыходзіць перакананьне ў тым, што сучасны эўрапеец няўмольна аддаляецца ад свайго першаснага асяродзьдзя: прыроды і рэальных чалавечых адносін у грамадзтве. Магчыма, праз асяродкі старажытнасьці многімі людзьмі будзе зроблены першы крок да разуменьня чалавечай існасьці: мы павінны жыць у гармоніі з прыродай і іншымі людзьмі свайго грамадзтва.

## *ЧАЛАВЕК У КАПАЛЬНІ*

*Рэканструяваны твар мужчыны меў даволі прыемныя рысы. А яшчэ колькі часу таму гэта быў археалягічны матэрыял – чалавечы шкілет з пахаваньня. Вось толькі месца, у якім выпадкова коўш экскаватара зачарпнуў косьці, мела выгляд не магілы, а глыбокай капальні... Капальняў было шмат. Не дзясяткі і нават ня сотні, а тысячы шахтаў на працягу 3 і 2 тысячагодзьдзяў да н.э. у пошуках высокаякаснага крэменю распрацавалі старажытныя жыхары Панямоньня ў ваколіцах сёньняшніх Карпаўцаў і пасёлку Краснасельскі, што пад Ваўкавыскам...*

У тое лета 1962 году экскаватарнік, які капаў крэйду ў кар'еры, мо й не зьвярнуў бы ўвагу на косьці, якія трапіліся ў коўш ягонай машыны, каб не адна акалічнасьць. Ужо два гады запар крэйдавыя распрацоўкі, якія рупліва асвойваліся мясцовым заводам будаўнічых матэрыялаў, наведвалі археолягі з Санкт-Пецярбургу. Яны шукалі старажытныя шахты, пра што не адзін раз распавядалі рабочым. У разьвернутай экскаватарам крэйдзе, якая шматмятровымі пластамі залягае ў гэтых мясцінах, акрамя чалавечых костак знайшлі гліняны гаршчок. Пасудзіна выглядала надзвычай архаічна: лепленая ад рукі, закураная ўнізе, з высокай гарлавінаю і ўпрыгожаная наразною "ялінкаю" пад верхнім краем. У крэйдавым друзе ляжала таксама вялікая касьцяная іголка з прарэзаным на месцы вастрыя вушкам.

Міхась Чарняўскі, тады яшчэ асьпірант Інстытуту гісторыі, разам з групай супрацоўнікаў будучага рэспубліканскага музэю апынуўся на месцы здарэньня пазьней, калі ў Акадэмію навук дайшло паведамленьне з Ваўкавыску. Са слоў рабочых, сьведкаў падзеі, пакрысе ўдалося ўзнавіць некаторыя акалічнасьці выяўленьня чалавечага шкілету, гаршка дый іголкі.

Касьцяк ляжаў паўсагнуты на правым баку, арыентаваны галавою на поўдзень. Каля ног стаяла пасудзіна, а недзе побач ляжала іголка. Поза памерлага ды рэчы, відаць, некалі наўмысна пакінутыя каля яго, сьведчылі пра зьдзейсьнены тут старажытны абрад пахаваньня. Разьмяшчэньне нябожчыка ў скурчаным стане ды суправаджэньне яго адпаведным гліняным гаршком – характэрныя адзнакі пахаваньняў позьненэалітычнага часу і эпохі бронзы. Адмысловая форма пасудзіны, яе арнамэнтацыя дазвалялі адносіць магілу да культур з шнуравой керамікай і датаваць часам канца 3-пачатку 2 тыс. да н.э.

Дарэчы, гаршчок той к прыезду Міхася Чарняўскага апынуўся ў мясцовага краязнаўцы і калекцыянэра. Унікальную знаходку археолягу прыйшлося выменьваць на калекцыю экзатычных паштовых марак.

Самая цікавая акалічнасьць, якая вымушала да шматлікіх разважаньняў,

тычылася таго, чаму пахаваньне было зьдзейсьненае ў шахце. Памерлы ляжаў на дне невялікага пашырэньня капальні, якая разам з пахаваным у ёй нябожчыкам яшчэ ў старажытнасьці была засыпаная крэйдавым друзам. Гэта была адна з тысяч крэмнездабыўных шахтаў, якія ў часе нэаліту і бронзавага веку распрацоўваліся жыхарамі тутэйшых мясьцін. Менавіта пра капальні пад Ваўкавыскам у 1976 г. вядомая санкт-пецярбурская дасьледчыца Ніна Гурына напіша ў сваёй манаграфіі: "Беларускія шахты, узятыя ў сукупнасьці з аналягічнымі замежнымі помнікамі, выходзяць далёка за рамкі вузкай, лякальнай значнасьці; яны служаць важнаю крыніцаю для раскрыцьця працэсу гістарычна-культурнага разьвіцьця ўсяго чалавецтва".

### Вялікае адкрыцьцё Зыгмунда Шміта

Калі ў 1925 годзе трыццацігадовы археоляг Зыгмунд Шміт пачаў абсьледаваць навакольле вёскі Краснае Сяло, што на рацэ Рось пад Ваўкавыскам, у эўрапейскай археалягічнай літаратуры ўжо згадваліся ўнікальныя капальні крэменю пад Сісбуры, Граймз-Грэйвз у Англіі, Мюр-дэ-Барэ і Шампіньёль у Францыі. Уласна ў Польшчы ў 1922 г. Я.Самсановічам пры складаньні геалягічнай карты былі адкрытыя цяпер, бадай, найлепш вывучаныя і сусьветна вядомыя шахты па здабычы крэменю ў Кшэмёнках Апатоўскіх. У тым жа 1922 годзе Зыгмунд Шміт і С.Крукоўскі пачалі дасьледаваць Кшэмёнкі.

Маючы добры досьвед, Зыгмунд Шміт пасьля раскопак каля вёскі Краснае Сяло ў 1925 годзе канстатаваў адкрыцьцё вялікай колькасьці старажытных крэмнездабыўных шахт. Зьвесткі пра незвычайныя пустоты-выпрацоўкі каля Краснага Сяла маглі яшчэ раней трапіць да Зыгмунда Шміта ад геолягаў, якія працавалі на мясцовых адорвеньнях крэйды.

На наступны год археоляг заўзята працягваў пошук капальняў. Вынікам ягоных дасьледаваньняў стала адкрыцьцё каля тысячы шахтавых выпрацовак крэменю, а таксама майстэрняў па апрацоўцы здабытай сыравіны. У ягоныя рукі трапілі шматлікія інструмэнты, з дапамогаю якіх старажытныя шахцёры здабывалі крэмень у глыбокіх шахтах.

Аднак ад самага пачатку іх адкрыцьця краснасельскім капальням не шанцавала. У 1929 годзе на 34-м годзе жыцьця памёр Зыгмунд Шміт. Капальні, на месцы якіх няўмольна пашыраліся кар'еры па здабычы крэйды, раз-пораз наведвалі археолягі. І калі краснасельскія шахты мэтадычна бурыліся далакопамі, і да іх нікому не было справы, у Кшэмёнках Апатоўскіх згаданы мною С. Крукоўскі паволі з году ў год выкупляў зямлю, каб выратаваць мясцовы ўнікальны шахтны комплекс для навуковых дасьледаваньняў.

Тым часам з красносельскіх шахтаў у Варшаўскі музэй паступалі сабраныя калекцыі знаходак ці нават унікальныя фотаздымкі. Пазьней каштоўны фотаматэрыял загінуў. Падчас вайны страцілася таксама амаль уся дакумэнтацыя -- малюнкі, пляны, накіды, якімі суправаджалі свае раскопкі на Росі археолягі 20-30 гадоў. А матэрыяламі раскопак з Краснага Сяла закладваліся ваконныя праёмы ў часы баёў за Варшаву. Ніна Гурына, якая ў 1961 годзе знаёмілася з красносельскімі калекцыямі ў Варшаўскім археалягічным музэі, знаходзіла ў скрынках разам з крамянёвымі прыладамі пустыя гільзы ад патронаў.

Шахтам не шчасьціла і ў пасьляваенны час. Мясцовы цэмэнтавы завод працягваў капаць крэйду. Перашкодзіць разбурэньню ўнікальнага комплекса ніхто не спрабаваў, а калі б адважыўся, то ці здолеў бы.

Ашаломленая маштабамі разбурэньня і адначасова захопленая ўражвальнай дэманстрацыяй тагачаснай савецкай кар'ернай тэхнікі, Ніна Гурына пазьней напіша: "Сымбалічна -- на гэтым маленькім кавалачку зямлі як бы сутыкнуліся гарнякі дзьвюх эпохаў, разьдзеленыя некалькімі тысячагодзьдзямі, -- першыя ў гісторыі чалавецтва шахтары, узброеныя толькі найпрасьцейшымі рагавымі інструмэнтамі, якія затрачвалі вялікую працу і час для таго, каб выкапаць вузкі, усяго толькі ў некалькі мэтраў глыбінёй калодзеж, і сучасныя гарнякі, узброеныя магутнымі машынамі, якія драбілі за некалькі хвілін велічэзныя масы пароды".

Ніне Гурынай і яе калегам-археолягам з Санкт-Пецярбургу, дасьледуючы старажытныя шахты на яшчэ не занятых тэхнікай пустках, прыходзілася ўсё часьцей сачыць за адкрытымі выпрацоўкамі, калі пласты крэйды з дапамогай экскаватараў рушыліся вэртыкальна на поўную шырыню кар'еру. Тады можна было на глыбіню да 15 мэтраў убачыць разрэз крэйдавай пароды. "...Перад намі на крэйдавай сьцяне, як на гіганцкім палатне шырынёю каля 100 м, адкрылася карціна, якая не магла не ўсхваляваць ня толькі любога археоляга, але і кожнага, хто хоць бы ў слабой ступені цікавіцца старажытнай гісторыяй чалавецтва. Як толькі вока, крыху звыкнуўшыся зь бельлю, набыло здольнасьць улаўліваць розьніцу паміж чыстаю крэйдаю сьцяны і крыху больш цямнейшым, іншым па структуры крэйдавым друзам, пачалі зьяўляцца адна за другой плямы розных абрысаў. Выразна выступілі прамыя вэртыкальныя ці выцягнутай формы, апушчаныя з паверхні калодзежы шахт, па якіх некалькі тысячагодзьдзяў таму спускаўся чалавек усьлед ланцужкам крамянёвых канкрэцый, невялікія плямы акруглых абрысаў, часам пустыя, перарэзаныя кар'ерамі падземныя калідоры -- штрэкі, нарэшце, больш шырокія плямы, якія абазначалі камэры".

## Капальні

Жыхары Краснага Сяла і суседніх вёсак яшчэ зь міжваеннага часу, капаючы крэйду для гаспадарчых патрэбаў, ведалі, што ў крэйдавых адорвеньнях трапляюцца ямы, запоўненыя больш мякчэйшым друзам. Эмпірычна яны, мусіць, адчувалі вартасьць зробленых імі назіраньняў. Былі і тыя, хто памятаў раскопкі археолягаў 20-30 гадоў. Людзі нават спрабавалі паказаць месца колішніх выкопаў паваенным дасьледчыкам. Ды дзе там! Ваколіцы, з пашырэньнем тутэйшым заводам кар'ернай працы, моцна зьмяніліся, месцамі ператвараючыся ў "блакітныя азёры".

Актыўнае навуковае дасьледаваньне шахт пачалося ў 1960-я гады. Вучоным, для таго, аб узнавіць закінутыя і выпрацаваныя ў старажытнасьці шахты, найчасьцей прыходзілася на нейкі час станавіцца шахцёрамі. Заглыбляючыся ў колішнія выпрацоўкі і перабіраючы крэйдавы друз, археолягі апыналіся ў цёмных і сырых падбоях, штрэках і камэрах, дзе чалавек ледзьве мог зьмясьціцца лежачы ў выпрацоўках. На некалі мяккіх, як сырая гліна, крэйдавых сьценах захоўваліся сьляды капаньня старажытнымі шахцёрскімі інструмэнтамі, бачыліся прыгладжаныя вопраткаю ды закураныя лучынаю сутарэньні...

Крэмень -- асноўны і самы надзейны матэрыял, якім людзі карысталіся з глыбокай старажытнасьці на працягу многіх тысяч гадоў. Як мы ня можам уявіць сабе нашае жыцьцё бяз мэтаду, так і чалавек эпохі каменя і пачатку бронзавага веку ня здолеў бы і дня пражыць без вырабаў з крэменю. Крамянёвую сыравіну можна было лёгка і амаль паўсюдна знайсьці на размытай паверхні зямлі. Але самым пластычным і падатнейшым пры апрацоўцы быў крэмень, які залягаў на глыбіні ў крэйдавых пластах.

Асабліва вялікая патрэба ў шахтавым крэмені зьявілася ў канцы каменнага веку -- нэаліце і пазьней, у эпоху бронзы, калі людзі імкнуліся інтэнсыўна асвойваць лясныя прасторы, займаючыся вырошчваньнем акультураных расьлін і разьвядзеньнем хатніх жывёл. Крамянёвыя сякеры вялікіх памераў, цёслы, сярпы становяцца абавязковымі атрыбутамі тагачаснага жыцьця.

У нэаліце старажытныя жыхары Эўропы пачнаюць актыўную шахтавую распрацоўку крамянёвых радовішчаў. На думку Міхася Чарняўскага, першыя шахты на Росі, верагодна, заклалі ў другой палове 3 тыс. да н.э. находнікі зь Сярэдняй Эўропы -- насельніцтва культуры шарападобных амфар. Пра гэта сьведчаць ня толькі сьляды іх паселішчаў, але і рэшткі могільніка, які летам 1971 г. быў выпадкова адкрыты мясцовым краязнаўцам М. У. Верацілам недалёка ад краснасельскіх капальняў. У пахаваньнях, дасьледаваных Міхасём Чарняўскім, акрамя парэштак спаленага нябожчыка зьмяшчалася шмат костак ахвярных жывёл, у тым ліку быкоў. У грудной клетцы аднаго з

быкоў археолягамі адшуканыя 2 касьцяныя наканечнікі стрэл, якімі, мусіць, і была забітая жывёліна.

Пазьней, у самым канцы 3-першай палове 2 тыс. да н.э., здабычаю крэменя на Росі магло займацца насельніцтва мясцовай культуры з шнуравой керамікай. Раскопкі і актыўныя пошукавыя дасьледаваньні на прылеглых пясчаных пагорках дазволілі выявіць сьляды іх паселішчаў. У адной з шахтаў знойдзенае нават пахаваньне, пакінутае шнуравікамі, пра якое я ўжо згадваў вышэй.

Крэмень капалі тут і пазьней, у эпоху бронзы, верагодна, на працягу ўсяго 2 тыс. да н.э. ва ўсялякім разе, большасьць радыёвугляродных дат, атрыманых па арганічных рэштках зь некаторых шахт, прыходзіцца на 1640-1240 г.г. да н.э....

Каля вёскі Карпаўцы і пасёлка Краснасельскі крэмень, у выглядзе доўгіх ланцужкоў асобных канкрэцый – фігурных утварэньняў, залягае на рознай глыбіні ў падземных радовішчах крэйды. Яе тоўшча перакрытая зьверху пясчана-жвіровым покрывам. Старажытным шахцёрам, каб натрапіць на крамянёвую "жылу", неабходна было пракопваць жвір, а затым заглыбляцца ў крэйду.

Мяккая крэйда добра капалася. Але ў той жа час сьценкі выпрацаванай шахты пад узьдзеяньнем сонца, вады і ветра давалі трэшчыны, сыпаліся, размываліся, што пагражала абвалам. Таму глыбіня вэртыкальных калодзежаў вельмі рэдка была большая за 3-5 м, а дыямэтар -- 1,5-1,6 м. Натрапіўшы на ланцужок крамянёвых канкрэцый, людзі пашыралі шахту ў бок прасьціраньня так неабходнага ім каменя, ці інакш рабілі нішу-падбой, вышыня якога рэдка перавышала 1,5 м. Такіх падбояў магло рабіцца ў шахтавым калодзежы некалькі і на рознай вышыні. Бакавыя адгалінаваньні ад вэртыкальнай шахты маглі ператварацца ў вузкія, дыямэтрам каля 60 см, падземныя калідоры -- штрэкі, якія цягнуліся 1-2 і болей мэтраў. Штрэкі зьвязвалі ў некаторых выпадках некалькі шахтавых выпрацовак, ператвараючыся ў вялікі разгалінаваны комплекс пад зямлёю.

Але старажытныя шахцёры, разумеючы небясьпечнасьць занадта доўгіх штрэкаў ды глыбокіх падбояў, імкнуліся закладваць побачз выпрацаванаю капальняю яшчэ адзін шыхтавы калодзеж, працягваючы, такім чынам, выбіраць ужо знойдзеныя ланцугі крэменю. Дзеля той жа бясьпекі зрэдку людзьмі пакідаліся слупы некранутай крэйды, якія ўтрымлівалі верхнія пласты пароды, не даючы ёй абваліцца.

На тых эўрапейскіх капальнях, дзе крэмень залягаў у больш цьвярдзейшых пародах, напрыклад, у вапняках, як гэта было ў Кшэмёнках Апатоўскіх, выпрацоўкі дасягалі значна большых памераў. Шахтавыя калодзежы тут капаліся на глыбіню да 4-10 м. Падземныя галерэі маглі разыходзіцца ад

вэртыкальнага ствала да 13-15 м, часам утвараючы вакол яго выпрацоўкі плошчай ў 400 кв.м. Аднак у кшэмёнкаўскіх шахцёраў пры гэтым узнікалі праблемы з вэнтыляцыяю, што вымушала іх прабіваць дадатковыя адтуліны ў сьценках падземных калідораў.

Шахцёры краснасельскіх шахт, ня маючы магчымасьці павярнуцца ў вузкім калідоры штрэка галавою да выхада, звычайна выбіраліся адтуль паўзком і задам. Пустую пароду адграбалі, засыпаючы ёю ўжо выпрацаваныя пустоты, ці паднімалі наверх і скідвалі ў старыя шахты. Археолягі, шукаючы вусьці шахтаў, лёгка вылучалі іх па круглай форме і крэйдаваму друзу, якім засыпалі ўжо непатрэбныя выпрацоўкі.

Асьцярожна выбіраючы пустую пароду з шахтаў, спэцыялісты маглі бачыць на сьценках сьляды працы шахцёрскімі інструмэнтамі. Месцамі адбіткі былі такімі выразнымі, што перадавалі нават зазубрыны спрацаваных рагавых кайлаў. Гэта значыць, што пустыя выпрацоўкі адразу ж запаўняліся друзам; вецер, сонца і вада не пасьпявалі зьнішчыць сьляды іх інтэнсыўнай працы.

Пры дасьледаваньні краснасельскіх шахтаў у наш час было праведзена некалькі экспэрымэнтаў. Адзін зь іх тычыўся падліку колькасьці затрачанай працы на распрацоўку шахты. У 1964 г. з крэменю, здабытага пад Красным Сялом, археолягі падрыхтавалі нажы і сякеры, з дапамогаю якіх, паводле старажытнай тэхналёгіі, змайстравалі рагавыя кайлы, аналягічныя тым, якія траплялiся пры раскопках шахты. Яе капаў дзяцюк пры дакладнай фіксацыі часу і прыёмаў працы. Для распрацоўкі капальні глыбінёю 1,5 м і дыямэтрам 1,2 м затрачана 8 гадзін 15 хвілін, а падбоя даўжынёю 0,78 м -- 1 гадзіна 47 хвілін.

Яшчэ ў 19 ст. экспэрымэнтальныя работы па выкопваньню шахт на месцы знакамітага комплекса пад Сісбуры праводзіў ангельскі археоляг Л. Фокс. Працуючы па чарзе са сваім напарнікам інструмэнтамі старажытных шахцёраў, ён адзначыў, што падземную галерэю працягам 7,1 м можна выкапаць за 12 гадзін бесьперапыннай працы.

Экспэрымэнты сьведчаць пра надзвычай вялікія фізычныя затраты, неабходныя для распрацоўкі капальняў, што ў першую чаргу залежала ад нізкай эфэктыўнасьці тагачасных гарняцкіх інструмэнтаў. У краснасельскіх шахатах крэйду капалі кіркамі-кайламі, а канкрэцыі выкорпвалі тычковымі капачамі. Іх рабілі з адросткаў і рагулістай вяршыні рагоў аленя. У якасьці рыдлёвак для адграбаньня пустой пароды служылі абрэзаныя лапаткі лася.

У шахтах захаваліся сьляды драўляных памостаў для крэменю, зь якіх яго потым паднімалі ўверх. Старажытныя людзі вылазілі з шахтаў па апушчанаму ствалу дрэва, зь якога папярэдне абсеквалі гальлё. Знойдзеныя ў выпрацоўках касьцяныя іголкі ды праколкі наводзяць на думку аб неабходнасьці частага рамонту скураных мяшкоў, у якіх паднімалі ўверх здабыты ў шахтах крэмень.

З паглыбленьнем шахтавага калодзежа і распрацоўкі падбояў, штрэкаў пад зямлёю станавілася цёмна. Шахты часта асьвятляліся лучынаю, сьляды ўжываньня якой захаваліся на сьценках і столі выкопаў, дзе можна было ўбачыць закуранасьць, чорныя пісягі ды дзіркі, зь якіх некалі тырчалі палаючыя трэскі. Для асьвятленьня і праветрываньня шахтаў маглі рабіцца спэцыяльныя адтуліны. Сыстэма такіх асьвятляльных і вэнтыляцыйных дзірак адзначаецца польскімі дасьледчыкамі на шахтах Кшэмёнкаў Апатоўскіх.

Краснасельскі комплекс уключае ў сябе ня толькі шахты па здабычы крэменю. У ягоны склад уваходзілі шматлікія майстэрні па першаснай апрацоўцы здабытай сыравіны.

## Майстэрні

Выкапаныя ў крэйдзе крамянёвыя канкрэцыі ўжо ў самой шахце сартыраваліся на патрэбныя і непатрэбныя. Адабраны крэмень паднімаўся наверх, дзе яго апрацоўвалі. Здаралася аднак, што зь ім пачыналі працаваць ужо ў самой шахце, каб той не пасьпеў згубіць свае плястычныя якасьці. Заадно -- ня трэба было цягнуць наверх лішні цяжар.

На месцы майстэрняў археолягі знаходзяць вялікую колькасьць расшчэпленага крэменю, інструмэнты для яго апрацоўкі, выбракаваныя ды выкінутыя нарыхтоўкі. Майстры маглі ўладкоўвацца ў паглыбленьнях старых засыпаных выпрацовак ці на месцы часовых пасёлкаў. Майстэрні-паселішчы знойдзеныя на пясчаных пагорках уздоўж Росі.

Пасёлкі-майстэрні існавалі на працягу працы шахцёрскай экспэдыцыі. Капаць шахты мела сэнс толькі ў сухія летнія месяцы, што і абумоўлівала сэзоннасьць паселішчаў, у якіх жылі нарыхтоўшчыкі крэменю. Краснасельскія майстэрні спэцыялізаваліся на вырабе заатовак сякер. Каб атрымаць паўфабрыкаты высокаякасных сякер, неабходна было выбраць патрэбнай формы канкрэцыю і зьдзейсьніць цэлы шэраг пасьлядоўных апэрацый. Тэхналёгія апрацоўкі крэменю, удасканаленая за многія тысячы гадоў, мела адпаведныя культурныя адзнакі і адлюстроўвала пэўныя этнаграфічныя рысы. Таму ёй у археалягічнай літаратуры надаецца надзвычай шмат увагі.

Здаралася, на месцы краснасельскіх майстэрняў пасьля надзвычай карпатлівых і скурпулёзных пошукаў сярод многіх тысяч адшэпаў беларускім археолягам удавалася нават знайсьці адляцеўшыя сколы і скласьці зь іх канкрэцыі ў тым выглядзе, у якім яны трапілі ў рукі старажытнага майстра.

Нарыхтоўка такой вялікай колькасьці паўфабрыкатаў сякер дазваляла мясцоваму старажытнаму насельніцтву пастаўляць іх на абмен у суседнія раёны, дзе не было такой сыравіны. Ацэньваючы маштабы

распаўсюджваньня крэменя з Кшэмёнак Апатоўскіх, польскія археолягі пішуць, што вырабы зь яго можна знайсьці ў радыюсе 400-500 км.

## Рэканструкцыя чалавека з шахты

Выпадковае адкрыцьцё чалавечага шкілета ў 1962 г. у адной з краснасельскіх шахт -- не адзіная знаходка такога кшталту. Людзкія косьці, паводле паведамленьня рабочых кар'ера, сустракаліся тут не адзін раз. Але ў тых выпадках спэцыялістам не прыйшлося іх пабачыць. Таму застаецца толькі здагадвацца, ці былі гэтыя парэшткі яшчэ некалькімі разбуранымі пахаваньнямі ў шахтах, ці знаходжаньне іх – сьведчаньне няшчасных выпадкаў, якія маглі здарацца ў старажытнасьці.

Вядома, напрыклад, што ахвярамі абвалаў ў крэмнездабыўных капальнях сталі старажытныя людзі, рэшткі якіх знайшлі на дне дванаццацімэтровай шахты ў Сьпіене (Бэльгія), а таксама ў шахтах Стрэпі (Францыя) і Обурга (Бэльгія). Пад Маўэрам у Аўстрыі пад пластом друзу ў ніжняй палове адной з крэмнездабыўных шахт археолягі адкрылі два людзкіх пахаваньні, каля якіх у старажытнасьці былі пакладзеныя тушы казы і аленя.

Шкілет чалавека, які быў пахаваны ў краснасельскай шахце, дасьледаваўся беларускімі антраполягамі. Паводле іх заключэньня гэта быў мужчына 30-40 гадоў даволі аскетычнага выгляду. Выкарыстоўваючы добра распрацаваную М.М.Герасімавым і ягонымі вучнямі мэтодыку ўзнаўленьня аблічча старажытных людзей, антраполягі з Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёра зьдзейсьнілі плястычную рэканструкцыю галавы памерлага (гл. фотаздымак). Узнавіць аблічча чалавека можна па рэльефу ягонага чэрапа. Існуе пэўная сувязь паміж руктурай мяккіх тканак твару і ягонай якаснаю паверхняю. Паводле ацэнкі спэцыялістаў асноўныя парамэтры чэрапа краснасельскага чалавека набліжаюцца да антрапалягічнага тыпу тагачаснага насельніцтва Правабярэжнай Украіны і маюць пры гэтым цэлы шэраг адметнасьцяў.

***

Мяркуецца, што толькі каля Краснага Сяла ў старажытнасьці было выкапана ня менш за 3000 шахт. Але многія з крэйдавых радовішчаў так і засталіся неабсьледаванымі археолягамі, бо былі зьнішчаныя кар'ернымі распрацоўкамі. На некаторых крэйдавых радовішчах, якія захоўваюцца некранутымі, маюцца рэальныя пэрспэктывы для адкрыцьця яшчэ многіх сотняў старажытных капальняў. Нягледзячы на калясальныя разбурэньні, шахты на Росі паводле ацэнкі спэцыялістаў -- адзін з буйнейшых цэнтраў

масавай крэмнездабычы ў Эўропе. Комплекс па-ранейшаму мае пэрспэктывы для мэтанакіраванага дасьледаваньня на ўзроўні самых найноўшых мэтодык.

У 1969 годзе ў раёне Краснага Сяла было вырашана стварыць дзяржаўны запаведнік. А адну з пляцовак -- месца найбольшай канцэнтрацыі шахт -- археолягі пакінулі нечапанаю, мяркуючы, што некалі тут будзе музэй.

Тым часам у суседняй Польшчы музэй на месцы крэмнездабыўнага комплекса пад Кшэмёнкамі Апатоўскімі, як і рэканструяванае гарадзішча Біскупін, сталі месцамі сапраўднага паломніцтва турыстаў з усёй Эўропы.

KAMUNIKAT.org

## ПАДЗЕМНАЕ ВОЙСКА ІМПЭРАТАРА

*Шыхты тысячаў гліняных воінаў, сотні гліняных коней, калясьніцы і вазьніцы больш 2 тыс. гадоў назад занялі сваю ганаровую варту перад грабніцаю «Сына Неба» – знакамітага кітайскага імпэратара Шы-Хуана – заснавальніка дынастыі Цынь. Гліняныя фігуры людзей глядзяцца настолькі рэалістычна і індывідуальна, што сярод іх нельга ўбачыць аднолькавых твараў…*

«Шы-Хуан, упершыню прыйшоўшы да ўлады, пачаў прабіваць гару Лішань і ўладкоўваць у ёй склеп; аб'яднаўшы Паднябесную, ён паслаў туды з усяе Паднябеснае блізу 700 тысячаў злачынцаў. Яны заглыбіліся да трэціх вод, залілі сьцены бронзаю і спусьцілі ўніз саркафаг. Склеп напоўнілі перавезенымі і апушчанымі туды копіямі палацаў і незвычайнымі каштоўнасьцямі. Майстрам замовілі зрабіць лукі-самастрэлы, каб, пастаўленыя там, яны стралялі па тых, хто паспрабуе пракапаць ход і пранікнуць ува ўсыпальніцу…»

Гэтае паведамленьне некалі ў адным з сваіх трактатаў пакінуў кітайскі гісторык Сім Цянь, згадваючы прыгатаваньне пахавальнага склепішча для імпэратара Цынь Шы-Хуана. «Сын Неба» -- заснавальнік цынскай імпэрыі правіцель Шы-Хуан (246-210 г. да н.э.) – адна з найбольш вядомых асобаў у раньняй кітайскай гісторыі. Яго нездарма яшчэ называлі «Будаўніком Сьцяны», -- пры ім сьцены асобных кітайскіх дзяржаваў былі злучаныя ў адну Вялікую Сьцяну. Скрозь па ўсёй краіне пачалося будаўніцтва ірыгацыйных каналаў і паштовых трактаў. Мільёны людзей працавалі над гэтымі калясальнымі праектамі. За часы свайго ўладараньня імпэратар стандартызаваў кітайскае пісьмо, сыстэму мер, упарадкаваў грашовае абарачэньне і каляндар.

Месца пахаваньня Цынь Шы-Хуана, пра якое згадваў Сім Цянь, і сёньня можна пабачыць у правінцыі Шэньсі недалёка ад гораду Сіаня, што на паўночным захадзе Кітая. Усыпальніца імпэратара знаходзіцца ў нетрах насыпной гары вышынёй 75 м і даўжынёю ў пэрымэтры 2,5 км. Дагэтуль грабніца застаецца нераскапаная археолягамі. Спэцыялісты спадзяюцца, што яе ніхто не рабаваў. Калі ж верыць кітайскім трактатам, усыпальніца Шы-Хуана па колькасьці затрачанай на яе будаўніцтва працы намнога пераўзыходзіць адзін з цудаў сьвету – піраміду фараона Хеопса. Нагадаю, што піраміду ў Эгіпце ўзводзіла 100 000 будаўнікоў на працягу 30 гадоў. Раскопкі пахаваньня Шы-Хуана могуць стацца адной з найвялікшых падзеяў у гісторыі сучаснай археалёгіі.

Першая таямніца грабніцы Шы-Хуана нечакана і неспадзявана адкрылася ў 1974 годзе…

### *Глінянае войска*

Сакавіцкім днём 1974 году, на мясцовасьці, якая ляжыць больш за 1 км на ўсход ад кургану Шы-Хуана, сяляне капалі студню. Калі яны наблізіліся да пяцімэтровай глыбіні, зямля нечакана праваліласяа, адкрываючы вачам велізарнае падземнае сховішча. Археолагі, якія ў хуткім часе апынуліся на месцы здарэньня, зьдзівіліся ня менш за сялян. Пад абрынутымі перакрыцьцямі гіганцкага склепішча можна было разгледзець бясконцыя шэрагі глінянага войска ў поўным ўзбраеньні…

Як высьветлілася пазьней, у падзямельлях цягнецца адзінаццаць тунэляў, у якіх стаіць каля 7 тысячаў гліняных воінаў, зробленых у натуральную велічыню. Яны трымаюць сапраўдную зброю, каля іх стаяць гліняныя коні і драўляныя калясьніцы. Падлога, на якой разьмешчана войска, пакрыта 250 000 абпаленымі цаглінамі. Агульная плошча лёхаў – каля 25 388 кв. мэтраў. Пры яго будаўніцтве прыйшлося выкапаць каля 100 000 кубічных мэтраў зямлі. Сховішчы перакрываліся спэцыяльнай стольлю з гіганцкіх хвояў і кіпарысаў. На гэта было затрачана каля 8 000 кубічных мэтраў драўніны. У тыя часы праца па будаўніцтве такіх лёхаў магла цягнуцца каля 10 гадоў.

Ува ўсім комплексе вылучаюцца тры адначасовыя падземныя сховішчы, якія адрозьніваюцца па сваім зьмесьце. У першым, дзе цяпер адкрыты музэй, знаходзіцца найбольшая колькасьць фігур. Перакрыцьці яго былі разбураныя ў старажытнасьці агнём. Многія скульптуры ў выніку гэтага моцна пацярпелі. Другое сховішча -- меншае ў памерах, зьмяшчае больш разнастайную падборку фігур. Праўда, столь і гэтага збудаваньня пацярпела некалі ад агню. Мяркуецца, што тут стаяла каля 1300 гліняных мадэляў коней і людзей, 8 драўляных калясьніц. Трэцяе падзямельле было адкрыта кітайскімі археолягамі ў 1976 годзе. Даўжыня яго – 21,4 м, шырыня – 17,6 м , глыбіня – больш за 5 м. У ім разьмяшчалася 68 гліняных ваяроў з 4 коньмі і баявою калясьніцаю. Паводле меркаваньня спэцыялістаў, перакрыцьці гэтага сховішча, ня вытрымаўшы цяжару зямлі ўрэшце абрынуліся самі па сабе. Трэцяе падзямельле вылучаецца тым, што тут стаяць скульптуры, якія імітуюць камандны склад войска і пэрсанальную гвардыю. Гвардзікі паказаныя ў сярэднім на 12,7 см вышэйшымі за іншых ваяроў, хаця і іншыя досыць высокія.

Пажар, у выніку якога абвалілася драўляная столь, на думку многіх спэцыялістаў, мог здарыцца недзе праз тры гады пасьля сьмерці Шы-Хуана падчас паўстаньня салдат. Тады ж дынастыя Цынь была зьліквідаваная.

Глінянае войска пашыхтаванае ў баявым парадку па трое. Наперадзе – камандзіры. Авангард зьвернуты тварам на ўсход, а ар'ергард – на захад, як быццам сымбалізуючы бязьмежнасьць імпэратарскай улады на зямлі. Наперадзе стаяць лёгка ўзброеныя воіны з самастрэламі ці лукамі. За імі – шчыльныя шэрагі пяхотнікаў, баявыя калясьніцы, запрэжаныя чатырма коньмі. Пяхотнікі трымаюць алебарды, коп'і, зброю блізкага бою. Калі ў адных – звычайнае вайсковае адзеньне, то ў іншых – багатыя дасьпехі. Амаль усе вайскоўцы паказаныя дужымі і высокімі мужчынамі. Камандзіры вылучаюцца ня толькі адмысловаю ўніформаю, але і ростам, сваёю паставаю.

Фігуры зробленыя зь мясцовай гліны і абпаленыя пры тэмпэратуры 800 С. Вышыня іх – 178-187 см. Антраполягі пішуць, што гэта значна вышэй за сярэдні рост сучасных кітайцаў. Адначасова яны пагаджаюцца з тым, што рэпрэзэнтаваныя мадэлі, паводле сваіх атрапалагічных характарыстык, адпавядаюць сёньняшняму карэннаму насельніцтву Кітая. Пры аглядзе скульптур многія спэцыялісты прыходзяць да высновы, што яны паказваюць рослых і дужых людзей розных узростаў.

Усе аўтары аднадушна пагаджаюцца з тым, што гэта надзвычай высокамастацкія творы. Кожная фігура мае індывідуальныя рысы. Існуе нават меркаваньне, што ўзорамі для выяваў паслужылі сапраўдныя гвардзейцы імпэратара. «Адзін салдат, магчыма, вэтэран, азмрочыўся і шчыльна сьціснуў вусны, у другога зьдзіўлена ўздымаюцца бровы і зіхацяць вочы – мусіць, неспрактыкаваны навабранец, у трэцяга – закручастыя вусы і бадзёры погляд аптыміста, якога не турбуюць думкі пра сьмерць на пабаявішчы. Ніхто зь іх не падобны адзін да аднаго», -- апісваў свае ўражаньні пасьля прагляду скульптур вядомы кітайскі археоляг і журналіст Гу Вэнджы.

Спэцыялісты, якіх цікавіла тагачасная мода, вылучылі ў гліняных гвардзейцаў 25 стыляў барады. Форма яе адпавядала ўзросту, характару, твару, пасадзе воінаў. Найчасьцей, як было прынята ў тыя часы, кітайскія жаўнеры зьбіралі валасы ў вузел на макаўцы, зрэдку прыкрываючы галовы пляскатымі з завязкамі шапкамі.

На фігурах і побач зь імі захаваліся сьляды фарбы. Скульптуры расфарбоўваліся ў чырвоны, ружовы, пурпуровы, сіні, зялёны, жоўты, аранжавы, чорны, шэры ды белы колеры. Фарба падбіралася ў адпаведнасці з рэальным колерам тых ці іншых дэталяў уніформы.

У складзе глінянага войска налічваецца больш за 600 коней. Усе яны зробленыя з гліны ў натуральную велічыню. У жывёл хвалістыя грывы, завязаныя вузлом хвасты. Коні пільна ўзіраюцца наперад, чакаючы каманды. Бачна, што частка іх прыстасаваная пад лёгкую кавалерыю, а іншыя запрэжаныя ў баявыя драўляныя калясьніцы. Апошніх налічваецца больш за

100. На кожнай калясьніцы – возьніца і два воіны зь дзідамі, мячамі альбо самастрэламі ў руках.

Увогуле зброі надзвычай шмат. Яе налічваецца больш за 10 000 адзінак. Спэцыялістаў уражвае вялікая колькасьць самастрэлаў, што дае падставы лічыць іх адным з асноўных відаў узбраеньня ў старажытным Кітаі. Бронзавыя наканечнікі стрэлаў ды мячы дагэтуль не згубілі свайго бліску і вастрыні.

На скульптурах можна ўбачыць таўро ці надпісы з прозьвішчамі 85 майстроў, якія ляпілі гліняных гварднікаў.

Дасьледчыкі выказваюць меркаваньне, што ўвасобленыя ў гліне воіны – копія палацавай варты ці гвардыі імпэратара Шы-Хуана. Чаму сымбалічная імпэратарская гвардыя была разьмешчаная на адлегласьці больш за кілямэтар ад усыпальніцы? Некаторыя вучоныя схільныя патлумачыць гэты факт неабходнасьцю перасьцярогі ад рабаўніцтва магілы.

Аднак трэба дадаць, што Шы-Хуан быў не адзіны імпэратар, які забраў з сабой на той сьвет гліняную гвардыю. Такі звычай быў распаўсюджаны сярод іншых правіцеляў і заможнай знаці Кітаю. Праўда такога размаху, які мог дазволіць сабе «Сын Неба», не дасягнуў ніхто.

### *Малыя варты*

Да адкрыцьця глінянага войска Цына Шы-Хуана ў 1960-ыя гады ў правінцыі Шэньсі былі знойдзеныя два масавыя пахаваньні керамічных скульптураў воінаў. На гары Шыцзышань, што побач з горадам Сюйчжоу, у канцы 1984 году археолягі адкрылі падземнае склепішча сярэдзіны 2 стагодзьдзя да н.э., у чатырох збудаваньнях якога стаяла 2300 гліняных фігурак воінаў і 4 кані. Праўда, скульптуры дасягалі памераў усяго толькі 45-55 см (прыблізна 1/3 натуральнай велічыні).

У 1990 годзе пры будаўніцтве дарогі, у паднёвым баку ад магілы імпэратара Лі Цы (188-144 г. да н.э.) і яго жонкі, было знойдзена яшчэ адно месцазнаходжаньне глінянай гвардыі. Пачаўшы тут раскопкі, кітайскія археолягі адкрылі вялікае сховішча паменшаных тэракотавых фігур 2 стагодзьдзя да н.э. Падзямельлі займалі плошчу амаль у 96 000 кв. м. Яны атаесамляюцца з 25 склепамі і вялікай колькасьцю тунэляў. Памеры іх не такія вялікія, як у пазьнейшых сховішчаў імпэратара Шы-Хуана, але яны займалі плошчу амаль у 5 разоў большую.

У падзямельлях стаялі скульптуркі жаўнераў вышынёю каля 50 см. Цікава, што ў іх руках не было зброі. Яна кудысьці зьнікла. Некаторыя дасьледчыкі выказваюць меркаваньне, што рукі рабіліся з дрэва, а таму да нашага часу не дайшлі – згнілі. Іншыя думаюць, што гліняныя рукі ляпілі асобна і

прымацоўвалі да скульптуры стрыжнямі з рэдкага мэталу. Праз пэўны час каштоўны мэтал разам з глінянымі рукамі быў скрадзены з магілаў.

Цела скульптурак фарбавалася ў чырвона-аранжавы, а валасы, вочы, бровы, бароды – у чорны колеры. На фігурках воінаў, як на ляльках, захаваліся рэшткі сатлелага адзеньня зь лёну і шоўку.

Кожная зь фігурак мае сваю адметнасьць і вылучаецца вытанчанымі рысамі твару ў залежнасьці ад узросту ды іншых асаблівасьцяў. Тут можна ўбачыць адлюстраваньне як суровасьці так і камічнасьці.

Акрамя людзкіх фігур, у падземных сховішчах разьмяшчаліся тэракотавыя коні. Усе яны, як і скульптуркі воінаў, былі зробленыя ў 1/3 натуральнай велічыні.

### *Музэй*

Раскопкі, якія пачаліся пасьля 1974 году на месцы гіганцкага падземнага сховішча глінянай гвардыі імпэратара Цынь Шы-Хуана, працягваюцца дагэтуль. Адначасова праводзіцца рэстаўрацыя скульптураў, зброі, ды іншых пахавальных рэчаў. На думку спэцыялістаў, раскопкі могуць доўжыцца яшчэ некалькі дзесяцігодзьдзяў. Калясальныя памеры падзямельля і тысячы гліняных фігур вымагаюць вялікіх фінансавых і фізычных выдаткаў, напружаньня дасьледчыкаў.

На месцы ўжо раскапаных склепішчаў і пасьля рэстаўрацыі пашкоджаных фігур адкрыты музэй. Гэта вялікі крыты павільён, плошча якога дасягала ў 1989 годзе блізу 60 000 кв. м. Плянуецца па меры пашырэньня археалягічных і рэстаўрацыйных працаў давесьці музэйную плошчу аж да 300 000 кв. м.

Сярод простых кітайцаў павільён атрымаў назву «бі ма юн», што азначае «музэй статуяў і коней». Ён карыстаецца вялікім і нязьменным посьпехам у турыстаў. Кітайскім уладам прыйшлося ў зьвязку з гэтым рэканструяваць пад Сіанем дарогі і нават за 19 км ад горада пабудаваць новы аэрапорт.

* * *

Цяжка сабе ўявіць, якая грандыёзная паводле сваіх выдаткаў, арганізацыі і фізычных высілкаў праца была зьдзейсьненая пры стварэньні глінянага падземнага войска. Рэалізаваць такі праект мог толькі «Сын Неба», які бязьмежна ўладарыў над шматмільённым насельніцтвам і ніколі не сумняваўся ў велічнасьці сваёй асобы і эстэтыцы імпэрскага гігантызму.

З другога боку, татальны ўціск і скрайняя напружанасьць часам можа акрэсьліць недасяжныя ў звычайных умовах вяршыні чалавечых магчымасьцяў. Падземнае войска імпэратара Цынь Шы-Хуана – уражвальнае

відовішча і адначасова сьведчаньне адпаведнай эпохі, якая сёньня сымбалізуецца ня толькі Вялікай Сьцяной у бязьмежных кітайскіх прасторах, але і шэрагамі гліняных воінаў пад Сіанем, якія навечна застылі каля свайго Ўладара.

KAMUNIKAT.org

## *ФЭНОМЭН «КРАІНЫ ГАРАДОЎ»*

*Адкрыцьцё расійскімі археолагамі ў канцы 1980-ых – 1990 -ых гадох на Паўднёвым Урале Аркаіма, Сінташты, Вусьця, Куйсака ды іншых «протагарадоў» XVIII-XVI стагодзьдзяў да н.э. сталася, паводле Н.Я.Мерперта, «навуковай падзеяй эпахальнага значэньня, якая прымушае перагледзець як агульныя ўяўленьні пра найстаражытнейшую гісторыю эўразійскага памежжа, так і цэлы шэраг канкрэтных яе аспэктаў…». Гарадамі-сымбалямі, якія нясуць у сабе нейкую недасягальную філязофію духу, лічаць іх некаторыя дасьледчыкі. «Протагарадская цывілізацыя Паўднёвага Ўралу», ці інакш «Краіна гарадоў», на думку многіх спэцыялістаў ёсьць для эпохі бронзы «супэркультурным фэномэнас», які нельга разглядаць у рамках традыцыйных крытэраў і паняцьцяў стэпавай археалёгіі…*

*Самым яркім і адначасова пакуль самым загадкавым помнікам «Краіны гарадоў» зьяўляецца Аркаім – «архетып старажытнага гораду індаэўрапейцаў і індаарыяў»…*

### *Аркаім*

На Аркаім варта найперш паглядзець з вышыні птушынага палёту. На стэпавай паверхні выразна праглядаюцца два колцы земляных валоў, якія амаль за чатыры тысячы гадоў моцна аплылі і зьмяніліся. Заўважаецца вонкавы абвадны роў ды цэнтральная круглая пляцоўка…

Вывучаючы матэрыялы дасьледаваньняў Аркаіму, цяжка паверыць, што у 1980-ых гадох унікальны помнік, паводле плянаў гаспадарчага асваеньня тутэйшых стэпаў, павінен быў загінуць пры будаўніцтве вялікага вадасховішча. Аднак Аркаіму пашчасьціла, і гэта быў адзіны выпадак у Расіі, калі ўдалося спыніць найбуйнейшае гідратэхнічнае будаўніцтва дзеля захаваньня археалягічнай спадчыны. Больш таго, удалося ня толькі ліквідаваць будоўлю, але й стварыць на базе археалягічнай службы Чалябінскага ўнівэрсытэта спачатку спэцыялізаванае прадпрыемства – Цэнтар «Аркаім», а пазьней -- музэй-запаведнік…

Аркаім быў адкрыты ў 1987 годзе. Ён па сваёй захаванасьці – адзін з самых унікальных культурных цэнтраў «Краіны гарадоў». Яго агульная плошча каля 20 тыс. кв. м. Амаль на 8 тыс. кв. м «протагорад» раскапаны і дасьледаваны археолягамі.

Валы, якія добра праглядаюцца зьверху, -- рэшткі абаронных сьцен. Яны будаваліся з дрэва і земляных сырцовых блёкаў. Такія ж матэрыялы выкарыстоўваліся для будаўніцтва жытлаў. Будынкі ўзводзіліся па кругу,

ўздоўж валоў унутры кожнага колца. З паветра плянаваньне паселішча нагадвае гіганцкае кола зь сьпіцамі.

Архітэктурная структура Аркаіму была абумоўленая кругавою забудоваю ўсёй фартэцыі. Будынкі разьмяшчаліся цеснымі шэрагамі па ўнутранаму пэрымэтру двух канцэнтрычных кругоў абаронных сцен. Пры гэтым сьцяна аднаго дому зьяўлялася сьцяною дому другога. На плянах будынкі мелі форму трапэцыі. Агульная плошча кожнага з дамоў складала каля 200 кв. м. Трэцюю частку плошчы такой пабудовы займалі гаспадарчыя аб'екты: студня, яма-лядоўня, камін, агнішча. Людзі жылі таксама і на страсе будынку, для гэтага там узводзіліся дадатковыя канструкцыі кшталту «другога паверху». Ува ўсім аркаімскім комплексе налічвалася 60 пабудоў, 35 зь якіх разьмяшчалася ўздоўж вонкавай, а 25 – уздоўж унутранай сьцяны.

Амаль у кожным доме дзейнічала свая мэталюргічная печка для выплаўкі вырабаў з бронзы.

Абаронныя сьцены Аркаіма, таўшчыня якіх дасягала 4,5 – 6 м, павінны былі надзейна бараніць яго жыхароў. Пад сьценамі цягнуліся глыбокія равы. Над гарадскімі брамамі ўзводзіліся вежы, а ўнутры шырокіх сьценаў пракладаліся пераходы і прарэзваліся спэцыяльныя нішы..

Аркаімцы карысталіся складанай сыстэмай дажджавой каналізацыі. Вадавод быў зроблены з драўляных трубаў, якія абмазваліся глінаю.

Нягледзячы на тое, што Аркаім меў замкнёнае плянаваньне, а будынкі шчыльна, сьцяна ў сьцяну, стаялі ўздоўж абаронных валоў, тым ня менш, дзякуючы ўнікальнай камунікацыі, кожны зь яго жыхароў мог вельмі хутка трапіць у любую кропку гарадзкой тэрыторыі. Гэта адбывалася дзякуючы існаваньню верхніх і ніжніх вуліц, а таксама ўваходных адтулін у стрэхах будынкаў. Перш чым увайсьці ў дзьверы дому, чалавек апынаўся ў крытым дворыку.

У цэнтры ўсяго пляніровачнага комплекса разьмяшчалася вольная ад усялякай забудовы круглая плошча. Яна, верагодна, прызначалася для правядзеньня рэлігійных абрадаў.

Наўкола Аркаіму, дзякуючы аэрафотаздымкам, археолягам удалося знайсьці сьляды старажытных палёў, плятынаў, каналаў, загонаў для свойскай жывёлы і нават месцы тагачасных дарог.

Вядома, што аркаімцы займаліся пераважна жывёлагадоўляю і значна менш увагі зьвярталі на земляробства. Адзначаецца іх вялікі досьвед у мэталюргіі бронзы і мэталаапрацоўцы. На месцы Аркаіму знойдзена вялікая колькасьць керамікі, вырабаў з каменя, костак і іншых матэрыялаў. На посудзе сустракаліся піктаграмы, у якіх некаторыя дасьледчыкі хочуць бачыць элемэнты пісьмовасьці.

Аднак Аркаім уражвае спэцыялістаў ня толькі сваім фэнамэнальна высокім узроўнем пляніровачнай структуры, найбагацейшай матэрыяльнай культурай, амаль гарадзкой арганізацыяй жыльлёвай і навакольнай прасторы. Як гэта ні парадаксальна, але адначасова Аркаім разглядаецца некаторымі дасьледчыкамі ў якасьці «протагораду»-храму, адмысловай «мадэлі Сусьвету»…

### *Аркаім – « мадэль Сусьвету»*

На думку аднаго з асноўных дасьледчыкаў Аркаіма Генадзя Б. Здановіча і яго прыхільнікаў адкрыты «протагорад» варта разглядаць ня толькі, і нават ня столькі як незвычайную для стэпавых супольнасьцяў сярэдняга пэрыяду бронзавага веку фартэцыю. Аркаім – унікальны культурны цэнтар, «протагорад»-храм і адмысловы астранамічны комплекс. Колцавае плянаваньне паселішча, як гэта ні дзіўна, не была наўпрост зьвязанае з патрэбамі абароны. Больш таго, паводле заключэньня спэцыялістаў, Аркаім не загінуў у выніку ваенных дзеяньняў. Мяркуючы па матэрыялах археалягічнага дасьледаваньня, «горад» згарэў у агні, які, найбольш верагодна, запалілі самі яго жыхары. Перад тым як зьнішчыць паселішча, піша Г.Б.Здановіч, у ім наўмысна наводзілі парадак. Пра гэта адназначна сьведчыць кампазыцыйная складанасьць планіграфіі знаходак, захаванасьць рэчаў, прысутнасьць вялікай колькасьці цэлага посуду і г.д. Другія археолягі, якія вывучалі іншыя культурныя цэнтры «Краіны гарадоў», таксама назіралі ў іх сьляды неаднаразовых пажараў і перабудоў. Пажары не суправаджаліся сьлядамі вайны: няма зброі, забітых людзей і г.д. Аналіз культурных адкладаньняў дазваляе меркаваць, што адразу пасьля пажару людзі сыходзілі з паселішча і яно знаходзілася пэўны час у занядбаньні.

Ці ня мог пажар быць вынікам рытуальнага спальваньня паселішча? -- задаюць сабе пытаньне вучоныя. Калі гэта так, то адказ на яго варта шукаць у вераваньнях «вогнепаклоньнікаў» --старажытных індаэўрапейцаў. Палыханьне агню, тлумачаць навукоўцы, павінна было імітаваць сусьветны пажар, які, паводле ўяўленьняў індаэўрапейцаў, здольны быў абнавіць сьвет: празь сьмерць да адраджэньня. Такі сэнс зьнішчэньня Аркаіму, як і пэрыядычнае спальваньне некаторых іншых культурных цэнтраў «Краіны гарадоў», бачыцца для некаторых дасьледчыкаў найбольш відавочным. Адным з ускосных пацьверджаньняў такой высновы можа быць шырока вядомая ў эпоху бронзы практыка спаленьня пахавальных збудаваньняў.

У аснове пляніровачнай структуры «протагораду» ляжыць геамэтрычная фігура – круг. Аналізуючы колцавае плянаваньне Аркаіма, вядомая расійская дасьледчыца В.Т. Кавалёва піша, што колца дамоў вакол цэнтру – мандала, сьвятарны круг, які, верагодна, зьяўляўся для аркаімцаў адмысловаю мадэльлю

Сусьвету. «Круг аддзяляе асвоеную абжытую прастору (Космас), -- працягвае яна далей, -- ад неасвоенай (Хаос). Такім чынам у архітэктуры адлюстроўваецца памкненьне ўпарадкаваць прастору. Кругавое плянаваньне дазваляе ўвасобіць ідэю гарманічнага ўзаемадзеяньня частак у цэлым. Каб сьвет упарадкаваць, яму ня толькі неабходна было надаць форму, але і гіерархізаваць. У залежнасьці ад руху Сонца бакі гарызонту якасна адрозьніваліся: Усход увасабляў нараджэньне, здароўе, жыцьцё, актыўны мужчынскі прынцып, а Захад атаесамляўся з пасыўным жаночым пачаткам, хваробаю, сьмерцю і г.д. Разьмяшчэньне дому ў кольцу забудовы вызначала многія важныя бакі грамадзкіх паводзін чальца грамады. Плянаваньне паселішча як бы аўтаматычна рэгулявала адносіны ўнутры калектыва. Паселішча ўяўлялася цэнтрам Сусьвету, а чалавеку адводзілася ў ёй актыўная роля: ён павінен быў рэгулярна падтрымліваць сусьветны парадак, пераўтвараючы Хаос у Космас».

### *Аркаім і авестыйскі міт пра «горад Йімы»*

Сэмантычнае атаесамленьне Аркаіма не абмяжоўваецца толькі паралелямі з старажытнаіндаэўрапейскімі ўяўленьнямі пра сусьветны парадак. Генадзь Здановіч і некаторыя іншыя яго расійскія аднадумцы бачаць у Аркаіме ўвасабленьне «архетыпу найстаражытнейшага гораду індаэўрапейцаў і індаарыяў», у прыватнасьці, «авестыйскай вары», якую будаваў першапродак і культурны герой індаіранскіх паданьняў Йіма.

Старажытныя індаіранскія плямёны называлі сябе «ар'я». Арыі – стваральнікі рэлігіі вогнепаклоньнікаў, пра што і гаворыцца ў «Авесьце» -- сьвятарнай кнізе, якую паводле паданьня пісаў прарок Заратуштра прыкладна паміж 1500-1200 гадамі да н.э. У «Авесьце» Йіма згадваецца як «цар залатога веку», які тройчы пашырае зямлю. У другой частцы міту пра Йіму дзеяньне пераносіцца на легендарную прарадзіму арыяў Арыянам-Вайджа, што ля ракі Вахві-Датыі. Менавіта тут Йіма будуе «вару» – прыстанішча для арыяў, дзе тыя маглі б захаваць сябе і сваю маёмасьць ад стыхійных бедзтваў (халодных зімаў, густых сьнегападаў і патопаў). «Сьвятарная вара», паводле некаторых вядомых іраністаў – круглаплянавае ўмацаваньне з канцэнтрычнымі колцамі сьцен.

З гэтай нагоды дасьледчыкі адзначаюць, што Аркаім мог быць адным зь зямных і рэальна існуючых прататыпаў «авестыйскай вары» зь яе прафаннаю прастораю ў цэнтры круга. «Протагорад» Аркаім, падсумоўваюць некаторыя навукоўцы – «архетып найстаражытнейшага гораду індаэўрапейцаў і індаарыяў».

### *У «Краіне гарадоў»*

За апошняе дзесяцігодзьдзе дзякуючы вывучэньню аэрафотаздымкаў і аэраархеалягічным разьведачным палётам, акрамя Аркаіма на тэрыторыі Паўднёвага Ўралу была адкрыта кампактная гістарычная тэрыторыя эпохі бронзы, якую ўмоўна сталі называць «Краінай гарадоў». Ужо вядома 19 умацаваных цэнтраў кшталту Аркаіму, якія існавалі параўнальна кароткі адрэзак часу з XVIII да XVI ст.ст. да н.э. Сярод іх: Сінташта, Вусьце, Куйсак ды інш. Яны займалі ўзвышаныя пляцоўкі тэрас на берагах рэк – прытокаў Урала і Табола. «Краіна гарадоў» працягнулася амаль на 400 км уздоўж усходніх стэпавых перадгор'яў Паўднёвага Ўралу.

Кожны з умацаваных цэнтраў разьмяшчаўся на адлегласьці 40-70 км адзін ад аднаго. «Протагораду» адпавядала пэўная асвоеная тэрыторыя – «зямельная акруга», сярэдні радыюс якой складаў 25-30 км. У межах акругі сустракалі сэзонныя стаянкі пастухоў, рыбаловаў, неўмацаваныя пасёлкі, медныя руднікі, цесна зьвязаныя з сваім цэнтрам -- умацаваным «протагорадам».

Побач з умацаваным паселішчам знаходзіліся найбагацейшыя курганныя і бескурганныя нэкропалі. Самы ўнікальны пахавальны комплекс быў знойдзены пад Сінташтою. Многія з спэцыялістаў лічаць яго адным з самых грандыёзных пахавальных храмавых збудаваньняў стэпавай Эўразіі. У ім былі пахаваныя прадстаўнікі самых розных групаў тагачаснага насельніцтва. Баявыя калясьніцы і коні разам з ваярамі зьмяшчаліся ў цэнтральных ямах могільніка. Побач з цэнтральнымі прэстыжнымі склепамі, наўкол па кругу знаходзіліся пахаваньні шараговых чальцоў грамады. Многія аспэкты пахавальных рытуалаў даюць падставу шукаць ім аналёгіі ў звычаях, якія апісваліся ў старажытнаіндаэўрапейскай-індаіранскай эпічнай літаратуры, у прыватнасьці ў «Рыгведзе» і «Авесьце».

Акрамя круглых сустракаюцца «протагарады» авальнай і прастакутнай, квадратнай пляніровачнай структуры. «Протагорад» Куйсак, які раскопваўся 1993-1994 гадох, з вышыні бачыцца ў выглядзе ромба. Паселішча забудаванае пакквартальна. Квартальныя зоны аддзеленыя адна ад адной лябірынтамі праходаў і арганізоўваюцца вакол цэнтру. «У выніку складваецца ўражаньне арганізаванага цыклічнага кругавога руху па сьпіралі і адчуваньне зьлітнасьці з прастораю, з космасам», -- пісалі пра Куйсак археолягі Т.С.Малюціна і Г.Б.Здановіч. «Гэта гарады-сымбалі, якія нясуць у сабе нейкую недасягальную філязофію духу», -- узрушана падсумоўвалі свае ўражаньні згаданыя аўтары.

Адзначаецца, што круглыя паселішчы будаваліся найчасьцей на раньнім этапе існаваньня «Краіны гарадоў». У позьні пэрыяд заўважаецца дэградацыя велічнай культуры і яе стылю. Роля абаронных збудаваньняў зьмяншаецца.

Зьнікае ранейшая манумэнтальнасьць сьцен, спрашчаецца планіграфія. Паціху пачынае зьнікаць кругавое плянаваньне паселішчаў. Сыстэма ўмацаваньняў набывае форму прастакутніка. Пры разьмяшчэньні жытлаў выкарыстоўваецца лінійны прынцып. Губляе ранейшае значэньне ідэя неабходнасьці абароны цэнтру «гораду». У квадратным паселішчы кожны асобны сэктар мае аднолькавыя магчымасьці для абароны. Верагодна, «протагорад» ужо ня здольны да канца выконваць сваю ранейшую ролю рэлігійнага і рытуальна-астранамічнага цэнтру. Дасьледчыкі адзначаюць, што ў межах умацаваных паселішчаў культурныя напластаваньні на сваім зьмесьце і магутнасьці ўсё часьцей нагадваюць гаспадарча-бытавыя адклады шараговых селішчаў.

На позьнім этапе спрашчаецца «рэчавы сьвет» «протагарадоў», зьбядняецца арнамэнтацыя керамікі, спрашчаюцца формы посуду. Менш урачыстымі становяцца пахавальныя звычаі.

Некаторыя навукоўцы мяркуюць, што ў гэты час адбываецца актыўны сыход насельніцтва з тэрыторыі «Краіны гарадоў». Масавая міграцыя людзей праходзіць на фоне істотных экалягічных зьменаў. Назіраецца паступовае заміраньне жыцця, а затым і поўны калапс протагарадзкой культуры ў Паўднёвым Заўральлі. Наканец наступае такі час, калі «Краіна гарадоў» спыняе сваё існаваньне.

Генадзь Здановіч, як і многія яго прыхільнікі, разглядаюць «Краіну гарадоў» у якасьці «протагарадзкой цывілізацыі Паўднёвага Ўралу», адмысловага «супэркультурнага фэномэну». Адзначаецца ярка рытуальны характар культуры «Краіны гарадоў». Верагодна, яе можна аднесьці, лічыць Здановіч, да шэрагу раньніх бесьпісьмовых цывілізацый, для якіх характэрна «сакралізацыя памяці і яе цесная сувязь з рытуалам». Паміж культурнымі цэнтрамі «краіны», як і паміж асобнымі людзьмі, існавала цесная сувязь, заўважае дасьледчык. Актыўныя ўнутраныя кантакты, канцэнтрацыя вялікай колькасьці людзей у межах кожнага «гораду» (насельніцтва асобнага «протагарадзкога цэнтру» магло складаць ад 2,5 да 4 тысяч чалавек) стваралі ўмовы для інфармацыйнага выбуху. У гэткіх абставінах, паводле Здановіча, а таксама пры зьліцьці культурных і этнагенэтычных патокаў, назіраўся незвычайны ўзьлёт міталягічнага мысьленьня і рытуальнай дзейнасьці, зараджаліся старажытныя эпічныя пласты «Рыгведы» і «Авесты».

Нараджэньне «супэркультурнага фэномэну» адбывалася пад узьдзеяньнем многіх іншых акалічнасьцяў. У прыватнасьці, на думку многіх навукоўцаў, інтэнсіўнаму гаспадарчаму асваеньню краю і разьвіцьцю вайсковай справы спрыяла актыўнае выкарыстаньне найбагацейшых медна-рудных радовішчаў Заўральля. Распрацоўка мясцовых запасаў мэталу пачалася ў сувязі з

прыпыненьнем імпарту балканскай медзі. Некаторыя спэцыялісты гэты фактар лічаць найгалоўнейшым.

Вайсковыя посьпехі тагачаснага насельніцтва «протагарадоў» у многім вызначаліся яшчэ й тым, што ўва ўжытак актыўна ўваходзілі калясьніцы і жорсткія аброці з касьцянымі псаліямі. На сваім клясычным этапе, пры росквіце сыстэмы правадырства, вылучэньні «страты» ваяроў на калясьніцах, піша Здановіч, наступае час ваенных экспансій «Краіны гарадоў» на захад, усход.

Некаторыя з дасьледчыкаў прыходзяць да меркаваньня: «Краіне гарадоў» на нейкі час выпала гістарычная роля стацца цэнтрам культургенэзу, якім было ахоплена на мяжы III-II тысячагодзьдзяў да н.э. «протаіндаэўрапейскае насельніцтва» стэпавых-лесастэпавых прастораў Эўразіі. Менавіта тут, уздоўж усходніх схілаў Уральскіх гор, працягваюць яны, упершыню за ўсю гісторыю стэпаў «у надзвычай жорсткіх кліматычных умовах узьнікаюць урбанізаваныя тэрыторыі – протагарады з дакладнай арганізацыяй як унутранай, так і прылеглай прасторы».

Многія дагісторыкі праводзяць паралелі і шукаюць сувязь паміж круглаплянавай структурай «протагарадоў» Паўднёвага Ўралу і адпаведнай традыцыяй умацаваных паселішчаў архаічных цывілізацыяў Блізкага Усходу. На тэрыторыі старажытнай Анатоліі яшчэ ў VI-V тысячагодзьдзях да н.э. узводзіліся круглаплянавыя паселішчы. Пазьней, у канцы IV-пачатку III тыс. да н.э., такая традыцыя мела месца ў сумежных рэгіёнах, найперш ў Эгеі і на Балканах. Амаль незалежна ад іх, паводле Н.Я.Мерперта, круглыя пасёлкі зь некалькімі канцэнтрычнымі колцамі дамоў узнікаюць у энэаліце – эпоху бронзы Сярэдне-Ўсходняй Эўропы, Прычарнамор’я, Прыкасьпія. Магчыма, Цыркумпантыйская традыцыя аказала асноўнае ўзьдзеяньне на працэс распаўсюджваньня круглаплянавых паселішчаў, яркім прыкладам якога зьяўляецца Аркаім.

Але ня ўсе спэцыялісты па старажытнай гісторыі разьдзяляюць меркаваньне пра «супэркультурны фэномэн» «Краіны гарадоў». Пазытывісцка настроеныя навукоўцы скептычна ставяцца да думак пра сымбалічнасьць «протагарадоў» Заўральля. Іншыя, хто прытрымліваецца марксісцка-эвалюцыянісцкага падыходу, адмаўляюцца прызнаць «Краіну гарадоў» «протагарадзкой цывілізацыяй», разглядаючы зьяўленьне ўмацаваных цэнтраў як заканамерны этап фармаваньня абароннай структуры паселішчаў у пэрыяд пераходу ад прысваяльнай да вытворнай эканомікі і як вынік пэўных палітычных калізій, мілітарызацыі грамадства. Умацаваныя цэнтры Заўральля, паводле іх меркаваньня, павінны разглядацца ў рамках традыцыйна-культурнага кантэксту, а ня ў якасьці «супэркультурнага

фэномэну» ці нейкай неардынарнай культурнай зьявы, якая выбіваецца з акаляючага культурнага фону.

Некаторыя дасьледчыкі шмат увагі надаюць ролі экалягічнага фактару. Узьнікненьню «Краіны гарадоў», акрамя іншых абставін, працягваюць яны, спрыялі зьмены ў навакольным асяродзьдзі, у прыватнасьці, агульная тэндэнцыя да ссушэньня клімату, яго арыдызацыя, што і прымушала тагачасных жыхароў стэпаў прыстасоўвацца да новых умоваў жыцьця…

Фэномэн «Краіны гарадоў» застаецца адной зь істотных праблем для дасьледчыкаў дагісторыі эўразійскіх стэпаў. «Протагарадзкая цывілізацыя Паўднёвага Ўралу» прымушае навукоўцаў яшчэ раз зьвярнуць увагу на адмысловую ролю старажытных стэпавых народаў у працэсе разьвіцьця некаторых раньніх дзяржаўных утварэньняў. У сувязі з гэтым, яшчэ ў 1935 годзе А.Тойнбі, адзначаючы факт станаўленьня намадызму ў стэпах IV-III тысячагоддзя да н.э., пісаў, што жывёлагадоўцы былі той дынамічнай сілай, якая вызначала зьмену народаў і культур у Старым сьвеце. Зона стэпаў, паводле іншага вядомага гісторыка Ф.Бродэля, была ў старажытнасьці адмысловым бікфордавым шнурам, па якому перадавалася энэргія «выбухаў», перарываючы тым самым запаволеную плынь гісторыі і выклікаючы катаклізмы ад Нямеччыны да Кітая.

## *ЗАМАРОЖАНАЯ ЖАНЧЫНА З ДАЛІНЫ УКОК*

*Пошукі і раскопкі курганоў I тыс. да н.э. на Горным Алтаі, што ў Паўднёвай Сібіры, прынесьлі новыя адкрыцьці замарожаных грабніц. Адна зь іх дасьледавалася навасібірскімі археолягамі ў 1993 годзе. «Замарожаная лэдзі» – унікальны па захаванасьці пахавальны комплекс, узрост якога каля 2400 год. На бальзамаваным целе ўкокскай жанчыны часоў эпохі раньняга жалеза акрамя шматлікіх упрыгожваньняў, адзеньня, захавалася нават татуяваньне з выявамі фантастычных зьвяроў. А ў пахавальнай камэры археолягі знайшлі вялікую колькасьць асабістых рэчаў, ахвярных жывёл, якія ўмерзьлі ў лёд, а таму захаваліся да нашага часу ў вельмі добрым выглядзе.*

Навуковы супрацоўнік Інстытуту археалёгіі і этнаграфіі Навасібірскага аддзяленьня Расійскай Акадэміі навук Наталя Паласьмак упершыню апынулася на Ўкоку ўвесну 1990 году. Трэба было аднаўляць дасьледчыя працы па вывучэньні курганоў скіфскага часу, якія ў 1920-ыя і 1940-ыя гады капаліся расійскімі археолягамі ў алтайскіх далінах Пазырык, Башадар, Туэкты. Археолягі аб'ядноўваюць іх пад назваю «пазырыцкая культура».

Укок – высакагорная даліна на Алтаі. За Ўкокам пачынаецца Кітай, а таму першымі людзьмі, хто сустрэў Н.Паласьмак і пяцёра яе студэнтаў, былі расійскія памежнікі. Яны і паказалі археолягам, дзе знаходзяцца каменныя насыпы вялікіх курганоў. Ужо праз некалькі тыдняў Паласьмак адкрыла тут першае пахаваньне: замарожаную пахавальную камэру зь целамі мужчыны і дзяўчыны.

Археалягічная экспэдыцыя пад кіраўніцтвам Паласьмак вярнулася на Ўкок у 1991 годзе. Але раскопкі ў тое лета закончыліся безвынікова. Палявы сэзон 1992 году таксама ня вельмі задаволіў дасьледчыцу, бо магіла, якая раскопвалася ёю, аказалася па часе крыху ранейшай за пазырыцкія курганы.

Травень 1993 году быў на Ўкоку надзіва сьнежным. Нават аўтамабілі з экспэдыцыйным абсталяваньнем не змаглі даехаць да месца археалягічнага лягера. Тым ня менш Паласьмак адважылася ў тое лета пачаць раскопкі чарговага вялікага кургана, засыпанага камянямі.

Цэнтральная частка курганнага насыпу была пашкоджаная. Сьлед рабаўнічага лаза? Амаль усе ранейшыя раскопкі пазырыцкіх курганоў расчароўвалі археолягаў менавіта тым, што пахаваньні некалі былі абрабаваныя. Толькі праз два тыдні напружанай працы Н.Паласьмак удалося знайсьці магілу, да якой калісь дабраліся рабаўнікі. Адразу пад насыпам быў пахаваны мужчына, побач зь якім ляжалі трупы трох ахвярных коней. Раскапанае пахаваньне, паводле высновы Паласьмак, упускалася ўва ўжо

насыпаны курган. Так здаралася не адзін раз – больш позьняе насельніцтва прыносіла хаваць сваіх суродзічаў у насыпы старажытных курганоў.

Паласьмак заглыбляла раскоп на месцы кургана. Празь нейкі час пачалі зьяўляцца першыя прыкметы падземнай грабніцы – вялікай зьледзянелай пахавальнай камэры, якую ў старажытнасьці пазырыкцы будавалі з дрэва…

## Замарожаная грабніца

Паласьмак і яе калегі ведалі, што пазырыкцы перш чым пахаваць свайго багатага суродзіча звычайна капалі магільную яму глыбінёю да 4м і плошчаю больш за 50 кв.м. Дно ямы магло пакрывацца камянямі. Пахавальная камэра выбудоўвалася з абчасаных бярвеньняў. Падлогу засьцілалі драўлянымі плахамі. Драпіроўка з тоўстага лямца, на які нашывалася дзіўнай прыгажосьці аплікацыя з выявамі жывёл, звычайна пакрывала сьцены грабніцы.

У адным з пазырыцкіх курганаў археолягі знайшлі драўляную пахавальную калясьніцу, на якой, верагодна, і быў прывезены памерлы. Нябожчыка зьмяшчалі ў спэцыяльную калоду-саркафаг. Побач ляжала вялікая колькасьць пахавальных дароў, у тым ліку і тых, якія прывозіліся на Алтай зь некаторых далёкіх краін Азіі. Уражвалі шматлікія залатыя вырабы, якія былі абавязковым атрыбутам пазырыцкіх грабніц. Нездарма старажытных алтайцаў Арыстэй Праканэскі у сваіх працах называў «грыфамі, якія пільнуюць золата».

У магілу акрамя нябожчыка апускалі коней – скакуноў залаціста-рудой масьці. Пахавальную камэру перакрывалі тоўстымі бярвеньнямі, пластамі бярозавай кары, гальля, а затым засыпалі глебаю. Толькі пасьля гэтага насып завальвалі камянямі. Такі курган мог дасягаць у дыямэтры 40м…

Пасьля многіх дзён раскопак кургана ў даліне Ўкок Паласьмак нарэшце знайшла зруб пахавальнай грабніцы. Агляд вонкавых драўляных пластоў прынёс першае нечаканае адкрыцьцё – камэра была абсалютна цэлаю, а значыць у яе не пранікалі рабаўнікі.

У гісторыі дасьледаваньня пазырыцкіх курганоў гэтая акалічнасьць мела выключнае значэньне, бо амаль усе ранейшыя раскопкі звычайна прыходзілася праводзіць на ўжо разрабаваных магілах. Археолягі вымушаныя былі здавольвацца толькі тым, што не палічылі неабходным браць з сабою рабаўнікі. Праўда, апошніх найперш цікавіла золата. У пошуках залатых каштоўнасьцяў злодзеі моцна псавалі пахавальныя камэры, пры гэтым не пакідаючы ў спакоі нават замерзлыя бальзамаваныя целы нябожчыкаў. Калі ў 1947 годзе Сяргей Рудэнка раскапаў знакаміты 2-гі

Пазырыцкі курган, ён вымушаны быў з жалем адзначаць, што некалі ў пахавальную камэру пранiклі рабаўнікі. Імкнучыся здабыць упрыгожваньні на замерзлым целе нябожчыка, яны пасеклі драўляную калоду-саркафаг. Пры гэтым зь целаў пахаваных было сарванае ўсё адзеньне, а галовы, рукі і ногі былі адсечаныя.

Таму варта было зразумець радасьць Наталі Паласьмак і яе калег, калі яны пераканаліся, што капаюць абсалютна цэлую пахавальную камэру. Пазьней адкрылася яшчэ больш прыемная навіна: у грабніцы ляжаў суцэльны пласт лёду. Пра гэта, як пісала пазьней Паласьмак, можна было толькі марыць...

Мерзлата, якая ўтваралася ў курганах, захоўвала тое, што ў іншых умовах, напэўна, зьнікла б бясьсьледна. Пасьля таго як суродзічы памерлых людзей заканчвалі працу над узьвядзеньнем кургана, у пахавальную камэру зь цягам часу пранікала вада. Лёд навечна скоўваў створаную людзьмі грабніцу. Летняе цяпло забіралі камяні, якімі закідваўся курганны насып.

...На сонцы лёд у раскапанай грабніцы станавіўся мяккім і зярністым. Для таго каб лёд раставаў хутчэй, раз-пораз яго палівалі гарачай вадой. «Спачатку зьявілася верхняя частка калоды-труны, а затым два маленькія, на кароткіх ножках, сталы...», – пісала пазьней Паласьмак. Калі ў старажытнасьці вада запоўніла пахавальную камэру, сталы, відаць, усплылі на паверхню і ўмерзьлі ў лёд. На меншым століку ляжаў кавалак бараніны, а на большым – конскае мяса, у якое пры пахаваньні ўтыркнулі бронзавы ножык. Мяса – апошняя сымбалічная ежа, якую паднесьлі памерлай жанчыне суродзічы.

Труна, як гэта было распаўсюджана сярод пазырыкцаў, рабілася з тоўстага бярвяна лісьцьвеніцы. Гладкая пустацелая калода-саркафаг, даўжынёю каля 2,5м, накрывалася драўляным векам. На ледзяную глыбу ў калодзе археолягі некалькі дзён лілі гарачую ваду. Наступіў той момант, калі скрозь мерзлату ў драўляным саркафагу праступіла чалавечае цела, загорнутае ў скуры, побач праглядаліся цьмяныя абрысы некаторых рэчаў.

Пустацелую калоду, перш чым пакласьці нябожчыка, у старажытнасьці засьцілалі скураю аленя. У адным з куткоў труны ляжаў драўляны кубак, ручка якога была зробленая ў выглядзе двух катоў, павернутых адзін да аднаго галовамі. Акрамя драўлянай лыжкі, у кубку захоўваліся рэшткі нейкага малочнага харчу накшталт ёгурту. Другі кубак быў зроблены з рогу. Яго запаліраваная паверхня блішчала на сонцы. Безумоўна, такі посуд мог выкарыстоўвацца толькі на самых важных цырымоніях.

19 ліпеня ў 10.35 скрозь адтуліну ў лёдзе можна было ўбачыць шчаку нябожчыцы. Затым апоўдні зьявілася захутанае ў скураную коўдру плячо...

У калодзе саркафагу, на баку з падагнутымі нагамі, ляжала забальзамаванае цела жанчыны, якая памерла ўва ўзросьце каля 25 год. Старажытныя алтайцы, як, дарэчы, і скіфы, муміфікавалі памерлых. Зь цела

нябожчыка звычайна вырэзваліся вантробы і цягліцы, выкідвалася зьмесьціва галавы. Тую абалонку, якая заставалася, напаўнялі шэрсьцю і сумесьсю траў. Дзякуючы лёду, мумія жанчыны добра захавалася. Толькі на некаторых участках цела праглядаліся косткі шкілета.

На памерлай было апранутае адзеньне са скуры і шэрсьці. Спадніца ў белую і каштанавага колеру палоскі акантоўвалася кітайскім шоўкам. Амаль трэцюю частку труны займаў высокі галаўны ўбор. Ён рабіўся з драўлянага каркасу і пакрываўся лямцом, на які нашываліся залатыя фігуркі катоў. Побач ляжаў маленькі каменны сподак з рэшткамі насеньня каляндры – расьліны, якая трапляла на Алтай зь Пярэдняй Азіі і якую шанавалі ў скіфскі час многія народы.

Жанчыла мела пры сабе маленькае люстэрка з паліраванага мэталу, на адваротным баку якога былі выразаныя фігуркі аленяў. Руку ўпрыгожвалі пацеркі. На мяккай скуры жаночага плечука выразна праглядалася блакітнае татуяваньне. Сюжэт яго складаўся з выяваў мітычных істот кшталту грыфана. Запясьце пакрывалі татуяваныя малюнкі аленяў. Гэта было другое ў гісторыі раскопак пазырыцкіх курганоў татуяванае цела. Першае, яшчэ ў 1940-ых гадох, з моцна пашкоджаным татуяваньнем знаходзіў Сяргей Рудэнка. На грудзі старажытнага мужчыны спосабам наколваньня была нанесеная фігура фантастычнага зьвера ці львінага грыфана з птушынаю галавою на канцы хваста. На яго правай руцэ ацалела некалькі малюнкаў: кулана, фантастычнага крылатага зьвера, горнага казла, аленя з птушынай дзюбай, нейкага драпежніка ды аленя з падстрыжанай грывай...

Па-за паўночнаю сьцяною пахавальнай камэры ляжалі замерзлыя трупы коней ў параднай збруі. Жывёлы былі забітыя ўдарамі сякеры-чэкана. Экспэрты канстатавалі, што ў страўніках коней захаваўся часткова засвоены корм з травы, галінак і хваёвых іголак. Швэдзкі дэндроляг Сэйфэрт, які вывучаў зьмесьціва страўніка коней і рабіў зрэзы дрэва з пахаваньня, прыйшоў да высновы, што жанчыну хавалі ўвесну.

Курган, які раскапала ў 1993 годзе Наталя Паласьмак, пакінула насельніцтва скіфскага часу. Шматлікія намады рухаліся ў той час па стэпах Эўразіі, што прасьціраліся ад Прычарнамор'я да Вялікай кітайскай сьцяны. У далінах Алтая з VI да II ст. да н. э. жылі народы, «зьвярыны стыль» мастацтва якіх нагадваў творы скіфаў. «Пазырыкцы», так іх звычайна называюць археолягі, зімою часта пераганялі свае статкі ў такія даліны, як Укок. Вятры зьдзьмувалі з паверхні сьнег, агаляючы траву, прыдатную для адкорму авечак ды коней.

Манумэнтальныя памеры пахавальнага збудаваньня, раскоша і пышнасьць убранства магілы сьведчаць пра тую важную ролю, якая належала памерлай

жанчыне ў тагачасным родаплемянным грамадстве. Улада і ўплыў яе распаўсюджваліся ня толькі на свой род, але, верагодна, мелі вялікае значэньне ў элітных структурах свайго плямені.

Род і племя да якога яна належала, як і іншыя групы пазырыцкага насельніцтва, мелі непасрэднае дачыненьне да гандлёвых сувязяў з найбагацейшымі азіяцкімі цэнтрамі. Увосень, калі надыходзіла пара сьвежаваць адкормленую за лета жывёлу, старажытныя алтайцы накіроўваліся па горных сьцежках выменьваць свой тавар і золата на пэрсыдзкую тканіну з выявамі жрыц у высокіх ціярах, на шкуры леапарда, кітайскі шоўк, насеньне каляндры і ракавіны каури, якія прывозілі зь берагоў Індыйскага акіяну.

Мастацтва пазырыкцаў – яркая старонка ў культуры народаў скіфскага часу. На Алтаі, у адрозьненьне ад скіфаў, склаўся свой адмысловы «зьвярыны стыль», узоры якога ў вялікай колькасьці адшуканы ў замарожаных грабніцах. На адзеньні, ува ўпрыгожваньнях, у багатых інтэр’ерах пахавальных камэр абавязкова прысутнічаюць выявы мітычных істот, якія дзівосным чынам спалучаюць у сабе прыкметы самых розных зьвяроў. Бадай самым распаўсюджаным вобразам быў арліны грыфан – істота зь целам ільва ці тыгра, з крыламі птушкі і вушастай галавой.

Арліныя грыфаны прасьціраюць свае крылы і распускаюць кіпцюрыстыя лапы ў зьледзянелых пахаваньнях некалішніх гаспадароў Укоку, назва якога, паводле слоў мясцовых людзей, азначае «канец усяму».

## ***ГРАБНІЦЫ МАКЕДОНСКІХ ЦАРОЎ***

*Зрабіць сэнсацыйнае адкрыцьцё ў галіне антычнай археалёгіі Грэцыі амаль немагчыма. Дасьведчанасьць у старажытнай гісторыі гэтай краіны надзвычай вялікая. Увосень 1977 году ў Македоніі недалёка ад Тэсалёнікаў каля Вэргіны Маноліс Андранікас знайшоў царскі нэкропаль, што сталася адным з выдатным адкрыцьцяў у антычнай археалёгіі апошніх дзесяцігодзьдзяў. М.Андранікас, як і многія іншыя спэцыялісты, перакананы, што тут, каля старажытнай сталіцы Македоніі – горада Эге, знаходзіцца грабніца цара Філіпа II – бацькі славутага Аляксандра Македонскага.*

«8 лістапада 1977 году, -- успамінае прафэсар Андранікас, -- нам удалося нарэшце прыбраць замковы камень скляпеньня. Праз адтуліну я зірнуў у грабніцу, асьвятліўшы яе кішанёвым ліхтарыкам. Пахавальная камэра была квадратнаю, памеры яе 4,46х4,46 м. Мармуровыя дзьверы зачынялі ўваход у перадпакой. Сьцены аздобленыя досыць сьціпла – а мы меркавалі ўбачыць багаты росьпіс; можна было падумаць, што аздаблялі іх абы як і сьпешна. Аднак у пахавальнай камэры знаходзіліся дзьве групы рэчаў: у адным куце бронзавы посуд і зброя, у другім – срэбны посуд. На падлозе – куча згнілых дарэшты матэрыялаў уперамежку з залатымі пласьцінамі. Проста пад адтулінаю я ўбачыў прастакутную мармуровую пліту, якая закрывала мармуровы саркафаг. Відовішча было ўражвальнае...»

Вёска Вэргіна разьмешчаная на паўночным схіле Піерыі, прыблізна за 70 км у паўночна-заходнім кірунку ад Тэсалёнікаў, недалёка ад горада Вэроі. Упершыню М.Андранікас, будучы студэнтам, апынуўся ў Вэргіне ў далёкім 1937 годзе. Тады ён прыняў удзел у раскопках, якімі кіраваў прафэсар К.А.Рамей. Ужо ў 1949 годзе М.Андранікас стаў супрацоўнікам Грэцкай археалягічнай службы і, дзякуючы дзіўнаму зьбегу абставін, атрымаў прызначэньне ў Вэрою. Побач у Вэргіне Андранікас пачаў археалягічныя дасьледаваньні мясцовых старажытнасьцяў.

Увагу археоляга найперш прывабіў «Мэгалі тумба» – Вялікі курган дыямэтрам 110 м і вышынёй 12,5 м, які паважна ўзвышаўся над іншымі шматлікімі магільнымі пагоркамі. Андранікас быў перакананы, што гэта курган элінскіх часоў і хавае пад насыпам вялікую македонскую грабніцу. У 1963 годзе, давёўшы раскоп да глыбіні 11,5 м, дасьледчык прыпыніў працу, і толькі ў 1976 годзе Андранікасу ўдалося ўзнавіць пошук падкурганнага пахаваньня.

Імпэту прыдавала тое, што ангельскі вучоны Ніклас Хаманд з Брыстальскага ўнівэрсытэту ў часопісе *Athens Annals of Archaeology* атаясаміў Вэргіну з старажытным Эге – першай сталіцай Македонскай дзяржавы.

Згубіўшы ў 1977 годзе больш за месяц на раскопкі Вялікага кургана і заглыбіўшы раскопы да 15 м, прафэсар стаў губляць надзею на посьпех – пад насыпам не траплялася прыкметаў якога-небудзь збудаваньня. Аднак і гэтая праца не была марнаю, бо прымусіла працягваць пошук у іншым накірунку – паўднёва-заходнім, там дзе пад краем Вялікага кургана ледзь заўважаўся невысокі больш старажытны з выгляду насып.

«Сьвяцілішча герояў» – так назваў М.Андранікас адкрытую пад гэтым насыпам надзвычай багатую, але разрабаваную яшчэ ў старажытнасьці грабніцу IV стагодзьдзя да н.э. На верхняй частцы пахавальнага збудаваньня захаваліся фрэскі дзіўнай прыгажосьці, напісаныя на сюжэт выкраданьня Парсэфоны Плутонам. Бог падземнага царства імчыць на сваёй калясьніцы, трымаючы ў правай руцэ лейцы і скіпэтар, а левай абдымаючы аголены торс маладой багіні. « Упэўненасьць і лёгкасьць мазка,натхнёнасьць на тэму, -- узрушана пісаў Андранікас, -- і майстэрскае валоданьне пэрспэктывай гаворыць пра тое, што гэты твор належыць пэндзлю вялікага майстра. Мяркую, што не зграшу супраць ісьціны, калі прыпішу фрэскі Нікамаху, знакамітаму грэцкаму мастаку сярэдзіны IV стагодзьдзя да н.э., які часта зьвяртаўся да гэтай рэдкай тэмы і быў вядомы ня толькі дасканаласьцю сваіх твораў, але й тым, што працаваў надзвычай хутка». Гэта была першая знойдзеная ў Грэцыі фрэска IV стагодзьдзя да н.э.

Аднак паўставала пытаньне: хто і чаму па-барбарску зьнішчыў пахаваньне? У Андранікаса на гэты конт быў адзін адказ: цар Пір у 274-273 гадах да н.э. Пір – цар Эпіра, прывёўшы ў Македонію наёмнікаў-галатаў, перамог яе цара Антыгона Ганата. Аднак апошні здолеў адваяваць сваю сталіцу – горад Эге, і пазьней, каб запабегчы рабаўніцтва іншых царскіх грабніц, насыпаў над імі Вялікі курган.

Разбураная наземная грабніца з рэшткамі ўнікальных фрэсак была толькі яркім уступам да незвычайных адкрыцьцяў Маноліса Андранікаса.

### *Падземныя грабніцы*

Раскопкі кургана ў 1977 годзе не прыпыняліся, бо ніжэй зьявіўся адмысловы фасад яшчэ адной грабніцы. Замест дарычных трыгліфаў і мэтопаў археолягам адкрывалася роўная паверхня сьцяны зь незвычайнымі росьпісамі, якія займалі плошчу 5,5х1,2 м. Асноўны сюжэт унікальнай кампазыцыі – сцэна паляваньня на дзікоў і львоў. Ужо толькі гэтыя фрэскі

невядомага «мастака з Вэргіны» маглі стаць найцікавейшым адкрыцьцём М. Андранікаса. Аднак праз нейкі час яго чакалі новыя шчасьлівыя ўзрушэньні.

Расчысьціўшы фасад грабніцы, археолягі нарэшце ўбачылі дзьверы , за якімі знаходзіўся ўваход у пахавальную камэру. Андранікасу шчасьціла – дзьверы былі цэлымі і знаходзіліся на сваім месцы. Няўжо спэцыялісты натрапілі на неразрабаваную грабніцу?!

Аднак прабірацца ў яе прыйшлося праз скляпеньні. Раскапаўшы дах пахавальнай камэры і зьняўшы адну з плітаў, археолягі 8 лістапада 1977 году змаглі ўпершыню больш чым праз 2000 гадоў пасьля збудаваньня грабніцы зазірнуць у цёмнае склепішча…

Вышыня грабніцы дасягала 5,3 м, таму з даху ў яе апускаліся па прыстаўной лесьвіцы. На падлозе стаяла мноства бронзавых і срэбных пасудзін, ляжала вялікая колькасьць зброі. Ручкі посуду былі зробленыя ў форме галоў Геркулеса, Пана. Захаваліся рэшткі драўлянага рытуальнага шчыта, абцягнутага скураю, Яго паверхню ўпрыгожвалі шматлікія накладкі з золата і слановай косьці. Каля шчыта ляжаў жалезны шлем з грэбнем і выявай Атэны, кіраса, аздобленая львінымі галовамі з золата, рэльефнай фігураю Атэны, залатымі пласьцінкамі. У драўляных, пакрытых золатам похвах захоўваўся меч.

Андранікас зьвярнуў увагу на дыядэму з золата і срэбра. Рэльефна вылучаная стужка ўвязвалася ў эфэктны вузел. Няўжо знакаміты «Гераклаў вузел», якім увенчваліся цары Македоніі? Рэчы з грабніцы, найперш посуд, паводле вызначэньняў Андранікаса маглі датавацца часам паміж 350-325 гадамі да н.э. Магчыма, у грабніцы пахаваны Філіп II, які быў царом Македоніі з 359 да 336 году да н.э. Філіп II Македонскі здолеў ня толькі ўмацаваць сваю краіну, але і сцьвердзіў у 338 годзе да н.э. македонскую гегемонію над большасцю грэцкіх полісаў.

Пад сьцяною пахавальнай камэры стаяў мармуровы саркафаг. На дне саркафага знаходзіўся залаты, цудоўна аздоблены куфэрак з прахам памерлага. Паводле тагачасных звычаяў, эліны спальвалі памерлых, зьмяшчаючы парэшткі ў пахавальную пасудзіну. Калі Андранікас адкрыў залаты куфэрак, то ўбачыў там прах памерлага, загорнуты ў пурпуровы пеплас і прыкрыты залатым вянком з дубовых лістоў і жалудоў.

Крэмаваныя косткі пазьней вывучалі антраполягі. Яны сьцьвердзілі, што пахаваны – мужчына 40-50 гадоў. Як вядома, Філіп II загінуў у 46 гадоў. Ангельскія вучоныя Джон Прэг (Манчэстэрскі музэй), Дж. Мазгрэйв (Брыстольскі унівэрсытэт), Рычард Ніў (Манчэстэрскі ўнівэрсытэт) абсьледавалі рэшткі чэрапа нябожчыка і ўзнавілі яго абрысы. З фрагмэнтаў чарапных костак, якія пацярпелі ад пахавальнага агню, спачатку былі зробленыя зьлепкі. Рэканструкцыя чэрапа нябожчыка зацягнулася на доўгі час.

Аказалася, што ў выніку прыроджанага парока разьвіцьця і калецтва, атрыманага праз нейкі пэрыяд, чэрап памерлага выглядаў дэфармаваным. «Левая палова твару ў гэтага чалавека, -- пісаў Прэг, -- была яўна недаразьвітай, а правая, наадварот, празьмерна разьвітай». Спэцыялісты па плястычнай хірургіі заўважылі сьляды загоенай глыбокай раны ад стралы на месцы правага вока. З жыцьцяпісаў Дыядора вядома, што Філіп II за 18 гадоў да свае сьмерці быў паранены стралою ў правае вока пры аблозе Мэтоны. На ўсіх выявах, дзе паказаны Філіп II, добра бачны прыкметы калецтва правага вока, на якое,  мусіць, цар асьлеп. Джон Прэг адзначаў, што гэта «цалкам супадае з вынікамі дасьледаваньня чэрапа, які знайшлі ў Вэргіне. Яны ўяляюць якраз той доказ, які шукаў Андранікас і ў існаваньне якога ня верылі многія скептыкі».

Для ўзнаўленьня галавы Філіпа II дасьледчыкі ўжылі мэтады, якія выкарыстоўваюцца у судовай мэдыцыне для ўзнаўленьня асобы чалавека па костках чэрапа. У розныя ўчасткі чэрапа былі ўстаўленыя штыры з абазначэньнем таўшчыні мяккіх тканак, а затым былі змадэляваныя цягліцы ды скура. Канфігурацыя шнара была ўзноўленая паводле марфалёгіі аналягічнага раненьня, якое колькі гадоў таму назад атрымаў адзін канадыйскі лесаруб.

Вынікі антрапалягічнага дасьледаваньня сталі здабыткам навуковай грамадзкасьці праз нейкі час пасьля адкрыцьця грабніцы. Але, як ні дзіўна, у тыя напружаныя і адначасова шчасьлівыя дні М.Андранікасу ўдалося ўбачыць партрэт Філіпа II у адкрытай ім грабніцы.

## *Царскія партрэты*

Дасьледуючы грабніцу, Андранікас зьвярнуў увагу на рэшткі драўлянай мэблі, ад якой добра захаваліся залатыя і касьцяныя скульптуркі людзей і мітычных пэрсанажаў. Мініятуры настолькі рэалістычна перадавалі чалавечыя рысы, што ў некаторых зь іх прафэсар адразу здолеў убачыць партрэты царскіх асобаў, найперш Аляксандра Македонскага, яго маці Алімпіі і самога Філіпа II. «...Выдатная выява сталага мужчыны, крыху стомленага, зь ледзь заўважным намёкам на пашкоджанае вока, якая выразна перадае валявы характар арыгіналу», – пісаў пра партрэт Філіпа II М.Андранікас.

Антраполягі, якія ўзнавілі твар чалавека, пахаванага ў грабніцы, таксама прыйшлі да высновы пра яго структурнае падабенства са згаданай мініятурай. На залатым мэдальёне рымскага часу з Тарсу Філіп II ня толькі падобны да выявы скульптуркі, але й паказваецца падсьлепаватым на правае вока, што пацьвярджала заключэньне Андранікаса.

Ідэнтыфікацыя партрэту Аляксандра Македонскага не выклікае асаблівых цяжкасьцяў. У музэях захоўваюцца скульптуры Аляксандра, праўда, найчасьцей зробленыя ўжо пасьля сьмерці знакамітага цара.

Андранікас прыйшоў у захапленьне ад майстэрства старажытнага скульптара. На думку прафэсара, у тыя часы на такое быў здольны толькі вялікі Леахар – атэнскі скульптар, наближаны да царскага двара. Леахар пасьля 338 году да н.э. выканаў скульптурныя партрэты сям'і Філіпа II. Ці ня мог той самы Леахар адначасова зрабіць у сваёй майстэрні мініятурныя партрэты сям'і Філіпа і ўпрыгожыць імі царскую мэблю?

Аднак, разам з тым, вядомы мастацтвазнаўца М.Лясьніцкая, аналізуючы стылістыку і вобразнасьць твораў з македонскай грабніцы, мяркуе, што аўтарам іх мог быць ня хто іншы як Лісіп. Тым ня менш, усе дасьледчыкі пагаджаюцца, што ў грабніцы знойдзеныя ўнікальныя скульптурныя творы грэцкага мастацтва IV стагодзьдзя да н.э., якія зьдзіўляюць сваім рэалізмам і дасканаласьцю перадачы формаў.

***Іншыя адкрыцьці***

Да пахавальнай камэры грабніцы далучалася яшчэ адно невялікае памяшканьне – пярэдні пакой. Патрапіўшы ў яго праз зробленую ў сьцяне адтуліну, археолягі ўбачылі ўтульнае памяшканьне, атынкаванае ў белы і чырвоны колеры. Паўсюль было шмат золата, шкла. На сьценах – сьляды шыкоўных фіранак. У кутку стаяў саркафаг. Каля яго – вянок з залатых лістоў і кветак мірты.

Побач з саркафагам стаяў залаты калчан з барэльефамі, якія адлюстроўвалі падзеі Траянскай вайны. Недалёка ляжала пара паножаў, адна зь іх, левая, была карацейшая і вузейшая за правую. Паножы, ці інакш кнеміды, маглі належаць Філіпу II, бо, як вядома з гістарычных паведамленьняў, македонскі цар кульгаў.

У мармуровым саркафагу знаходзіўся куфэрак з чалавечымі парэшткамі. Косткі былі акуратна загорнутыя ў пурпуровую тканіну з залатымі ніткамі. У цемры блішчала золатам жаночая дыядэма ў выглядзе кветак і галінак.

Перад Андранікасам паўставала пытаньне: калі ў асноўнай камэры знаходзіўся прах Філіпа II, то хто тады быў пахаваны ў пярэднім пакоі? Антрапалягічны аналіз костак з саркафага дазволіў вызначыць, што гэта была жанчына 23-27 гадоў. Няўжо жонка Філіпа II? Калі так, то толькі не Алімпіяда, як мяркуе прафэсар, а Клеапатра…

Андранікас так захапіўся пошукамі, што праз нейкі час побач зь першаю грабніцай адкрыў яшчэ адну – цяпер ужо трэцюю па ліку, якую ён таксама далучыў да царскіх магілаў. Фасад трэцяй грабніцы некалі таксама аздабляўся

фрэскамі. На месцы саркафага ў пахавальнай камэры стаяла срэбная гідрыя з прахам хлапчука 12-14 гадоў. Пахаваньне суправаджалася багатымі дарамі і царскімі сымбалямі. Мяркуецца, што ў грабніцы пахаваны сын Аляксандра Вялікага ад Раксаны – Аляксандр IV, якога абвясьцілі царом пасьля сьмерці бацькі, а пазьней – у 310 ці 309 годзе да н.э. забілі.

Раскопкі, праведзеныя Андранікасам у Вэргіне ў 1982 годзе, прынесьлі новыя сэнсацыйныя адкрыцьці. Археоляг знайшоў гарадзкі тэатар, у якім, паводле гістарычных сьведчаньняў, улетку 336 году да н.э. быў забіты Філіп II, а яго сына Аляксандра вайскоўцы абвясьцілі царом. Удалося таксама адшукаць гарадзкія ўмацаваньні, якія сьведчылі пра тое, што Эге быў надзвычай вялікім горадам.

1987 год. Новае адкрыцьцё – грабніца, якую ў гонар прафэсара Рамея (Рамаёса) – аднаго зь першых дасьледчыкаў у Вэргіне, назвалі «грабніцаю Рамаёса». На думку спэцыялістаў, «грабніца Рамаёса» была ўзьведзеная ў VI стагодзьдзі да н.э. Гэта пакуль самая раньняя грабніца зь ліку знойдзеных у сталіцы старажытнай Македоніі.

Пасьля першых навуковых публікацыяў вынікаў раскопак узьнікла некаторая палеміка і найперш вакол другой грабніцы, якую Андранікас упэўнена атаесамляў з пахаваньнем Філіпа II. Аналізуючы сэнс некаторых сымбаляў грабніцы, А.Нявераў спрабаваў пераканаць, што ў грабніцы пахаваны нехта іншы, ува ўсялякім разе не Філіп II. Свае аргумэнты супраць прыналежнасьці грабніцы Філіпу выказвалі Х.Юкер, А.Манцэвіч, А.Аляксееў. Швайцарскі археоляг Юкер, не знаходзячы ў царскіх грабніцах чырвонафігурнай керамікі, росквіт якой прыпадае ў Грэцыі менавіта на IV стагодзьдзе да н.э., сумняваецца ў слушнасьці датаваньня магілаў. Гарыт (калчан) з сцэнамі Траянскай вайны мае аналёгіі ў Прычарнамор'і і можа датавацца, як сьцьвярджае А.Манцэвіч, часам крыху пазьнейшым за сьмерць Філіпа II.

Аднак апанэнты ня могуць пакуль пераканаць спэцыялістаў і істотна паўплываць на ключавыя высновы Андранікаса. Па-за палемікай застаюцца яго галоўныя аргумэнты: партрэтнае падабенства скульптуры Філіпа і ўзноўленага вонкавага аблічча пахаванай царскай асобы ў вялікай грабніцы, наяўнасьць царскіх сымбаляў і найперш царскай дыядэмы македонскіх цароў, прысутнасьць у пярэднім пахавальным пакоі пары кнемід, адна зь якіх карацейшая і вузейшая за другую, а таксама праха маладой Клеапатры – апошняй жонкі Філіпа, якую забілі на загад Алімпіяды.

... Летнім вечарам 366 году да н.э. у старажытнай сталіцы Македоніі завяршаліся ўрачыстасьці шлюбу дачкі Філіпа II з царом Малосіі Аляксандрам.

Праз колькі дзён Філіп павінен быў ехаць да свайго войска, якое дзейнічала супраць пэрсаў у Малой Азіі. Філіп накіроўваўся ў тэатар, дзе ішла апошняя падрыхтоўка да заключных шлюбных цырымоніяў. Каля Філіпа, акрамя шматлікай варты і сьвіты, былі два Аляксандры – сын і зяць. У вузкі праход тэатру першымі ступілі Філіп, два Аляксандры і целаахоўнік Паўсані, варта і сьвіта адсталі. Празь некалькі сэкундаў Паўсані кінжалам забіў Філіпа.

Вялікая грабніца, якую знайшоў Андранікас, стала апошнім прытулкам знакамітага цара. Суайчыньнікі Філіпа стварылі ў ягоны гонар грандыёзнае пахавальнае збудаваньне – адмысловы музэй раньняга элінізму. Сёньня знаходкі з царскіх грабніц старажытнай Македоніі можна ўбачыць у Археалагічным музэі Тэсалёнікаў.

KAMUNIKAT.org

***Archaeological Discoveries of the World***

**by Mikoła Kryvalcevič**

**Summary**

The most striking archaeological discoveries of the world taking place in 1970 – 1990 are included in this book. About most of them Belorussians may pick up information only from *mass media*. For filling the deficiency of so kind of knowledge and scientific information this book of popular scientific articles are suggested. Every article devotes to one or some outstanding archaeological discoveries and some problems which originate or have originated from trying to find the sense of the latest scientific information.

Author describes not only combinations of circumstances in which these discoveries have become a reality, but distinguishes ideas and problems, which have been real scientific value.

A reader may light upon a funeral construction of unbelievable size in which the terracotta guard China's emperor Qin was represented, also about an unique unrobed burial mound at Hochdorf which demonstrates the wealth and luxury enjoyed by the Iron Age elite. One article is devoted to the results of investigation of «Iceman» – prehistoric human body which was found in 1991 in O tztaler Alps and was dated by 3300 BC. There are much information about the latest discoveries in such one of the most interesting and popular scientific direction as experimental archaeology in this book. The author writes about fascinating search and investigation of tombs in northern Greece near the Vergina, where, in the ancient capital of Macedonians, none other than Philip II, the father of Alexander the Great, was buried.

Hundreds of ancient bodies were recovered from bogs of Northern Europe. One of them, Peter Marsh, was found in 1984. Information about him and other remains of murder victims and fascinating evidence of the ritual and religions structures through which these people understood their world during the Iron Age a reader may find in article «Bog people». Two essays are devoted to the latest outstanding discoveries in Russia – revelation of «frozen lady», dated to the Iron Age, in the Altai mountains at Ukok by Natalya Polosmak and discovery of «protourban civilization», dated to the Bronze Age, near the Ural mountains. Two the most remarkable archaeological discoveries in Belarus made by belorussian scholars are described. One article is devoted to unique sites in some northern belorussian lakes and bogs. Sites were situated on massive wooden platforms and piles. Large quantities of preserved wooden implements

and other artifacts illustrate the activities of the Stone and Bronze Age inhabitans of the settlement. One of the largest Neolithic and Bronze Age flint mines were found in the Western Belarus near Vaukavysk. Archaeologists have discovered a human burial in a flint mine.

There are many illustrations and bibliography for all articles in the book.

KAMUNIKAT.org

## Бібліяграфія


**Iceman**

Roberts David. The Iceman: lone voyager from the Copper Age // National Geographic. 1993, June. P. 36 – 67.

Paul Bahn. The Iceman // 100 Great Archaeological Discoveries. New York, 1995. P. 84 – 85.

Andreas Lippen. The Ice Man of the Tyrol // People of the Stone Age: Hunter-gatherers and Early Farmers. San Francisko, 1997. P. 76 – 77.

**Людзі на вадзе**

Микляев А. М. О свайных поселениях III—II тыс.до н.э. в басейне Западной Двины // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. 1977, № 18. С. 10—14.

Микляев А. М. Каменный – железный век в междуречье Западной Двины и Ловати // Петербургский археологический вестник. 1994, № 9. С. 8—42.

Чарняўскі М. М. Паўночнабеларуская культура // Археалогія Беларусі. Т. 1. Мінск, 1997. С. 311—330.

Ульрих Руофф. Археологические находки в озерах и реках // Museum. 1983, № 137. С. 64—67.

Bogucki Peter. The Lake Dwellings of the Alpine Foreland // 100 Great Archaeological Discoveries. New York, 1995. P. 70—71.

**Хохдорф: курган кельцкага правадыра**

Biel Jorg. Treasure from a Celtic Tomb // National Geographic. 1980, March. P. 428—438.

Bogucki Peter. Hochdorf: A 'Tut's Tomb' of the Iron Age // 100 Great Archaeological Discoveries. New York, 1995. P. 106 – 107.

**Балотныя людзі**

Глоб П. В. Люди железного века из болот Дании // Курьер ЮНЕСКО. 1972, Февраль. С. 24—29.

Tarlow Sarah. Bog Bodies: Faces from the Past // 100 Great Archaeological Discoveries. New York, 1995. P. 114 – 115.

**Жывая археалёгія**


Коробкова Г. Ф. Палеоэкономические разработки и экспериментально-трасологические исследования // Первобытная археология: поиски и находки. Киев, 1980. С. 212—225.

Семенов С. А., Коробкова Г. Ф. Технология древнейших производств. Ленинград, 1983.

Малинова Рената, Малина Ярослав. Прыжок в прошлое. Москва, 1988.

Малина Ярослав,Малинова Рената. Великие загадки Земли. Москва, 1993.

Glosik Jerzy. Biskupin. Warszawa, 1991.


**Чалавек у капальні**


Гурина Н. Н. Древние кремнедобывающие шахты на территории СССР. Ленинград, 1976.

Чарняўскі М. М., Кудрашоў В. Я., Ліпніцкая В. Л. Старажытныя шахцёры на Русі. Мінск, 1996.

Borkowski W. Krzemionki Mining Complex. Warsaw, 1995.

Migal W. Jak organizowano prace w neolitycznych kopalniach krzemienia // Problemy. № 486, 1987. S. 38—42.


**Падземнае войска імпэратара**


Гу Венджи. Глиняные солдаты императора // Курьер ЮНЕСКО. 1980. Январь. С. 5—8.

Малеваный А. М. Глиняная гвардия китайского императора // Вопросы истории. 1983, № 11. С. 162.

Крюков В. М. Новые археологические открытия в КНР // Вестник древней истории. 1989, № 1. С. 185—190.

Paul G. Bahn. The Terracotta Army // 100 Great Archaeological Discoveries. New York, 1995. P. 178 – 179.


**Фэномэн «Краіны гарадоў»**


Комплексные общества Центральной Евразии в III--I тыс. до н. э.: региональные особенности в свете универсальных моделей. Материалы к международной конференции 25 августа -- 2 сентября 1999 г. Челябинск -- Аркаим, 1999.

Культуры древних народов степной Евразии и феномен протогородской цивилизации Южного Урала (материалы 3-й Международной научной

конференции «Россия и Восток: проблемы взаимодействия» часть V, книга 1). Челябинск, 1995.

Материалы по археологии и этнографии Южного Урала: Труды музея-заповедника Аркаим. Челябинск, 1996.

**Замарожаная жанчына з даліны Ўкок**

Руденко С. И. Культура населения Горного Алтая в скифское время. Москва – Ленинград, 1953.

Polosmak Natalya. A Mummy unearthed from the Pastures of Heaven // National Geographic. 1994, October. P. 80—103.

**Грабніцы македонскіх цароў**

Андроникос Манолис. Гробницы македонских царей // Курьер ЮНЕСКО. 1979, № 7. С. 18—21, 25—27, 30—31.

Вершинин Л. Р. К вопросу об обстоятельствах заговора против Филиппа II // Вестник древней истории. 1990, № 1. С. 139—153.

Манцевич А. П. Открытие царской гробницы у деревни Вергина в Северной Греции ( Античная Македония) // Вестник древней истории. 1980, № 3. С. 153—167.

Неверов О. Я. Находки в большом кургане в Вергине и проблемы торевтики эпохи раннего эллинизма // Вестник древней истории. 1990, № 1. С. 161—166.

Andronikos M. The Royal Tomb of Philip II // Archaeology. 1978, V. 31. № 4.

Тони Хакенс. Так ли выглядел Филипп II // Курьер ЮНЕСКО. 1985, Август. С. 14.